WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 ВЕРАСНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 184
(26542)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 кастрычніка 2009 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу трэцяя сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне работу 2 кастрычніка 2009 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2009 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Два аб'екты аховы здароўя рэспубліканскага значэння будуць уведзены ў строй у Беларусі да канца года

Аб гэтым паведаміў БЕЛТА міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко. Да канца гэтага года запланавана адкрыць Рэспубліканскі цэнтр трансплантацыі органаў і тканак (на базе 9-й клінікі ў Мінску), а таксама аперацыйны блок і гінекалагічны корпус у РНПЦ «Маці і дзіця».

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ЎПЕРШЫНЮ ВЫЙШЛІ НА ТАКІ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ ПРАКТЫЧНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ Ў ВАЕННАЙ СФЕРЫ»

Фота БЕЛТА

Беларусь і Расія ўпершыню выйшлі на такі высокі ўзровень практычнага ўзаемадзеяння ў ваеннай сферы. Аб гэтым заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на аглядзе войскаў, якія ўдзельнічалі ў вучэнні «Захад-2009».

«Мы некалькі разоў падыходзілі да такіх маштабных вучэнняў, але толькі дзякуючы Дзмітрыю Мядзведзеву нам удалося ў гэтым годзе ўпершыню за перыяд існавання сумеснай беларуска-расійскай групоўкі як складальніку Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы правесці гэтыя вучэнні. Калі не было б рашэння Прэзідэнта Расіі, у нас не было б такіх маштабных сумесных вучэнняў», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што важнейшае мерапрыемства сумеснай баявой падрыхтоўкі Узброеных Сілаў Беларусі і Расіі — аператыўна-стратэгічнае вучэнне «Захад-2009» — завяршылася паспяхова. Яно праведзена дакладна ў тэрмін, усе пастаўленыя задачы рэалізаваныя, а маштаб вучэння — каласальны. У ім была задзейнічана ўся заходняя частка былога Савецкага Саюза. Як адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, вучэнне дало магчымасць павысіць палявую і паветраную вывучку ўсіх Узброеных Сілаў. На думку Аляксандра Лукашэнкі, рашэнне праводзіць такія маштабныя вучэнні па чарзе ў Беларусі і Расіі дарагога вартыя. Акрамя беларускіх і расійскіх ваеннаслужачых, у вучэнні прынялі ўдзел падраздзяленні ўзброеных сілаў Казахстана і Таджыкістана, што, паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, сведчыць аб зацікаўленасці іншых дзяржаў у падрыхтоўцы сваіх узброеных сілаў на прынцыпах і па прыкладзе ўзброеных сілаў Расіі і Беларусі. «Цяперашняе вучэнне — узор абароны нашых народаў у Саюзнай дзяржаве», — сказаў ён.

Прэзідэнт Беларусі лічыць сімвалічным, што вучэнне «Захад-2009» праведзена ў год 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і напярэдадні 65-й гадавіны агульнай Вялікай Перамогі. «Мы ганарымся подзвігам пакалення пераможцаў і свята помнім, што вырашальны ўклад у разгром фашыстаў і выратаванне ўсяго чалавецтва ўнеслі нашы народы, народы СССР, — сказаў беларускі лідар. — Быць дастойнымі памяці аб вялікім подзвігу старэйшага пакалення — значыць усямерна берагчы мір, надзейна абараняць родную зямлю ад любых пагрозаў і выклікаў».

Кіраўнік беларускай дзяржавы аб'явіў падзяку ўсяму асабоваму складу за ўмелыя дзеянні ў ходзе аператыўна-стратэгічнага вучэння «Захад-2009». Прэзідэнты Беларусі і Расіі ўручылі каштоўныя падарункі і ўзнагароды ўдзельнікам вучэння, якія асабліва вызначыліся.

Вучэнні, падобныя да «Захаду-2009», будуць праходзіць па чарзе ў Беларусі і Расіі. Такая дамоўленасць дасягнута паміж прэзідэнтамі дзвюх краін. Аб гэтым паведаміў Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў.

«Мы спадзяёмся і ў будучым праводзіць падобныя вучэнні, таму што толькі ў ходзе такіх вайсковых мерапрыемстваў можна адтачыць баявое майстэрства і стварыць надзейную сістэму абароны нашых краін і нашай Саюзнай дзяржавы. Мы з Аляксандрам Рыгоравічам дамовіліся, што такія вучэнні будуць праходзіць папераменна на тэрыторыі Беларусі і Расіі. Таму гэта пачатак -- і, спадзяюся, удачны -- нашых сумесных вайсковых мерапрыемстваў», -- сказаў ён.

Прэзідэнт Расіі адзначыў, што ўсе гэтыя мерапрыемствы накіраваны толькі на тое, каб зрабіць жыццё ў Беларусі і Расіі больш камфортным, абароненым, сучасным і адпаведным тым патрабаванням, якія існуюць у людзей, а таксама якое дазваляе абараніць нашых людзей на самым высокім узроўні. «Гэта свяшчэнная задача для дзяржавы і для нашых узброеных сілаў», -- падкрэсліў Дзмітрый Мядзведзеў.

Расійскі лідар таксама падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, «за гасціннасць, якую сустрэлі расійскія войскі на беларускай зямлі».

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

КРЭДЫТ УЗАМЕН НА ПАВАГУ

Намеснік старшыні Дзятлаўскага райвыканкама асуджаная за махінацыі з крэдытамі. Яна атрымала чатыры з паловай гады абмежавання волі. Пра гэта паведаміў старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў Ігнацік.

Суд прызнаў былога намесніка Дзятлаўскага райвыканкама Алену Фабішэўскую вінаватай у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі і ў наўмысным прычыненні шкоды ў буйным памеры ААТ «Беларусбанк». Яна пазбаўленая права займаць кіруючыя пасады тэрмінам на 4 гады. Яе зяцю, галоўнаму заатэхніку ўпраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама Валерыю Каспяровічу, як выканаўцу прычынення шкоды, прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам на 4 гады. Акрамя таго, ён будзе вяртаць незаконна атрыманы льготны жыллёвы крэдыт па поўнай стаўцы з улікам пені, што павялічыць суму крэдыту амаль у два разы.

Чыноўніца падтасоўвала факты для таго, каб яе дачка атрымала льготны крэдыт на будаўніцтва ўласнага дома. Так, малодшая дачка атрымала на вяселле ад бацькоў двухпакаёвую кватэру, якую праз год... прадала маці. Замест кватэры было вырашана будаваць дом, але каб атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва, патрэбна была даведка, што маладая сям'я не адчужала жыллё. Намеснік старшыні райвыканкама змагла «пераканаць» супрацоўнікаў Слонімскага філіяла Гродзенскага агенцтва па дзяржрэгістрацыі і зямельным кадастры выдаць яе зяцю такую даведку. Акрамя таго, неабходную даведку аб тым, што сям'я пражывае ў хаце бабулі плошчай 160 кв.м выдала і Дзятлаўскае БТІ, саступіўшы настойлівым «просьбам» уплывовай чыноўніцы, хоць дом не быў зарэгістраваны ў адзіным рэестры нерухомасці. У выніку «Беларусбанк» выдаў ільготны крэдыт (з выплатай 3 % гадавых) у памеры амаль Br62 млн. Такім чынам, у сям'і Фабішэўскай засталіся ў распараджэнні і дом і двухпакаёвая кватэра, быў атрыманы льготны жыллёвы крэдыт. На жаль, узамен сям'я пазбавілася большага — працы, аўтарытэту, павагі.

БЕЛТА.

Фотарэпартаж

ДАРОГА Ў РАЙ

Наш карэспандэнт наведаў Рай, каб пераканацца, што назва на карце краіны — не выдумка і не памылка. Рай насамрэч існуе. Невялікая вёска за 200 кіламетраў на ўсход ад сталіцы, у Нямойцкім сельскім Савеце Сенненскага раёна, якая вольна раскінулася на адным з пагоркаў гэтак званага Аршанскага ўзвышша, пазначаная дарожнымі знакамі і паказальнікамі, адзін з якіх умацоўвае (на фотаздымку) трактарыст Уладзімір Рамановіч. Рай — рэальнае месца прапіскі, як сведчаць зваротныя адрасы на паштоўках і запісы ў метрыках і пашпартах яго 47 жыхароў. І хоць сярод гэтых жыхароў няма ніводнага Адама і ніводнай Евы (але такой бяды, дзеці тут нараджаюцца, магчыма, наступных гэтак і назавуць), няма дзівосных райскіх птушак і садоў з залатымі яблыкамі, але ёсць сям'я, якая справіла сёлета залатое вяселле, — Леанід і Галіна КРАСНОЎСКІЯ (на фотаздымку). Са знаёмства з імі — колішнімі калгаснымі механізатарам і паляводам, пад гукі гаспадарскага гармоніка пачалася экскурсія па населеным пункце са старазапаветнай назвай.

СТАР. 8

Навучэнцам — зніжкі

З 12 кастрычніка для праезду дзяцей ва ўзросце да пяці гадоў (у прыгарадных цягніках — да сямі гадоў) у пасажырскіх цягніках неабходна афармляць у білетнай касе бясплатны праязны дакумент (білет), паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі.

Таксама з 12 кастрычніка кошт абанементных білетаў ад станцыі адпраўлення да станцыі прызначэння будзе разлічвацца: «выхаднога дня» — як за 6 паездак «туды» і 6 паездак «назад» за адзін месяц; «на прад'яўніка» — як за 17 паездак «туды» і 17 паездак «назад» за адзін месяц; «дэкаднага» — як за 6 паездак «туды» і 6 паездак «назад». З 12 кастрычніка ўводзіцца абанементны білет «працоўнага дня». Ён сапраўдны на праезд з панядзелка па пятніцу. У білеце будуць указвацца зваротныя пасажыра (прозвішча, імя, імя па бацьку). Кошт такога білета разлічваецца, зыходзячы з 15 паездак «туды» і 15 паездак «назад» за месяц.

З 1 кастрычніка па 30 красавіка групам навучэнцаў установу адукацыі, што забяспечваюць атрыманне вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй агульнай адукацыі дзённай формы навучання, даюцца зніжкі пры праездзе ва ўнутрырэспубліканскіх маршрутах, у тым ліку прыгарадных цягнікамі: у памеры 10 працэнтаў — пры колькасці групы ад 6 да 24 чалавек, у памеры 15 працэнтаў — пры колькасці групы ад 25 чалавек і больш.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пасля пісьма

ДОМ «НА ХАЛЯВУ»

— Што, бацюшка, дом «на халяву» вырашылі пабудаваць? — спытаў адзін з падрадчыкаў гомельскага святара Уладзіміра Драбышэўскага.

— Калі халявай лічыць наяўнасць пяцярых дзяцей, старэйшай з якіх сем, а малодшай менш за год — тады так, «на халяву», — усміхнуўся айцец Уладзімір і не стаў спрачацца. Ён не ведаў тады, якім будзе працяг узаемаадносінаў і спадзяваўся, як заўсёды, на звычайную чалавечую сумленнасць.

Яны з матушкай Марынай будаваць дом вырашылі ў 2005 годзе, тады ў іх было двое дзяцей: Настасся і Мікалай. Маладыя адукаваныя бацькі — абодва фізікі, закончылі Гомельскі ўніверсітэт імя Францыска Скарыны. Ад самага пачатку свайго шлюбу ведалі, што плануюць нараджэнне дзяцей не будуць. А як інакш прапаведаваць веру, калі не ўчынкамі? Яны абодва не расказваюць аб тым, як прыходзілі да Бога, бо лічаць гэта сваім патаемным. Тым больш, што сёння іх думкі занятыя вельмі зямнымі праблемамі.

Дзе ў Гомелі дом пабудаваць?

Зварот у рэдакцыю газеты займае чатыры друкаваныя лісты дробным шрыфтам. Эмоцыі няма — толькі сухое пералічэнне фактаў: калі, куды, як звярталіся, каб на справе здзейсніць законнае права ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта №185 «Аб выдзяленні грамадзянам ільготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў».

«У адказ на нашы звароты ў 2006-07 гадах у гарадскі зямельны аддзел з просьбай аб выдзяленні нам зямельнага ўчастка пад забудову ў межах горада нам спасаліся на адсутнасць у горада такой магчымасці. Быў прапанаваны адзін участак далёка ад горада — у пасёлку Прыбар, і ў 2007 годзе другі — у пасёлку «Новае Жыццё». Месца службы ў горадзе Гомелі, адсутнасць асабістага транспарту і неразвітая інфраструктура пасёлка «Новае Жыццё» зрабілі для нас гэтыя прапановы непрымальнымі».

Урэшце яны набылі ўчастак у так званым Залінейным раёне: за сродкі сваякоў, якія для гэтай мэты прадалі двухпакаёвую кватэру і 2 гаражы. Яны і зараз жывуць у дамку, які прызнаны старым толькі на 70 %. Потым, каб пачаць будаўніцтва на другой палове ўчастка, была пяцімесячная цяганіна па яго падзеле, расказвае айцец Уладзімір:

— Тры гарадскія арганізацыі: БТІ, зямельны аддзел гарвыканкама і адміністрацыя Савецкага раёна не маглі вызначыць, хто з іх павінен гэтым займацца. Доўга не маглі вызначыцца, як прысвоіць адрас дому, якога пакуль не было, без чаго мы не маглі атрымаць крэдыт на будаўніцтва.

Усіх складанасцяў, з якімі на самым першым этапе сутыкнулася шматдзетная сям'я, проста не пералічыць. Адно добра: на шчасце, гэта не перашкодзіла ў 2006 годзе нарадзіцца двайняткам: Васілісе і Варвары. Тым часам 26.12.2007 года Драбышэўскія ўсё ж атрымалі дазвол адміністрацыі Савецкага раёна на будаўніцтва дома, а 29.01.2008 года — ільготны крэдыт ААТ «Беларусбанк».

СТАР. 6

ПУШЧАНСКІ ПАЛЁТ ПРАЗ СТАГОДДЗІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фотаздымак хутканогага аленя зроблены ў адным з куткоў Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». Гэтымі днямі адзначаецца 600-годдзе з часу ўсталявання ў Пушчы ахоўнага рэжыму. Чытачам «Звязды» прапануецца невялікая вандроўка па найстаражытнейшым лесе Еўропы, аб'яўленым сусветнай спадчынай.

Працяг тэмы на 6-й стар.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Ангелу Меркель з перамогай партыйнага блока ХДС/ХСС на выбарах у Бундэстаг

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Федэральнага канцлера Федэратыўнай Рэспублікі Германія Ангелу Меркель з перамогай партыйнага блока Хрысціянска-дэмакратычны саюз — Хрысціянска-сацыяльны саюз на выбарах у Бундэстаг.

Гэта перамога дасць магчымасць Ангеле Меркель прадоўжыць дзейнасць у якасці Федэральнага канцлера ФРГ.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ДЗЕРЖИНСКИЙ ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНО-МЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД» (ПРОДАВЕЦ)
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ТЕХНИКИ:

№ лота	Наименование, год выпуска	Начальные цены с НДС, бел. руб.
1	МАЗ 54323, седельный тягач, 1993 г.в.	18 410 000
2	ГАЗ 66, топливозаправщик, 1980 г.в.	3 282 000
3	Автобус МАЗ 104С, 2001 г.в. (на 40 мест)	93 712 000

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

ISSN 1990 - 763X

У МІНСКУ КОЖНАЯ ДРУГАЯ КВАТЭРА НА СУТКІ ЗДАЕЦЦА БЕЗ ВЫПЛАТЫ ПАДАТКАЎ

Да адказнасці за ўтойванне даходаў прыцягнуты 27 чалавек. Сума штрафаў склала больш як 30 мільёнаў рублёў.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».

ТАКІЯ ВОСЬ ВУЧАНІЦЫ

Ноччу па вуліцы Першамайскай у Пінску ішлі тры жыхаркі. Да жанчын падышлі дзве дзяўчыны і моцна іх пабілі. Нарад ДАІ затрымаў дзвюх вучаніц.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Прызначаецца паскораны цягнік

З 4 кастрычніка для зручнасці абслугоўвання пасажыраў на ўчастку Мінск — Баранавічы — Мінск па нядзелях прызначаецца паскораны электрацягнік.

Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 17.25, далей адпраўленне са станцый і прыпыначных пунктаў: Сталічны — 17.33, Курасоўшчына — 17.38, Рошча — 17.41, Пост №1 — 19.13, Баранавічы-Палескія — 19.32.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АУКЦИОН

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ДЗЕРЖИНСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2-этажного кирпичного административно-хозяйственного здания, об. пл. 393,9 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 4. Начальная цена с НДС (снижена на 10 %) – 396 195 030 бел. руб. Задаток – 25 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.08.09 г. Аукцион состоится **07.10.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.10.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.**

Беларусь кампенсуе частку працэнтаў па крэдытах пакупнікам беларускіх тавараў за межамі краіны

Адпаведны ўказ № 466 «Аб некаторых мерах па рэалізацыі тавараў, выраблены у Рэспубліцы Беларусь» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 верасня.

Дакумент распрацаваны ў мэтах стварэння спрыяльных умоў для прасоўвання беларускіх тавараў на знешні рынак і накіраваны на павелічэнне валютных паступленняў ад знешнеэканамічнай дзейнасці айчынных вытворцаў. Указам заканадаўча замацоўваецца палажэнне аб магчымасці кампенсацыі з рэспубліканскага бюджэту Беларусі часткі працэнтаў па крэдытах, што выдаюцца банкамі дзяржаў, з якімі адсутнічаюць мытны кантроль і мытнае афармленне, юрыдычным асобам гэтых краін — пакупнікам беларускіх тавараў. Урад лічыць, што ва ўмовах устаноўленай у Расійскай Федэрацыі забароны на льготнае крэдытаванне куплі беларускіх тавараў, гэта мера неабходна на пэўны час. Такія крэдыты намечана выдаваць у 2009—2010 гадах на тэрмін не больш як 5 гадоў.

Кампенсацыю працэнтаў прадугледжана ажыццяўляць на падставе дагавораў, якія заключаюцца ўрадам Беларусі з кожным з банкаў — нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь. У гэтых дагаворах будуць вызначаны ўмовы крэдытавання, працэнты, спаганяемыя банкам-нерэзідэнтам за карыстанне крэдытамі, парадак кампенсацыі працэнтаў. Гранічны памер кампенсуемых працэнтаў не перавысіць стаўку рэфінансавання, устаноўленую ў дзяржаве, на тэрыторыі якой набываюцца беларускія тавары. Паводле ацэнкі Мінпрама, на ажыццяўленне мераў, звязаных з рэалізацыяй указа, у 2009 годзе спатрэбіцца сума, эквівалентная $13 млн. Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

У Беларусі будзе дазволены перавод жылых памяшканняў на першых паверхах шматкватэрных дамоў у нежылыя

У Беларусі будзе дазволены перавод жылых памяшканняў, размешчаных у аднакватэрных (блакіраваных) жылых дамах, а таксама на першых паверхах шматкватэрных жылых дамоў, у нежылыя. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 25 верасня падпісаў указ № 479 «Аб пераводзе жылых памяшканняў у нежылыя і ўнясенні змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 2006 г. № 152».

Такі перавод будзе ажыццяўляцца па рашэнні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, прынятым па заяве ўласнікаў жылых памяшканняў.

Перавод жылога памяшкання ў нежылое дасць магчымасць уласнікам такіх памяшканняў размяшчаць у іх арганізацыі і іх падраздзяленні, выкарыстоўваць іх у прадпрымальніцкай дзейнасці.

Пры гэтым ва ўказе ўстаноўлены пэўныя абмежаванні, накіраваныя на недапушчэнне пераводу жылых памяшканняў у нежылыя, калі гэта не адпавядае правілам горадабудаўніцтва, прыродаахоўным, санітарным, проціпажарным і іншым патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

Прадугледжана таксама, што памяшканні, пераведзеныя ў нежылыя, не могуць выкарыстоўвацца для размяшчэння прамысловых вытворчасяў, а таксама аб'ектаў, якія з'яўляюцца крыніцамі выдзялення шкодных рэчываў, шуму і вібрацыі ў памерах, што перасягаюць устаноўленыя нарматывы, аказваюць негатыўны ўплыў на паказчыкі якасці навакольнага асяроддзя, умовы пражывання ў жылым доме іншых грамадзян і могуць прывесці да распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў.

Ва ўказе замацаваны вычарпальны пералік дакументаў, неабходных для пераводу жылога памяшкання ў нежылое, а таксама прапісана працэдура такога пераводу з пазначэннем тэрмінаў разгляду прадстаўленых дакументаў мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Як растлумачылі ў прэс-службе, дакумент прыняты ў адпаведнасці з запланаванымі мерапрыемствамі па лібералізацыі ўмоў ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці і накіраваны на стварэнне дадатковых спрыяльных умоў для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, у тым ліку на далейшае развіццё сферы паслуг па месцы жыхарства грамадзян.

Указ уступіць у сілу праз тры месяцы пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» і рэктар Гомельскага дзяржуніверсітэта ўдастоены ордэна Пашаны

Дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Канстанцін Вільчук і рэктар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны Аляксандр Рагачоў удастоены ордэна Пашаны.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 471 вялікая група прадстаўнікоў розных галін удастоена дзяржаўных узнагарод. Яны адзначаны медалямі і ордэнамі, ганаровымі званнямі за шматгадовую плённую працу, высокае прафесійнае майстэрства, умела арганізаваныя дзеянні па выяўленні і папярэджанні злачынстваў, заслугі ў развіцці аховы здароўя, навукі, культуры, адукацыі, транспарту, будаўнічай галіны, нафтавай прамысловасці, сувязі, спорту.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны кіраўнік Дарожна-будаўнічага трэста № 5 Міністэрства транспарту і камунікацый Валерый Кірычэнка. У ліку ўзнагароджаных ордэнам Францыска Скарыны — дырэктар — мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Валерый Анісенка, настаўнік хіміі дзяржаўнай агульнаадукацыйнай СШ № 1 горада Лепеля Валянцін Вялюга, загадчык кафедры драўляных духавых інструментаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Барыс Нічкоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Тавараабарот паміж Беларуссю і Паўднёвай Карэяй не адпавядае патэнцыялу эканомік дзвюх краін

Такую думку выказаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі на сустрэчы ў Мінску са старшынёй Гандлёва-прамысловай палаты Рэспублікі Карэя Сон Гён Шыкам.

Сяргей Сідорскі запрасіў, у прыватнасці, да супрацоўніцтва CJ Group, у структуру якой цяпер уваходзяць 27 кампаній.

Па выніках 2008 года аб'ём тавараабароту паміж Беларуссю і Паўднёвай Карэяй склаў $207,182 млн. Па выніках сямі месяцаў гэтага года аб'ём тавараабароту склаў $58,451 млн (тэмп да ўзроўню студзеня—ліпеня 2008 года — 51,9 працэнта). Асноўныя артыкулы экспарту Беларусі ў Рэспубліку Карэя апошнія 3—5 гадоў — інтэгральныя мікрасхемы, паўправаднікі, калій, поліаміды, шкловалакно і шклотканіны, вугляроднае валакно і тканіны, аптычныя і вымяральныя прыборы, лазерная тэхніка, прадукцыя металургіі. Экспартуецца ў асноўным высокатэхналагічная і навукаёмістая прадукцыя. Буйнейшыя пастаўшчыкі на паўднёвакарэйскі рынак: «Інтэграл», «Беларускалій», «Полацкшкловалакно», «Хімвалакно», «Гродна-Хімвалакно».

Сярод пераваг Беларусі Сон Гён Шык назваў выгаднае геаграфічнае становішча, заключэнне мытнага саюза з краінамі СНД, бяспеку і створаныя спрыяльныя ўмовы для прадпрымальніцкай дзейнасці. «Я думаю, гэтыя спрыяльныя ўмовы могуць паслужыць шанцам для пашырэння супрацоўніцтва», — сказаў ён.

БЕЛТА.

Ва Урадзе

МІНСЕЛЬГАСХАРЧ: НАЎРАД ЦІ МАГЧЫМА СПЫНІЦЬ СКАРАЧЭННЕ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў АСАБІСТЫХ ГАСПАДАРКАХ НАСЕЛЬНІЦТВА

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі прапанавала ўдакладніць сістэму паказчыкаў, якая даводзіцца сельскагаспадарчым арганізацыям краіны на 2010 год, у частцы, што характарызуе эфектыўнасць іх працы. Пад старшынствам прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага, у прыватнасці, абмеркавалі магчымасць мэтавага паказчыка па тэмпе росту прадукцыі сельскай гаспадаркі налета без уліку прадукцыі, якая атрымана ў асабістых падсобных гаспадарках.

Гэтая прапанова Мінсельгасхарча і аблвыканкамаў падтрыманая Нацыянальным статыстычным камітэтам і НАН Беларусі. Паводле слоў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Сямёна Шапіры, такі падыход дазволіць аб'ектыўна ацаніць дзейнасць грамадскага сектара сельскагаспадарчай галіны. Што ж датычыцца аб'ёмаў выпуску прадукцыі ў гаспадарках насельніцтва, то іх будзе ўлічваць Белстат па адпаведнай методыцы. Адзначаючы тое, што спажывецкі рынак рэспублікі практычна забяспечаны прадукцыяй аграрыяў, а экспарт харчавання толькі павялічваецца, Сямён Шапіра, разам з тым, падкрэсліў і наступнае: у асабістых гаспадарках грамадзян, дзе выпускаецца 36 працэнтаў сельгаспрадукцыі, нават нягледзячы на падтрымку мясцовых органаў і сельгасарганізацый, вытворчасць скарачаецца. І дадаў, што гэты працэс наўрад ці магчыма спыніць. Іншая справа — грамадскі сектар. Тут, дзякуючы падтрымцы дзяржавы і тэхнічнаму пераўзбраенню, за апошнія чатыры гады ўдалося забяспечыць прырост валавой прадукцыі ў 1,4 раза. Для дапаўнення кожнага працэнта скарачэння вытворчасці ў асабістых падсобных гаспадарках неабходна павялічыць вытворчасць у грамадскім сектары на 0,56 працэнта.

«Для выканання прагнознага паказчыка па росце валавой прадукцыі пры тых тэмпах зніжэння вытворчасці ў асабістых гаспадарках, якія намеціліся (95 працэнтаў да леташняга ўзроўню), сельгасарганізацыям неабходна павялічыць аб'ём вытворчасці валавой прадукцыі на 19 працэнтаў», — канстатаваў Сямён Шапіра. З улікам гэтага і прапануецца асобна ацэньваць эфектыўнасць працы гэтых сектараў.

У сваю чаргу міністр эканомікі Мікалай Зайчанка не падтрымаў падобную прапанову. Нельга, лічыць ён, замяняць паказчык вытворчасці сельгаспрадукцыі на паказчык па выпуску сельгаспрадукцыі, якая вырабляецца ў грамадскім сектары. «У нас ёсць праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады, дзе вызначаны паказчык вытворчасці сельгаспрадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак», — нагадаў міністр эканомікі. Да таго ж, дадаў ён, гэты паказчык закладзены ў праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2006—2010 гады і практыкуецца ва ўсім свеце, вызначаецца як структура-ўтваральны паказчык для фарміравання ВУП.

На ўчарашнім пасяджэнні міністр Сямён Шапіра таксама прапанаваў дапоўніць дзейную сістэму паказчыкам рэнтабельнасці сельгасвытворчасці па канчатковым фінансавым выніку. Пры гэтым, паводле яго меркавання, неабходна ўлічваць спецыфіку сельгасвытворчасці і рабіць ацэнку выканання гэтага паказчыка толькі па выніках года. Па выніках абмеркавання кіраўнік Урада даручыў зацікаўленым міністэрствам і Нацыянальнай акадэміі навук дапрацаваць агучаныя прапановы, якія здольныя ўдасканаліць сістэму па ацэнцы эфектыўнасці працы сельгасарганізацый.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

БЕЛАРУСКІЯ ПАШТАВІКІ ВЫБІРАЛІ ЛЕПШЫХ

Фінішаваў XIII Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў пошты

Бернская канвенцыя, падпісаная 135 гадоў таму, стала галоўным падмуркам для ўтварэння Сусветнага паштовага саюза (СПС) — міжнароднай арганізацыі, якая на сёння аб'ядноўвае паштовыя адміністрацыі 191 краіны свету. Кожны год 9 кастрычніка ўсе паштавікі адзначаюць сваё прафесійнае свята — Сусветны дзень пошты. Беларусь у рады СПС увайшла ў 1947 годзе. І на сёння рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта» — вядучая паштовая структура ў Беларусі.

Лепшы паштальён краіны — Алена МАЛІНОЎСКАЯ.

РУП «Белпошта» да прафесійнага свята прымеркавала рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства аператараў паштовай сувязі, а таксама паштальёнаў па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ. Конкурс праходзіў два дні і складаўся з двух этапаў: прэзентацыі камандаў пад дэвізамі «Наша візітоўка» і «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся — вачамі паштовай моладзі», а таксама конкурс «Паштовая размінка», дзе паштавікі адказвалі на тэарэтычныя пытанні і выконвалі практычныя заданні.

Лепшых выбіралі сярод аператараў паштовай сувязі і сярод паштальёнаў. Тройку лепшых у першай намінацыі ўзначаліла Ірына Дуброўская — аператар АПС № 48 г. Гомеля, лепшым жа паштавіком прызнаная **Алена МАЛІНОЎСКАЯ, паштальён АПС Ваўкавыскага РУПС Гродзенскага філіяла.** Спецыяльны прыз Алена атрымала і ад нашай газеты.

— Праца паштальёна мне падабаецца, — расказала «Звяздзе» спадарыня Маліноўская. — Вучышся шукаць да людзей падыход, кантактаваць з імі. Кліенты бываюць розныя, ёсць і любімыя. Скажам, ёсць жанчына, якая афармляе падпіску кожныя паўгода дзесьці на паўмільёна беларускіх рублёў.

«Лепшым майстрам паштовай справы» прызнаная Ганна Корбут, аператар АПС № 116 вытворчасці «Мінская пошта». «Лепшым паштовым эрудытам» стала Наталля Якаўцава, паштальён АПС № 36 г. Гомеля. А «лепшым паштавідам» назвалі Марыну Старасценку, паштальёна АПС № 4 Светлагорскага РУПС Гомельскага філіяла.

Перамогу ў агульным камандным заліку такім чынам святкавала каманда Гомельскага філіяла. Другое месца ў Брэсцкага філіяла, а замыкае тройку прызёраў Гродзенскі філіял.

— Для мяне самым вялікім вопытам сталі стасункі з людзьмі, — прызнаецца **паштальён па дастаўцы паштовых адпраўленняў і друкаваных СМІ вытворчасці «Мінская пошта», самая маладая з паштавікоў 20-гадовая Наталля СВЯТЛОВА.** — У мае абавязкі ўваходзіла прыходзіць да кліента і афармляць падпіску ў яго дома, уручаць заказныя лісты, бандэролі... Асаблівай навукай сталі для мяне стасункі з пенсіянерамі. Да кожнага старалася знайсці свой індывідуальны падыход: каб не толькі знайсці кантакт, але яшчэ і падняць ім настрой. Ну і, вядома ж, мне, як маладому спецыялісту, вельмі карысна было папрацаваць у калектыве.

Конкурсы прафесійнага майстэрства работнікаў пошты ў Беларусі праводзяцца з 1996 года. За гэты час не толькі аператары паштовай сувязі і паштальёны вызначалі лепшых у сваіх шэрагах, але і начальнікі гарадскіх і вясковых аддзяленняў, а таксама кіроўцы аўтамабіляў. XIII Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства быў прысвечаны Году роднай зямлі і Году моладзі.

Ілья ЛАПАТО.

Пераможцы XIII Рэспубліканскага конкурсу паштавікоў у асабістым заліку.

АРМЕНІЯ СТАНОВІЦЦА БЛІЖЭЙШАЙ

Падчас сустрэчы з журналістамі з нагоды «паўналецця» незалежнасці Арменіі пасол гэтай краіны ў Беларусі Алег Есаян распавёў пра новыя здабыткі двухбаковых стасункаў. Асабліва адзначыў ён актыўнае культурнае супрацоўніцтва. Гэта ўмацоўвае адносіны, — падкрэсліў дыпламат. Маўляў, калі размова ідзе пра сяброўства народаў, то фарміруе гэтыя адносіны звычайна абмежаваная колькасць людзей, а самі народы рэдка калі і сустракаюцца. А вось асабістая прысутнасць, сумесны ўдзел у фестывалях і выставах — самы прамы і эфектыўны шлях да наладжвання трывалых міждзяржаўных стасункаў. У гэтую восень у Арменіі маюць адбыцца Дні культуры Беларусі.

«Сусветны эканамічны крызіс не абышоў ні Арменію, ні Беларусь», — канстатаваў кіраўнік дыпмісіі. Аднак тым больш прыемна казаць у такі час пра павелічэнне тавараабароту паміж нашымі краінамі (дарэчы, у структуры тавараабмену 80 працэнтаў складае экспарт беларускай прадукцыі ў Арменію).

— Мы ўжо перасягнулі межы 30 млн доларaў. Зразумела, гэта не тое, што трэба і пажадана, аднак з улікам шмат якіх абставінаў, вынік вельмі неблагі, — адзначае Алег Есаян. — За апошнія тры гады наш тавараабарот вырас больш чым удвая, а за крызісны год, уявіце, — павялічыўся на 20 працэнтаў. З улікам тых праектаў, якія абмяркоўваюць нашы кампаніі, нават пры частковай іх рэалізацыі мы можам з упэўненасцю гаварыць пра значны, адчувальны рост у наступным годзе.

Аднак самае галоўнае, на думку дыпламата, тое, што армянскія фірмы ўсвядомілі: нават на такой адлегласці магчымае эфектыўнае супрацоўніцтва. Гэтак жа важна і тое, што ў армянскага пакупніка ёсць давер да беларускай прадукцыі. У багацці аднародных тавараў выбар заўжды засноўваецца менавіта на даверы да вытворцы, — перакананы дыпламат.

Ёсць пэўныя накіды ў супрацоўніцтве па навуковым і адукацыйным кірунках. Ужо адбыўся візіт у Беларусь дэлегацыі на чале з прэзідэнтам Акадэміі навук Арменіі, чакаецца аналагічны візіт іх беларускіх калег. А ў перспектыве — і падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве ў сферы навукі і адукацыі. Прынамсі флагманы вышэйшай школы дзвюх краін (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Ерэванскі дзяржаўны ўніверсітэт) пагадненне паміж сабой ужо падпісалі. Гэта ўжо добры зачын.

— Нашы краіны ўжо практычна прыступаюць да будаўніцтва АЭС, таму, мяркую, і ў гэтай сферы ёсць што абмеркаваць у плане эксплуатацыі, бяспекі, усіх пытанняў, звязаных з сучаснай атамнай энергетыкай.

Прасоўваецца і рэгіянальнае супрацоўніцтва: у поўным аб'ёме рэалізуецца яно паміж Мінскай вобласцю і Сюнікскай вобласцю сяброўскай дзяржавы. Яшчэ адна вобласць Арменіі мае намер супрацоўнічаць з Магілёўскай вобласцю — такое пажаданне губернатар выказаў нядаўна паслу Арменіі ў Беларусі.

Калі раней наракалі на тое, што толькі адно армянскае прадпрыемства працуе ў Беларусі ў сферы вытворчасці сусветна вядомых армянскіх каньякоў, то цяпер на беларускім рынку з'явіліся яшчэ чатыры фірмы. Разам з адпаведнымі беларускімі калегамі справа даводзіцца да сумеснага выпуску каньячнай прадукцыі, — адзначыў Алег Есаян.

Паспяхова працуюць ужо створаныя сумесныя прадпрыемствы: гандлёвы дом «БелАр», Прамагрансэрвіс, Прамагралізінг. Апошнія два, між іншым, утвораныя на працягу гэтага года, працуюць у галіне паставак абсталявання, тэхнікі — сельскагаспадарчай, дарожна-будаўнічай, аўтамабільнай — і запчастак да яе.

— Мы і ў мінулыя гады казалі аб тым, што пажадана, каб у Арменіі быў наладжаны выпуск беларускай тэхнікі, — падкрэсліў дыпламат. — Пагадненне падпісана, адна наша прыватная фірма збіраецца выйсці на сур'ёзныя рубяжы па зборцы трактароў беларускай вытворчасці ў Ерэване.

Спадар Есаян паведаміў таксама, што ў Арменіі плануецца адчыніць гандлёвы дом Беларусь, дзе беларускія фірмы змогуць спакойна працаваць і рэалізоўваць сваю прадукцыю. Сякія-такія напрацоўкі ёсць і ў банкаўскай сферы. Прадстаўнікі банкаў Беларусі пабывалі ў Арменіі, падпісаныя дагаворы аб супрацоўніцтве.

Да канца года, верагодна, адбудзецца візіт міністра замежных спраў Беларусі Сяргея Мартынава ў Арменію. Дасягнутая дамоўленасць аб візіце ў Беларусь кіраўніка армянскага парламента Авіка Абрамяна, а таксама прэм'ер-міністра Арменіі Тыграна Саркісяна. «Мы маем усе падставы чакаць, што гэты год стане пачаткам больш цеснага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі», — заключыў дыпламат. А гэта зробіць іх бліжэйшымі, нягледзячы на адлегласць.

Ала МАЧАЛАВА.

ДЗІКІ НА ПАДВОРКУ

Двух сяголеткаў дзіка знайшлі на прыватным падворку грамадзяніна работнікі Гомельскай аблінспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Брагінскага РАУС, калі прыязралі паступіўшы да іх сігнал. Дазвольных дакументаў на ўтрыманне жывёл у няволі ў чалавека не было.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАЦІЛА Баляслаў Іосіфавіч

29 верасня 2009 года на 91-м годзе пасля цяжкай хваробы пайшоў з жыцця былы міністр фінансаў БССР Баляслаў Іосіфавіч Шаціла.

Шаціла Баляслаў Іосіфавіч нарадзіўся 4 лютага 1919 года ў вёсцы Горкі Чэрвенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў у 1939 годзе пасля заканчэння Гомельскага фінансава-эканамічнага тэхнікума. У фінансавай сістэме прапрацаваў больш як 50 гадоў і прайшоў шлях ад кантралёра-рэвізора КРУ па Крычаўскім раёне Магілёўскай вобласці да міністра фінансаў БССР.

23 чэрвеня 1941 года Шаціла Б.І. быў мабілізаваны ў РСЧА і пакінуты для работы ў Крычаўскім райваенкамаце. У ліпені 1941 года ў сувязі з кантузіяй і хваробай быў эвакуяваны ў горад Тамбоў для лячэння. Пасля выздараўлення працаваў інспектарам па бюджэце райфінаддзела, сакратаром райвыканкама, загадчыкам райфінаддзела ў г. Знаменка Тамбоўскай вобласці. У лістападзе 1943 года пасля заканчэння курсаў савецка-партыйнага актыву ў Маскоўскай вобласці ён быў накіраваны на аднаўленне народнай гаспадаркі ў Гомельскую вобласць, назначаны загадчыкам Навабеліцкага райфінаддзела Гомеля.

Усё далейшае жыццё Шацілы Баляслава Іосіфавіча звязана з Беларуссю, дзе ён працаваў на розных пасадах у фінансавых органах рэспублікі. З 1965 па 1990 год Шаціла Б.І. займаў пасаду міністра фінансаў БССР. На працягу гэтых гадоў Баляслаў Іосіфавіч заўсёды быў у першых радах барацьбы за ўздым эканомікі рэспублікі, за ўдасканаленне фінансавай і эканамічнай дзейнасці. Яго заўсёды хвалявала не толькі выкананне бюджэту, але і забеспячэнне кантролю за эканомным расходаваннем дзяржаўных сродкаў.

На сродкі, атрыманыя пры перавыкананні бюджэту ў рэспубліцы, былі пабудаваны шпіталь для інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, дамы адпачынку, пансіянаты для састарэлых і інвалідаў вайны і працы. За кошт бюджэту рэспублікі часткова фінансаваліся будаўніцтва метрапалітэна, вялікія сродкі накіроўваліся на мерапрыемствы па падтрымцы сельскай гаспадаркі, добраўпарадкаванне гарадоў, населеных пунктаў, іншыя сацыяльна значныя праграмы.

Знаходзячыся на заслужаным адпачынку, Баляслаў Іосіфавіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, у выхаванні маладога пакалення фінансістаў.

Шаціла Б.І. быў сапраўды дзяржаўным чалавекам, чалавекам вялікага розуму і не менш шчодрага сэрца. Яго вызначалі здольнасць знаходзіць арыгінальныя і нестандартныя рашэнні ўзнікаючых праблем, высокая патрабавальнасць да сябе і падначаленых.

Ён неаднаразова выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, з'яўляўся членам Прэзідыума Савета Міністраў БССР, членам ЦК КПБ.

Шаціла Б.І. удастоены ганаровага звання «Заслужаны эканаміст БССР», узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Дружбы народаў», многімі медалямі.

Светлая памяць пра Баляслава Іосіфавіча, пачуццё высокай павагі да яго назаўсёды застануцца ў нашых сэрцах.

А.У. Кабякоў, Л.В. Анфімаў, А.М. Харкавец, М.П. Зайчанка, Г.К. Дзяйко.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне намесніку галоўнага рэдактара «Народной газеты» Віктару Якаўлевічу Чарнушэнку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — заўчаснай смерцю ЖОНКІ.

Спорт-тайм

БАТЭ ГАРАНТАВАЎ САБЕ МЕДАЛІ

У 21 туры чэмпіянату Беларусі па футболе лідары атрымалі чарговыя перамогі. БАТЭ, які ўпершыню выйграў у «Граніта» (у трох папярэдніх сустрэчах фіксаваліся нічыйныя вынікі), захаваў дзесяціачковы адрыў ад мінскага «Дынама» і за пяць тураў да фінішу гарантаваў сабе як мінімум сярэбраныя медалі. Вось вынікі матчаў, якія прайшлі 27 верасня: «Граніт» — БАТЭ — 1:3, «Нафтан» — «Дынама» (Мн) — 0:2, МТЗ-РІПА — «Мінск» — 1:0, «Гомель» — «Дынама» (Бр) — 3:1, «Шахцёр» — «Смаргонь» — 2:0, «Віцебск» — «Нёман» — 2:1, «Тарпеда» — «Днепр» — 0:0. Становішча каманд: БАТЭ — 50 ачкоў, «Дынама» (Мн) — 40, «Днепр» — 33, «Нафтан» — 32, «Тарпеда» — 32, «Шахцёр» — 32, «Гомель» — 28, «Дынама» (Бр) — 28, «Нёман» — 27, «Віцебск» — 25, МТЗ-РІПА — 25, «Мінск» — 24, «Граніт» — 21, «Смаргонь» — 10. БАТЭ і «Смаргонь» згулялі па 20 матчаў, астатнія каманды — па 21. Наступны тур пройдзе 4 кастрычніка.

Абзац

◢ У Дзень пажылых людзей 1 кастрычніка пенсіянеры, якія жывуць у Брэсцкай вобласці, змогуць скарыстацца паслугамі грамадскага аўтатранспарту бясплатна. Такую паслугу для ўсіх, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, робіць адкрытае акцыянернае таварыства «Брэстаблаўтатранс». Бясплатна можна праехаць у гарадскіх, прыгарадных і міжгародніх аўтобусах і мікрааўтобусах у межах Брэсцкай вобласці.

◢ Беларускія памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні затрымалі 28 верасня ў пункце пропуску «Брэст» своеасаблівую «заакраму» на колах, што накіроўвалася ў нашу краіну. Вадзіцель, жыхар Баранавічаў, пераабсталяваў свой «Мерседэс». За дэкаратыўнай панэллю і аўдыясістэмай, у нішы за пасажырскім сядзеннем было схавана 50 пакункаў корму для грызуноў і папугаяў, каля 2 тыс. рыбалоўных кручкоў, 190 паплаўкоў, больш за 30 рыбалоўных катушак, 60 блёснаў і 6 кг апарышаў. Кантрабанда ацэненая ў суму больш за Br900 тыс. Лёс іншамаркі коштам $25 млн вырашыць суд.

Поўны абзац

◢ У Днепрапятроўску бацька «замініраваў» рэстаран, пакрыўдзіўшыся на прыёмную дачку, якая не запрасіла яго на вяселле. 40-гадовы мужчына затрыманы. Як высветлілася, зняважаны бацька, будучы ў нецвярозым стане, пазваніў са свайго мабільнага тэлефона на «102» і ананімна паведаміў аб замініраванні рэстарана, дзе праходзіла вяселле без яго. Матэрыялы перададзеныя ў суд.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВУЧЫ ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ ПА-БЕЛАРУСКУ!

У Мінску выходзіць унікальная серыя граматык еўрапейскіх моваў

Гэта даволі істотная праблема — пры вывучэнні замежнай мовы беларускамоўныя людзі часцей за ўсё вымушаныя карыстацца мовай-пасярэдніцай — рускай. Умоўна кажучы, спачатку глядзець пераклад французскага слова на рускую, а пасля ўжо пераствараць гэта па-беларуску. Дзякаваць лёсу, мы ўжо маем нямецка-беларускі, англійска-беларускі, польска-беларускі, украінска-беларускі слоўнікі ды колькі іншых. А вось з граматыкамі да нядаўняга часу была сапраўдная бяда. Становішча вырашыў выправіць дырэктар выдавецтва «Радыёла-плюс» Уладзімір СІЎЧЫКАЎ. Задумаў амбітны праект — выдаць кароткія граматыкі дваццаці ці нават трыццаці моваў па-беларуску. Прычым не толькі пашыраных, але нават валійскай і мальтыйскай моваў!.. І мэтанакіравана, крок за крокам, дасягае мэты.

— Спадар Уладзімір, якія граматыкі ўжо пабачылі свет?

— Ад пачатку года мы выпусцілі ўжо пяць такіх кніжак: граматыкі польскай, шведскай, англійскай, латышскай і лацінскай моваў. На чарзе — граматыкі славацкай, украінскай, нямецкай, фінскай, партугальскай, ірландскай, эстонскай, харвацкай, мальтыйскай. На пятым З'ездзе беларусаў свету да мяне падышла італьянка Лідзія Федэрыка Мацытэлі, якая бліскуча ведае беларускую мову, і прапанавала: давайце я вам напішу граматыку італьянскай!.. Гэта цудоўна, што спіс моваў абнаўляецца такім натуральным чынам!.. А прынцып выдання наступны: адна граматыка суседняй нам мовы, адна — далёкай. Адметна, што да нас звяртаюцца самі аўтары — беларусы, якія ведаюць экзатычныя мовы, і прапаноўваюць склясці граматыкі. Такім чынам у наш спіс дадаліся, скажам, русінская ці македонская мовы.

— І на каго будуць разлічаныя такія рэдкія ў нашых шыротах віды?

— Упэўнены, што знойдуцца людзі, якія з мэтаў калекцыянавання будуць купляць усе кнігі серыі — тым больш, каштуюць яны досыць танна. Знойдуцца людзі, якія зразумеюць — усе еўрапейскія мовы чапляюцца адна за другую, ёсць агульныя моманты, пункты судакранання. Адна мова дапамагае вывучыць другую... Таксама ёсць такі момант — мы павінны дбаць пра вечнае. Беларусы павінны мець граматыкі ўсіх асноўных моваў па-беларуску!

— Добра, а больш распаўсюджаныя мовы — якім вы бачыце сярэдняга пакупніка «граматык»?

— Я мяркую, што на кожную мову знойдзецца свой пакупнік. Камусьці найбольш спатрэбіцца граматыка польскай мовы — ездзіць у Польшчу па працы ці да сваякоў. Камусьці — латышскай. Вось перакладчыца і паэтка Марыйка Мартысевіч мне днямі расказала, што была рада пабачыць граматыку латышскай мовы, бо мае ў Рызе сваякоў, якіх рэгулярна наведвае. Дарэчы, з латышскай моваў мы выслучыліся, бо такой граматыкі няма нават па-руску! У выданні гэтай серыі ёсць і культурніцкі момант. Барыс Юстынавіч Норман, загадчык кафедры славянскага і агульнага моўнаазнаўства Белдзяржуніверсітэта, прызнаўся мне, што вельмі ўзрадаваўся гэтай серыі. Бо, кажа, нам не хапае падручнікаў і дапаможнікаў па многіх мовах — і гатовыя былі б праводзіць семінары ці адкрываць кірункі, але ж няма па чым вучыць... Так што аматары рэдкіх моваў будуць усцешаныя... Але Барыс Юсцінавіч усур'ёз падумвае напісаць граматыку такой «рэдкай» мовы як... руская!

— Спадар Уладзімір, мяркуючы па прозвішчах на вокладках, аўтары ўсіх граматык — беларусы. Чаму не людзі, для якіх тыя мовы — родныя?

— Такая была задума, гэта робіць знарок. Граматыкі пішуцца беларусамі для беларусаў. Яны пішуцца з аглядкай на беларускую менталь-



насць. Бо толькі беларус патлумачыць беларусу, як ён вывучыў тую ці іншую мовы, як ён запамінаў нейкія формы і асаблівасці. Мажліва, будуць выключэнні, калі нашы філолагі створаць граматыкі ў суаўтарстве з замежнымі калегамі.

— Дарэчы, а што было першай цаглінкай?

— Ідэя ўзнікла практычна выпадкова — беларус Якуб Лапатка, які даўно жыве ў Хельсінках, распавёў мне, што працуе над граматыкай фінскай мовы па-беларуску. Спачатку я не захапіўся — не быў упэўнены, што знойдзецца шмат аматараў такой граматыкі. Але калі абмалявалася канцэпцыя серыі — я зразумеў, што гэта шалёна цікава!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПУЦІН ПААБЯЦАЎ СТАБІЛЬНАСЦЬ КУРСУ РУБЛЯ



Расійскія ўлады здольныя абараніць ад узрушэнняў фінансавую сістэму краіны і не дапусціць рэзкага зніжэння рубля, заявіў у аўторак прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін, выступаючы на інвестыцыйным форуме ВТБ Капітал «Расія кліча».

Таксама прэм'ер паведаміў, што будзе захаваная манаполія на рэалізацыю прыроднага газу на знешнім рынку. «Вядома, не на ўсё астатняе жыццё, але на найбліжэйшую сяродняетэрміновую перспектыву дакладна», — адзначыў Пуцін. Зніжэнне ВУП па выніках 2009 года можа скласці каля 8 % або нават менш, паведаміў кіраўнік урада. Таксама не забыўся прэм'ер і пра папулярную тэму — павышэнне пенсій. Рост пенсій у Расіі забяспечыць дадатковы ўнутраны попыт на суму каля 1 трлн рублёў (звыш 30 млрд долараў), заявіў ён.

«Расія, мабыць, адзіная краіна ў свеце, якая ва ўмовах глабальных эканамічных цяжкасцяў рашылася на маштабную пенсійную рэформу. У канцы гэтага года, з 1 снежня, у нас будзе ў чарговы раз павышаная на 30 % базавая частка пенсіі, а ў наступным годзе рост пенсіі ў сяроднім за год складзе беспрэцэдэнтную для Расіі лічбу — 46 %», — сказаў Пуцін.

Прэм'ер-міністр РФ таксама лічыць дачасным згортванне антыкрызісных праграм і лічыць актуальнай падтрымку галін, у якіх паў

Дзякуй!

РАЗАМ... НЕ ТОЛЬКІ НА ЗДЫМКУ

Гора заўжды, відаць, прыходзіць нечакана: атрымаўшы вестку пра смерць сястры, я (мама ў бальніцы, уся астатняя радня раскідана за межамі Беларусі) не ведала, што рабіць. З мужам і дачкой мы, спустошаныя, разгубленыя, прыехалі ў горад Бяроза, дзе жыла нябожчыца. А што далей? Куды кідацца, з чаго пачынаць?

На наша шчасце першы ж вайсковец, да якога звярнуліся на вакзале (Лена была капітанам медыцынскай службы), ведаў пра нашу бяду — дапамог дабрацца да вайсковай часці. А далей...

Сястра па стане свайго здароўя ўжо сем гадоў не працавала, але, нягледзячы на гэта, у калектыве цудоўна помнілі яе, разам з намі шкадавалі аб такім дачасным сыходзе, шмат што прадумалі і нават зрабілі...

Ад адчування клопату і спагады з боку былых супрацоўнікаў, людзей гарадка, нам хоць трохі рабілася лягчэй...

Шчыры дзякуй усім ім за клопат, і за такую патрэбную падтрымку! Наша сям'я ніколі не забудзе яе!

Марына КАЛІНІНА.

г. Мінск.

P.S. *Гэты здымак быў зроблены, калі сястра яшчэ працавала.*

На ім практычна ўсе, хто праводзіў яе і ў апошні шлях.

Акцыі

«Дабрыня выратуе свет»

У гэтым пераканаўся арганізатары дабрачыннай акцыі для выхаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Заводскага раёна горада Мінска.

— Акцыя праходзіць у межах міжнароднага мядовага фестывалю «У гасцях у пчолкі», — расказвае **піяр-менеджар фестывалю Марына КЛЕВЕЦ**. — На працягу апошняга тыдня верасня мы збіраем рэчы першай неабходнасці, цацкі, развівальныя гульні, якія пасля перададзім выхаванцам прытулку. Больш за тое, іх чакае незвычайны лекавы падарунак ад пчолак — мядовы куб вагой каля 40 кілаграмаў.

Мядовы фестываль праходзіць не толькі ў сталіцы, але і ў многіх абласных і раённых гарадах краіны — Гомелі, Магілёве, Оршы, Ваўкавыску, Калінкавічах... Наведвальнікі фестывалю набываюць самыя розныя гатункі мёду з Расіі, Беларусі, Украіны, а «пчолкі» ў гэты час наведваюць карэкцыйныя цэнтры, дзіцячыя садкі для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, сацыяльныя прытулкі і дораць дзецям мёд.

Надзея ДРЫЛА.

Выхаванцы сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Заводскага раёна прынялі непасрэдны ўдзел у фестывалі. Дзеці каталіся на горках, удзельнічалі ў конкурсах і віктарынах, спявалі песні і расказвалі вершы, а таксама часта вучыліся тульскімі пернікамі, якія былі асвечаны ў прыходзе Храма Казанскай Божай Маці.

Імпартнае піва саступіла беларускаму

Падчас закрытай дэгустацыі найбольш распаўсюджаных у айчыннym гандлі гатункаў піва беларуская прадукцыя была прызнаная лепшай у 8 з 10 груп. Аб гэтым паведаміла **прэс-сакратар канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Ірына ГУСЕВА**.

Усяго ў дэгустацыі паўдзельнічалі 44 узоры піва беларускіх, расійскіх, украінскіх і германскіх вытворцаў. Прычым для «чысціні эксперыменту» была вызначаная ўмова — кожны з гатункаў спецыялісты і звычайныя спажыўцы маглі пакаштаваць толькі ў закрытых, без этыкетак, бутэльках, якім загадзя былі прысвоеныя пэўныя нумары. Вынікі ж былі даволі нечаканымі — беларуская прадукцыя прызнаная лепшай «за яўнай перавагай».

У прыватнасці, у групе «Піва светлае 10 %» перамагла марка «Аліварыя дзясятка», у групе «Піва светлае 11 %» — «Гёсэр» піваварнай кампаніі «Сябар», у групе «Піва светлае 12 %» — «Аліварыя залатое», у групе «Піва светлае 14 %» — «Александрыя», у групе «Піва светлае пшанічнае нефільтраванае» — «Аліварыя белае золата», у групе «Піва цёмнае 12 %» — «Лідскае аксамітнае», у групе «Піва цёмнае 14 %» — «Аліварыя Траецкае», у групе «Піва цёмнае 18—20 %» — «Портэр Брэсцкі». У сваю чаргу замежныя вытворцы напрадзе ў дзвюх намінацыях: «Безалкагольнае піва» («Абалонь», Украіна») і «Піва цёмнае пшанічнае нефільтраванае» («Паўланер», Германія). Пры гэтым, заўважыла Ірына Гусева, вытворчасць таго ж пшанічнага піва — пакуль яшчэ новы напрамак у піваварнай галіне Беларусі.

Сяргей ГРЫБ.

Паважаную ***Валянціну Пятроўну ШПІЛЕЎСКУЮ*** *сардэчна віншуем з прыгожай юбілейнай датай!*

Жадаем моцнага здароўя на доўгія гады, душэўнага спакою, дабра і цяпла. Заставайцеся такой жа прыгожай, жывіце ў павазе, радасці і з добрай надзеяй. Усё, што ад Бога ёсць цудоўнага на зямлі, мы шчыра жадаем Вам!

Звяздоўцы.

СЫН НА БАЦЬКУ

У бальніцу г. Бяроза быў дастаўлены 83-гадовы пенсіянер з цяжкай кантузіяй і выбітым вокам. Супрацоўнікі міліцыі вызначылі, што пакалечыў старога чалавека яго сын. 54-гадовага мужчыну затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАД «МІНСКІМ ЛЁДАМ»

Гэтымі днямі Мінск упершыню прымаў этап Гран-пры па фігурным катанні сярод юніёраў. Не хацелася б перагружаць чытачоў сухімі статыстычнымі звесткамі «Мінскага лёду» (менавіта такую назву меў турнір). Пакінем гэта спартыўнай прэсе. А самі лепш прыпынімся на некаторых адметных моментах турніру, якія дапамогуць адчуць яго атмасферу.

Лічбы турніру

Толькі што паабяцалі без сухой статыстыкі, а адразу пра лічбы, скажаце вы. Так, але без гэтых лічбаў ніяк не абысціся. У беларускую сталіцу з'ехалася 119 маладых спартсменаў з 30 краін свету (прысутнічалі і такія экзатычныя, як Ганконг, Філіпіны, Тайланд).

Напрыклад, у парныя спаборніцтвы заявілася толькі 14 дуэтаў з васьмі краін, а сярод юніёрак выступала 26 дзяўчат з 21 краіны.

Недабор турніру

Працягваючы размову пра ўдзельнікаў, трэба прыгадаць, што па правілах юніёрскага Гран-пры гаспадары этапа могуць быць прадстаўлены ў кожным відзе праграмы максімальнай (3 чалавекі) колькасцю спартсменаў. І калі ў адзіночным катанні і танцах на лёдзе наша каманда выступіла поўным баявым камплектам, то беларускіх пар мы ніводнай не ўбачылі. І куды перавяліся хоць якія пары? Гаворка не ідзе нават пра зорак.

Мініяцюрнасць турніру

У гэтую катэгорыю, безумоўна, трэба ўпісаць імя трынаццацігадовай кітайскай фігурысткі Вэнджынг Суі, якая разам з партнёрам Цонгам Ханам перамагла ў спаборніцтве пар. Дакладных звестак няма, але здаецца, што росту ў ёй не больш за 140 сантыметраў. Дадайце да гэтага вялікія вочы, якімі Вэнджынг спалохана глядзела на ўсё на прэс-канферэнцыі — і зразумееце, чаму проста немагчыма не ўзгадаць гэтага мілага чалавечка.

Цяжкасці перакладу і дэбют турніру

І тут не абысціся без прадстаўнікоў Кітая. Каб паразмаўляць з парай Суі/Хан, журналістам давялося шукаць іншую прадстаўніцу кітайскай дэлегацыі, якой перакладалі пытанні на англійскую мову, а яна далей на кітайскую. Тое самае ў адваротным кірунку. Але, не зважаючы на такія цяжкасці, атрымалася даведацца, што для пераможцаў гэта быў дэбют на міжнароднай арэне. А каб паехаць у Беларусь, кітайскай пары трэба было прайсці некалькі этапаў адбору на радзіме. Прыехалі, убачылі, перамаглі. Сапраўды бяздонныя чалавечыя рэсурсы ў гэтай краіне.

Перааншлаг турніру

Здарылася такое ў першы дзень спаборніцтваў. Падчас урачыстага адкрыцця, кіруючыся старой добрай практыкай дабравольна-прымусовага запрашэння школьнікаў на трыбуны, арганізатары, так бы мовіць, трошкі перастараліся. Некаторым давялося стаяць уздоўж борцікаў вакол катка. Такое вось набліжэнне фігурнага катання да масаў.

Што да астатніх дзён турніру, то гледачоў, на жаль, шмат не было. Ад пары соцень раніцай, да пары тысяч вечарам. Уваход, між тым, быў вольны. І паглядзець было на што: фігурнае катанне ўжывую і на экране тэлевізара — гэта зусім розныя рэчы.

Лакальная перамога турніру

Такім тэрмінам можна назваць лепшы беларускі вынік — 11-е месца танцавальнай пары Вікторыя Кавалёва/Юрый Бяляеў. Разам яны трэніруюцца толькі другі год. Пры ўсіх праблемах фігурнага катання ў Беларусі гэты вынік — сапраўдны поспех.

Трэнер нашай пары **Таццяна БЯЛЯЕВА** адзначыла: *«Мы задаволены ўсімі трыма парамі, якія тут выступалі. Гэта ўсё ж малады склад. Наша старэйшая пара Валадзенкава/Вакунаў рыхтуецца да этапа Гран-пры ў Заграбе. Фігурнае катанне — суб'ектыўны від спорту, і мы доўга спрабавалі «прасекчы акно ў Еўропу». І вось у Польшчы наша старэйшая пара заняла 11-е месца. А зараз у родным горадзе нават сцены дапамагалі, шмат заўзятараў, якія падтрымлівалі, — і пара Кавалёва/Бяляеў змаглі таксама заняць высокае 11-е месца. У маладых спартсменаў мала магчымасцяў выступаць на спаборніцтвах такога ўзроўню, але вось тут атрымалася — і Віка з Юрам зрабілі нам такі падарунак. Яны толькі другі год выступаюць сярод юніёраў, і максімальная задача на сёння — гэта 10—11-е месца. І гэта ўжо нарматыў майстра спорту. Хочацца сказаць вялікі дзякуй Цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы», бо толькі там дзеці змаглі атрымаць неабходную колькасць лёду. Прыходзілася сваім ходам ездзіць туды на каток, але хоць так, бо больш лёду нідзе не даб'ешся. Каткоў шмат, але ўсе яны «забітыя» хакеістамі ды аматарамі. У Раўбічах сталі праводзіцца зборы, летам пры добрых умовах маглі рыхтавацца, з нармальным харчаваннем. З такой увагай і разуменнем больш, напэўна, ніхто не ставіцца да сваіх спартсменаў, як Цэнтр. На жаль, цяпер гэта адзінае плячо падтрымкі ў краіне. Пра федэрацыю нават не хочацца ўзгадваць. Ніякай дапамогі з іх боку няма. Яны самі па сабе, мы самі па сабе. Цяпер вельмі чакаем адкрыцця «Мінск-Арэны», кажуць, яна ў большасці будзе аддадзена фігурыстам. Хоць пра Лядовы палац на Прытыцкага таксама такое казалі, але атрымалася зусім па-іншаму. Цяпер таксама ідзе размова пра закрыццё танцавальнай групы трэнера Сяргея Рамановіча ў Брэсце. Там перспектыўныя дзеці, але іх проста выстаўляюць на вуліцу. Мы б маглі ўзяць іх да сябе, але ж гэта дзеці. Паўстае праблема пераезду, пражывання тут, у Мінску, а інтэрната нам ніхто не дасць...»*.

Дамінанта турніру

Тры з чатырох відаў праграмы засталіся за фігурыстамі з Расіі. Паліна Шэлепень, Артур Гачынскі, Ксенія Манько і Кірыл Халявін не пакінулі шанцаў супернікам і працягваюць традыцыі Радніной, Слуцкай і Плюшчанкі. Як сказаў адзін з трэнераў нашай усходняй суседкі, у апошні час дзіцячыя школы ў іх перапоўненыя. Маленькія хлопчыкі і дзяўчаткі прыходзяць туды пад уплывам розных праектаў на тэлебачанні накшталт «Ледніковага перыяду».

НЕкрытыка турніру

Тут пра сумнае. Дакладней, пра вынікі беларускіх спартсменаў. Ведаеце, калі звяртацца толькі да тых самых сухіх лічбаў, то ўсё выглядае несуцяшальна. Але калі сваімі вачыма бачыць гэтых юнакоў і дзяўчат, ды што там, гэтых хлопчыкаў і дзяўчатак, хочацца дараваць ім усе дрэнныя вынікі. Проста ўзгадаем іх на гэтай старонцы: Ксенія Бакушава, Кацярына Пагарцава, Настасся Грыбко, Аляксей Мялёхін, Дзмітрый Кагіраў, Павел Ігнаценка, Вераніка Шынкевіч і Уладзіслаў Абрамаў, Карына Лашук і Уладзімір Кіслякоў. Не іх віна, што цяпер усё ёсць так, як яно ёсць. Дрэнныя ўмовы для трэніровак, катастрафічная адсутнасць лёду, абыякавасць з боку федэрацыі — толькі частка з усіх праблем. Але гэта ўжо тэма для асобнай размовы. Не тут і не цяпер.

Фота БЕЛТА.

Замест кропкі

Кропку і праўда рана ставіць. Спаборніцтвы юніёрскія — і ў гэтых спартсменаў усё толькі пачынаецца. А вось пра арганізацыю трэба сказаць некалькі слоў. Нягледзячы на тое, што турнір быў дэбютным для беларускай сталіцы, усё прайшло на даволі высокім узроўні. Гэта адзначалі ўсе госці. І гэта не можа не радаваць. Па чутках, менавіта добрая арганізацыя этапа Гран-пры павінна паспрыяць таму, што Мінску будзе даверана ў найбліжэйшы час правядзенне юніёрскага чэмпіянату свету па фігурным катанні. Будзем чакаць.

Яўген ВАРАКСА.

Вока-на-вока з дэпутатам

ДЗЯЎЧАТЫ Ў ПАЛІТЫЦЫ

Самая маладая дэпутат Інэса КЛЯШЧУК аддае перавагу беларускай літаратуры і марыць пра вялікую сям'ю

Любімая кінастужка народнай абранніцы — «Дзяўчаты», і мне яна падалася ў многім падобнай да Тосі. Гэткай жа адкрытай, прастадушнай, шчырай і жыццярадаснай. Тыпаж нехарактэрны для палітыка, пагадзіцеся. Ох, і дастаецца ж ёй, відаць, ад працоўнага атачэння. Самой нярэдка даводзіцца чуць «паслухай, дзяўчынка»... Чамусьці гэтак жа часта, як чалавека бяруцца ацэньваць па знешнасці і сацыяльным статусе, на ўзбраенне бярэцца і яго ўзрост. А «сталы чалавек», прашу заўважыць, — гэта не заўсёды раўназначна паняццю «бездакорны прафесіянал», таксама як і «малады спецыяліст» — не заўжды «няўмека»... Аднак паводле слоў Інэсы Кляшчук, яна асаблівага скепсісу ў свой адрас не адчувае:

— У парламенце вельмі добразычлівая атмасфера, мае старэйшыя калегі дапамагаюць мне і падтрымліваюць. Калі ў мяне была перадвыбарная агітацыя, у насельніцтва сапраўды было дваякае меркаванне. Некаторыя казалі: «Во, яшчэ маладая, куды ёй!» А іншыя, наадварот, ухвалялі: «Маладая, перспектыўная, далёка пойдзе». Я старалася пераканаць іх, што на мяне можна спадзявацца, я адчуваю адказнасць. Мяркую, што сваёй работай змагу ўпэўніць людзей у тым, што маладосць не недахоп, а ў нечым, наадварот, перавага. У цяперашняй моладзі (дарэчы, паводле беларускага заканадаўства, 31-гадовая дэпутат роўненька падпадае пад катэгорыю моладзі — гэта верхняя ўзроставая мяжа. — **Аўт.**) вельмі шмат ідэй, іншае мысленне, яна ўмее лавіраваць у сітуацыях, адыходзіць ад стэрэатыпаў і звычных схем. Гэта вялікі плюс. А калі пры гэтым улічваць досвед папярэдніх пакаленняў і абапірацца на сваё новае мысленне, скарыстоўваць новыя падыходы, метады — то і зусім цудоўна. Чаму б такім, як кажуць у народзе, хваткім людзям і не займаць адказныя пасады?

Дзеля гармоніі вопыту і наватарства Інэса абрала сабе ў памочніцы сталага чалавека.

— Мая памочніца доўгі час працавала старшынёй раённага Савета дэпутатаў. З усімі мясцовымі праблемамі добра знаёмая. Так у нас і атрымліваецца залатая сярэдзіна, — кажа дэпутат.

Саму Інэсу на малой радзіме, Случчыне, добра ведаюць як настаўніцу і актывістку БРСМ. Яна выкладала ў сельскай школе матэматыку і інфарматыку, была першым сакратаром спачатку райкама, а пазней, пасля аб'яднання горада і раёна, і гаркама рэспубліканскага саюза моладзі. Цяпер жа да яе са сваімі праблемамі ідзе і стары, і малы.

— Вядома ж, у раёне ёсць праблемы. Вельмі шмат звяртаюцца наконт добраўпарадкавання вуліц, устаноўкі «ляжачых паліцэйскіх». Апошнім часам пешаходы ўсё часцей скардзяцца на тое, што ўціскаюць іх кіроўцы. Цеплавы рэжым у дамах не задавальняе некаторых выбаршчыкаў. Як дэпутат я звяртаюся ў адпаведныя службы і дапамагаю вырашыць праблему, дапамагаю жыхарам быць пачутымі. «Гарачы» сезон выдаўся летам — вой, які тады быў ажыятаж са скаргамі — у горадзе гарачую ваду падавалі абмежавана. Але потым, нягледзячы на крызіс і недахоп бюджэтных сродкаў, мясцовыя ўлады знайшлі магчымасць вырашыць сітуацыю.

Большасць зваротаў грамадзян менавіта па жыллёва-камунальнай гаспадарцы, — адзначае Інэса Кляшчук. Ну, гэта і не слуцкае ноу-хау, так па ўсёй краіне.

Глабальная праблема Слуцка, як расказала нам дэпутат, — каналізацыйная сістэма.

— Будавалася ўсё даўно, на многае тады не разлічвалі. Да таго ж, такая адметнасць ёсць у Слуцка — горад стаіць у нізіне. І сёлета, калі ішлі дажджы, больш за ўсё пацярпеў Слуцк. Вельмі шмат было зваротаў ад тых, у каго затапіла прысядзібныя ўчасткі. Калі б пераабсталяваць усю гэту сістэму, то, зразумела, гэта была б вельмі вялікая палёгка для нашага горада, — кажа Інэса Кляшчук.

— Ёсць звароты па ахове здароўя, былі кансультацыйныя звароты па паляпшэнні жыллёвых умоў, — працягвае аповед дэпутат, — каму правесці водаправод трэба, каму — дапамагчы ў працаўладкаванні. Вось нядаўна дапаможам мясцовай улады месца працы ў Слуцку, аформілі перараэмеркаванне. Увогуле з працаўладкаваннем на Случчыне сёння ёсць некаторыя праблемы, мала хто хоча працаваць у сельскай мясцовасці, не ва ўсіх хапае адукацыі для таго, каб працаваць на жаданых пасадах. Сёння недахоп слесараў, электрыкаў, прадаўцоў...

Аднак больш за ўсё раёну не хапае грошай, — мяркуе народная абранніца, — каб адбудаваць усё тое, аб чым мараць мясцовыя жыхары.

— Падлеткі хочуць пляцоўку для катання на скейт-бордах, БРСМ абяцаў дапамагчы з гэтым. Маладыя людзі просяць, каб быў прыгожы Палац шлюбу, бо ў нас распісваюць у Доме культуры, а ўсім хацелася б урачыстай цырымоніі ў адмысловай зале...

Сям'я для Інэсы Кляшчук — святое, яна выраслa ў каханні і клопаце. Бацькі ганарацца Інай, але ж не прапускаюць магчымасці і «падкалоць» па-добраму, маўляў, «час абедаць, дэпутат». Маладзейшы на пяць гадоў брат Сяргей — найлепшы сябар.

— Мяне заўжды шакіруе, калі звярталіся сваякі, якія не могуць падзяліць між сабой плот, ледзь не нейкую канаву. Думаеш, ну як жа так — родныя людзі не могуць памірыцца, — бядуе Інэса. — Сям'ю трэба цаніць.

У парламенце Інэса Кляшчук занятая ў рабоце пастаяннай камісіі па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях. І хоць матэматычны склад розуму шмат у чым дапамагае ў заканадаўчай працы, аднак маладая дэпутат задумваецца пра атрыманне юрыдычнай адукацыі. Баявое хрышчэнне прайшла яшчэ на мінулай сесіі — законапраектам, за які была адказная і рыхтавала да разгляду калегамі. Ён уносіў папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях дакументавання насельніцтва Беларусі.

— Рыхтаваць законапраект, нават прэзентаваць яго ў Авальнай зале — гэта вялікае хваляванне, вялікая адказнасць. І калі праз гэта пройдзеш, больш упэўнена ўжо сябе адчуваеш. Калі працуеш над праектам закона, унікаеш ва ўсю гэту «кухню», прапускаеш кожнае слова праз сябе.

А ў цэлым сваю місію дэпутат бачыць так:

— Як у народзе кажуць, «пішыце такія законы, каб нам было добра». Што ж, будзем старацца. Вельмі важны кірунак — работа з выбаршчыкамі, як інакш даведацца пра эфект ад законаў?

Ці не самы лепшы адпачынак для Інэсы Кляшчук — той, што праведзены на выставах, у тэатрах, музеях. Нават запытаўшыся ў яе пра мясціны, у якіх яна марыць пабываць, вы не пачуеце геаграфічных назваў:

— Я вельмі хачу пабываць у Эрмітажы, Луўры, пабачыць знакамітую Сіксцінскую мадонну ў Дрэздэнскай карціннай галерэі...

Яна аддае перавагу ціхаму, спакойнаму адпачынку ў коле сяброў:

— У мяне шмат сяброў — і на Случчыне, і тут, у Мінску, — яшчэ з тых часоў, як вучылася ў педагагічным універсітэце. Яны вельмі рады за мяне.

А тэатральныя пастаноўкі часам глядзіць разам з выбаршчыкамі:

— Неяк захацелася мне пасля працы схадзіць у тэатр, абрала прэм'еру — камедыю «Праўда — добра, а шчасце лепш» у тэатры Горкага. У касе білетаў не было, думаю, паспытаю шчасця, можа, хто будзе з рук прадаваць перад самым спектаклем. Мне пашанцавала. І раптам у тэатры сустракаю жыхароў сваёй акругі — спецыяльна на спектакль у Мінск прыехалі. Такая вось спантанная выязная прыёмная атрымалася! *(Смяецца)*.

Па звычцы асабліва трывалыя сувязі падтрымлівае дэпутат з сакратарамі першасных арганізацый БРСМ, моладзь са Случчыны возьме на сталічныя тэатральныя пастаноўкі, выставы, у музеі. Абмяркоўвала Інэса Кляшчук з юнымі случчанамі і праект закона «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі».

— У іх было вельмі шмат прапаноў, я іх афарміла, падала ў профільную камісію (па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі). І ведаеце, гляджу, многія прапановы ўвайшлі ў праект. Ну, напрыклад, тое, што рэгіянальныя праграмы ў сферы дзяржаўнай моладзевай палітыкі павінны прымацца і на раённым узроўні (у прапанаванym праекце закона размова ішла толькі аб рэспубліканскім і абласным узроўнях). Многае з прапанаванага нельга ўключыць у законапраект, бо там закладваюцца толькі асновы дзяржаўнай палітыкі ў гэтай сферы, аднак ідэі будуць карысныя ў працы над іншымі законапраектамі. Напрыклад, нашы актывісты лічаць, што трэба забараніць продаж алкагольных напояў маладым людзям да 21 года. І я цалкам з гэтым згодная — большасць падлеткаў, якімі займаюцца камісіі па справах непаўналетніх, былі злоўленыя менавіта на ўжыванні спіртных напояў. У дачыненні да гэтага законапраекта наша моладзь нагадала пра адзін з такіх кірункаў грамадска-патрыятычнага выхавання, як работа з ветэранамі. Прапанавалі прадугледзець у законапраекце, каб спецыялісты па рабоце з моладдзю былі заахвочаныя матэрыяльна, заканадаўча замацаваць іх статус. Прапануюць актывізаваць практыку льготнага крэдытавання маладых сем'яў, запусціць сацыяльную рэкламу паспяховых маладых сем'яў, актыўна піярыць іх у СМІ.

БЛІЦ ПЕРАВАГ ІНЭСЫ КЛЯШЧУК:

Кіно: Самы любімы фільм — «Дзяўчаты»: сто разоў глядзела і сто першы пагляджу з задавальненнем.

Літаратура: больш за ўсё люблю кранальныя рамантычныя гісторыі, кнігі пра каханне. Мне заўжды больш падабалася беларуская літаратура, зачытвалася творамі Мележа і Шамякіна.

Спорт: плаванне.

Захапленне: збіраць ягады ды грыбы.

Падарожжы: Беларусь з'ездзіла ўздоўж і ўпоперак, цяпер мару пра далёкае замежжа. Аднак куды б ні паехала, самае вялікае праз два тыдні пачынаю моцна сумаваць па Радзіме, бо ўсё адно лепшай краіны, чым наша Беларусь, я не ведаю.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Занатоўкі мастака

ЗМЕНЫ

Чалавек памяняў багоў на Бога, а Бога — на прыроду. Чалавек жахнуўся ад яе бязлітаснасці. Чалавек паспрабаваў быў вярнуць Бога на месца прыроды, але яна не дазваляе зрабіць такую рэстаўрацыйную змену...

ВЫХАВАНАСЦЬ

Ёсць тры ступені выхаванасці. Першая, калі ты ведаеш, што за сабою трэба зачыняць дзверы. Другая, калі здагадаешся зачыняць іх акуратна. Трэцяя, калі навучышся зачыняць бязгучна...

«ТАЕМНАЯ ВЯЧЭРА» І АЛЕГ

Забраў з майстэрні рамы, паўстаўляў у іх фрагменты свайго нацюрморта «Таемная вячэра», саставіў з фрагментаў агульную кампазіцыю і задумаўся... Ці скончыў я працу? Ці трэба працягваць? Дзе і як «Таемную вячэру» выстаўляць? Столькі пытанняў! Мусібыць знак! Ён не прымусіў сябе чакаць. Званок! «Што парабляеш, брат?» — «Раблю карціну «Таемная вячэра»!» — «Значыць, не дарэмна я табе тэлефаную са святой жыровіцкай зямлі! Калі ты прыедзеш да нас, у манастыр?» — «Адклаў я гэтае падарожжа! Адклаў...» — «Час ёсць! Ты малады! Але ўсё ж прыязджай да нас, намалюеш манастыр і сабор! У нас цудоўныя мясціны, яны будуць цябе натхняць на жывапіс!» — «Прыеду, Алег! Абавязкова! Мне трэба з табою пра апосталаў пагаварыць! Ты ў гэтым абазнаны лепей за мяне!» — «Буду чакаць! Хай табе дапамагае твой анёл-ахоўнік...» Такі знак. Праца скончана. Крыху нечакана для мяне. Але званок паэта Зніча яшчэ большая нечаканасць. Апошні раз я размаўляў з ім па тэлефоне ў 1979 годзе. Трыццаць гадоў прамінула, а нашыя адносіны не змяніліся, зусім не змяніліся. Дзіва.

РЫВЕРА І ХАМЯЧЫХА

Пясняр мексіканскай рэвалюцыі Дыега Рывера спарадзіў плойму эпігонаў з эпігоншамі. Ягоныя манументальныя сценапісныя вобразы перамалёўваліся і зараз яшчэ тыражуюцца рознымі мастачкамі і мастачкамі. Рывера вельмі выразна маляваў чарапы, індзейцаў, самбрэра, коней і вінтоўкі. Наколькі выдатна ён маляваў рэвалюцыянераў, настолькі ж гадка ён вымалёўваў рэвалюцыянерак. І на сонцы ёсць плямы. Таму мяне зусім не дзівіць той факт, які падаецца ў кнізе пра Рыверу з расійскай серыі «Жыццё надзвычайных людзей»... У дзяцінстве Дыега трымаў хамячкоў, калі адна хамячыха зрабілася тоўстай ад цяжарнасці, ён узяў скальпель, разрэзаў хамячыху і змясціва яе жывата спусціў ва ўніташ. Дзеянні будучага генія мексіканскай рэвалюцыі аўтар кнігі патлумачыў звышцікаўнасцю хлопчыка ды ягонай прагаю спазнаць найгалоўнейшую таямніцу быцця. Мяне гэты факт падштурхнуў да іншай думкі... У Рыверы была прыродная схільнасць да палавой паталогіі, таму можна паверыць і ў тое, што ён сапраўды моцна любіў апантаную вар'ятку са скалечаным у дарожнай аварыі целам — Фрыду.

ЭНГЕЛЬС, ЖОНКА І КАХАНКА

Кінуць жонку цяжка. Як падумаеш пра посуд, які давядзецца зноў наноў купляць, так жаданне кідаць робіцца меншае. Можна яшчэ падумаць пра мэблю, бялізну, кватэру, дом за гарадам. Меў рацыю Энгельс, калі знітоўваў паходжанне сям'і з прыватнай уласнасцю і капіталам. Але жонку можна кінуць гэтак жа, як можна кінуць піць. Будзе цяжка, пакутна, балюча, але праблема вырашальная. Зазвычай, кіданне піць і заканчваецца кіданнем жонкі. Ты цвераземееш і з дзівам глядзіш на праяснены, яскравы і жорсткі свет. Як я мог жыць у алкагольнай каламутнасці? Як я мог столькі гадоў праспаць з гэтай трыклятай сучкай? Жонка кідаецца так, як кідаецца запойнае піццё гарэлкі. Каханка кідаецца зусім інакш. Каханка кідаецца так, як кідаецца паленне цыгарэт мяняецца на паленне цыгары ці люлькі. Ты адкладаеш і адкладаеш кіданне каханак, а потым усё адно кідаеш. Кінуць можна ўсё і ўсіх. Было б рашэнне...

БУКОЎСКІ І ШЫНЭЛЬ

Амерыканскі пантовы апавядальнік Чарльз Букоўскі заўважыў, што «Вайна і мір» Льва Талстога — другая пасля гогалеўскага «Шыняля» галоўная параза расійскай літаратуры. Такое стаўленне да Гогаля мяне спыніла. Чаму галоўная і асноўная параза расійскай літаратуры — аповесць «Шынэль», аповесць, з якой, па справядлівых словах Дастаеўскага, і выйшла ўся наступная расійская літаратура? Тыдзень я прахадзіў з пытаннем пра шынэль у галаве. Учора, у размове з Лёшам Андрэявым пачуў ад яго новы тэрмін «негалоўнае пакаленне», так у сучасным Кітаі называюць маладую генерацыю, што захваляла на шапагалізм. Калі асноўная падзея ў тваім жыцці — набыццё звычайных ботаў, а ты падаеш гэта, як прыдбанне чароўных ботаў-скараходаў, тваё існаванне нікчэмнае, і ты сапраўды належыш да прамежкавага малазначнага пакалення. Таму я пагаджаюся з галівудскім артыстам Букоўскі, які назваў геніяльны твор Мікалая Гогаля «Шынэль» галоўнай паразаю вялікай расійскай літаратуры.

МІЛІЦЫЯНЕРЫ І ГАРАЧЫНЯ

У бальнічным буфеце я замовіў сабе сасіску, запечаную ў цесце. Доктарка Вера паведаміла мне добрую навіну, а добрую навіну варта адзначаць. Доктарка сказала, што вока маё паправілася, і цяпер засталося плаўна вызваліцца ад кропель і мазяў. Яна пастукала кулаком пра драўляным стале, каб яе словы спраўдзіліся, а я вырашыў азначыць падзею паяданнем гарачай сасіскі. Я еў сасіску з горкай чорнай кавай і быў амаль шчаслівы. Цяпер я магу нават сказаць, што я быў цалкам шчаслівы. У мой ясны і шчаслівы свет зайшоў міліцыянер з аўтаматам. Ён агледзеў бальнічны буфет і накіраваўся да лядоўні з напоямі. Міліцыянер узяў з лядоўні двухлітровую бутэльку вады і стаў у чаргу. Чалавек з аўтаматам на плячы стаў у чаргу цывільных людзей. Я быў упэўнены, што ён не будзе стаяць у чарзе. Ёсць пэўны дыскамфорт, калі ўзброены чалавек стаіць у чарзе. Ці, можа, я яшчэ не прызвычаіўся да таго, што ўзброеныя людзі стаяць у чарзе? Напэўна, не прывык я да такога. Таму ўзяў я свой пластыкавы кубак з кавай і выйшаў на ганак. Там стаяў бандыт, якога ахоўваў другі міліцыянер з аўтаматам. Пакуль я даліваў сваю горкую каву, у бальнічны двор заехаў сіні мікрааўтобус, з якога выйшлі яшчэ два міліцыянеры. Тут я і пачуў расповед пра бандыта, які выцягнуў з кішэні ў паўсляпога мужчыны сотавы тэлефон. Мужчына затрымаў рабаўніка, але той паспеў перадаць скрадзены тэлефон свайму памагатаму, які ўцёк. Міліцыянеры запакавалі бандыта ў мікрааўтобус і з'ехалі. Я падумаў, што гэтым разам міліцыянеры знойдуць скрадзены тэлефон. У іх жа ёсць два літры халоднай вады, а ў спёку, за глыток вады любы бандыт раскажа ўсё, што ты толькі пажадаеш.

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

На кніжным кірмашы сівагаловы яўрэй спытаў у мяне: «Вам нешта паказаць ці падказаць?» — «З вашага дазволу, я проста пагляджу на кнігі, можа якая светлая думка прыйдзе ў галаву...» — «Харошы адказ, нават безадносна кніжак...» На выставе самадзейных мастакоў даўгавусы беларус спытаў: «Вам дапамагчы?» — «Дзякуй, у мяне і так усё добра!» — «Выдатны адказ, даўно такога не чуў...» У майстэрню патэлефанаваў сябра Сцяпан: «Што робіш?» — «Нічога не раблю, усё зрабіў!» — «Выдатна...» Бываюць такія нядзелі, калі ў мяне атрымліваецца адказваць на пытанні.

ЛЯДАШТАСЦЬ

У суботу пад маім віленскім акном праплываюць чорныя шыракаполыя капелюшы. Барадатыя вернікі накіроўваюцца ў сінагогу. Шэсце людзей у чорным выглядае ўрачыстым. Аднойчы, спакусіўся я ды й наведаўся ў сабор. Уразіла лядаштасць. А скарыла мяне карункавая старызна ўсіх тамтэйшых рэчаў. Здалося: паспрабуеш дакрануцца — і ўсё тут рассыплецца, развеецца, знікне і прападзе ў незваротнасці. Інтэр'ер сінагогі нібыта асвятляўся слабым святлом ветаха. І ў ясны сонечны дзень там панавала месячнае святло. Дзівосная была старызна, пракаветнасць і запаветнасць. Пасля наведвання сінагогі добра перачытвалася кніга «Лікі» са «Старога запавету».

Адам ГЛОБУС.

«Айчынныя і замежныя вытворцы павінны працаваць у роўных канкурэнтных умовах»

На прылаўках беларускіх крамаў выяўлены імпартныя харчовыя тавары, якія не адпавядаюць патрабаванням беларускага заканадаўства па маркіроўцы, камплектнасці і ўпакоўцы. Па выніках праверак Камітэта дзяржаўнага кантролю — (далей — КДК), толькі ў верасні іх рознічны продаж забаронены на суму 102 млн рублёў.

З-за мяжы на наш унутраны рынак паступае нямала тавараў, аналагі якіх у дастатковым аб'ёме выпускаюцца беларускімі вытворцамі. Толькі за 7 месяцаў гэтага года ў краіну завезена піва на 43,7 млн долараў, мучных кандытарскіх вырабаў на 30,2 млн долараў, безалкагольных напіткаў на 24,4 млн долараў, сокаў на 20,5 млн долараў і інш.

— КДК не выступае супраць імпарту, — падкрэсліў **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг Камітэта дзяржаўнага кантролю Уладзімір КАЛЕНІК**. — Проста мы не можам дапусціць, каб у Беларусь увозіліся тавары, якія не адпавядаюць беларускаму заканадаўству, каб беларускі спажывец атрымліваў няпоўную і недакладную інфармацыю аб тавары. Падчас праверак мы выявілі шмат парушэнняў. У прыватнасці, шырока распаўсюджаныя выпадкі, калі інфармацыя аб якасцях імпартнага тавару падаецца недапушчальна дробным шрыфтам, а ў асобных выпадках наогул яе можна разглядзець толькі пад лупай.

У гандлёвай зале філіяла аднаго са сталічных супермаркетаў рэалізоўваўся нектар персікавы з мякаццю. На ўпакоўцы вытворцам пазначана, што мінімальная масавая доля фруктовага пюрэ складае 45 % і даецца інфармацыя аб харчовай каштоўнасці прадукту, якая супярэчыць беларускаму стандарту. Пры дадатковым стыкаванні на нектар нанеслі іншую, але ўжо «ўдакладненую» інфармацыю: масавая доля фруктовай часткі — 50 % (як патрабуе нацыянальнае заканадаўства) з пазначэннем дадатковых інгрэдыентаў, якія быццам бы ўтрымліваюцца ў прадукцыі. Спажывец, які прачытае абедзве маркіроўкі, зразумела, не будзе ведаць, якой жа інфармацыі давяраць.

Больш за тое, у краіну пастаўляюцца нектары для дзіцячага харчавання ва ўпакоўцы ёмістасцю 1-2 літры, хоць па нашым заканадаўстве для дзіцячага харчавання могуць вырабляцца толькі сокі і пюрэ, якія павінны рэалізоўвацца ў спажывецкай упакоўцы ёмістасцю, не большай за 350 мл.

Сустракаюцца выпадкі, калі на ўпакоўку наносіцца інфармацыя аб нейкіх звышнатуральных лекавых якасцях прадукту без узгаднення гэтай рэкламнай інфармацыі з органамі Міністэрства аховы здароўя. З іншага боку — на піве адсутнічае інфармацыя аб забароне на спажыванне гэтага напою вызначанай катэгорыяй спажыўцоў. Акрамя таго, на ўпакоўках нектараў, дзе ўтрымліваецца фруктовая частка двух ці трох пладоў альбо ягад, змяшчаецца выява, як правіла, толькі аднаго з іх. Напрыклад, на пачку з яблычна-вінаградным нектарам мы бачым толькі вінаград, з персікава-яблычным — толькі персік.

З-за мяжы пастаўляецца і шэраг «фальшывай» прадукцыі, асабліва гэта датычыцца кандытарскіх вырабаў у пачках, спецый. Напрыклад, мы бачым вялікі, памерам з карціну, пачак цукерак. Апошніх там змяшчаецца толькі 200 грамаў, а каштуюць яны каля 20 тысяч рублёў. Што ж атрымліваецца, кілаграм цукерак каштуе каля 100 тысяч рублёў?.. Тое ж самае і з імпартнай лімоннай кіслатой, перцам, тмінам. Іх упакоўкі не заўсёды адпавядаюць патрабаванням нацыянальнага заканадаўства. Пры норме запаўняльнасці ўпакоўкі не менш за 70 %, абследаваныя наборы цукерак былі запоўненыя не больш чым на 44 %, пакеты з імпартнымі харчовымі прыправамі — на 58 %.

Паводле слоў **старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Зянона ЛОМАЦЯ**, вінаватыя ў тым, што імпартная прадукцыя, якая не адпавядае беларускаму стандарту, трапіла на прылаўкі, у першую чаргу службовыя асобы. Службовыя асобы Міністэрства аховы здароўя, акрэдытаваныя Дзяржстандартам арганізацыі не павінны былі выдаваць сертыфікаты адпаведнасці, тым самым даючы дабро на рэалізацыю гэтай прадукцыі. З іншага боку, работнікі гандлю таксама павінны былі забяспечыць належны кантроль пры прыёмцы такіх тавараў да продажу. На працягу месяца разам з іншымі дзяржжаўнымі службамі КДК навядзе парадак у гэтай справе.

Надзея ДРЫЛА.

ПА «ВОСІ» БОСКАГА І ЧАЛАВЕЧАГА

На публікацыю пра перанос помніка рэдактару падпольнай «Звязды» Уладзіміру Амельянюку ў сувязі з рэканструкцыяй плошчы ля Чырвонага касцёла ў Мінску адгукнулася шмат нашых чытачоў — тэлефанавалі, дасылалі лісты, дзе выказвалі сваё неразуменне: няўжо немагчыма абысціся без кардынальных рашэнняў? Сёння мы змяшчаем некаторыя «думкі ўголас» наконт гэтай сітуацыі, якія прагучалі ў тым ліку і на месцы колішніх падзей вайны.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

...Быў цёплы вераснёўскі дзень. Па плошчы Незалежнасці ішлі людзі, спыняліся на імгненне, уладкоўваліся на лаўцы, каб злавіць апошнія промні амаль летняга сонца. На адной з лавак прыселі мы з Барысам Хасанавічам Александровічам, які памятае тыя гады, калі яго бацька пасля смерці першага рэдактара падпольнай газеты з рызыкай для сябе і сваёй вялікай сям'і выдаваў падпольную «Звязду». Навіна пра будучы перанос помніка Герою Савецкага Саюза ўзрушыла Барыса Хасанавіча, які і сам абраў друкарства справай жыцця, — і мы спаткаліся менавіта ля нашага памятнага каменя, каб паглядзець, куды насамрэч яго збіраюцца перанесці.

— Глядзіце, калі меркаваць па азначанай схеме, то помнік усё-такі пойдзе ўгльіб, — разважае Барыс Хасанавіч. — Зараз ён стаіць так, што людзі, якія праходзяць міма, звяртаюць на яго ўвагу. А вось ці будзе так потым — я не ўпэўнены. Мне здаецца, верагодная небяспека таго, што ён захаваецца чыста намінальна, на ўскрайку касцёльнай тэрыторыі, але хутчэй будзе схаваны ад людзей.

Сапраўды, адзін з аўтараў праекта па пераўтварэнні плошчы ля касцёла Святых Сымона і Алены архітэктар Леанід Левін быў не зусім шчыры, калі казаў у інтэрв'ю нашай газеце, што помнік Амельянюку не страціць сваёй значнасці на новым месцы. Абяцанні, што ён будзе перанесены «па восі», можна разглядаць з розных пунктаў. Калі глядзець так, як гэтая «вось» пазначана на плане рэканструкцыі прыкасцёльнай тэрыторыі, то нібыта ўсё сыходзіцца. Але ў такім выпадку помнік ўсё-такі будзе стаяць далей ад самой плошчы і, натуральна, згубіцца за дамінантнымі манументамі — за тым жа касцёлам. Зараз у помніка беларускім друкарам месца такое, што ён усё-такі існуе асобна ад касцёла — ён стаіць унізе, ля плошчы, ад якой аддзелены пешаходнай дарогай. І каб жа «вось» пралягала па гэтай дарозе...

Раптам групка людзей, ужо не маладых, спыняецца ля помніка. Жанчына-кіраўніца распавядае гісторыю мінскага падполля, узгадвае пра кнігу «Руіны страляюць...» І паводле яе пераказвае гісторыю смерці Уладзіміра Амельянюка. Людзі ўважліва слухаюць — ім цікава. Людзі немаладыя, напэўна, не тутэйшыя. Але нешта іх вымусіла прайсці па мінскіх месцах ваеннай памяці. Я нават не ведала, што сюды ходзяць групы экскурсантаў.

І, напэўна, сапраўды ёсць пэўная катэгорыя і беларусаў і гасцей нашага горада, якім важна пачуць менавіта пра тое, як Мінск перажыў вайну. Адчуць гэта не толькі праз агульныя вялікія манументы, але і праз вось такія невялікія помнікі, якія нагадваюць пра лёсы канкрэтных людзей. Гэта помнік гісторыі, такі ж як сам Чырвоны касцёл. Толькі маленькі... Але помнік вельмі трагічных для нашай краіны падзей.

— Я б помнікі Героям Савецкага Саюза, якія аддалі жыццё дзеля вызвалення, не краналі ніколі. Незалежна ад таго, дзе яны загінулі ці былі расстраляныя, — гаворыць Барыс Хасанавіч. — Не разумею, як гэта вырашылі пераносіць помнік сёлета, калі толькі адсвяткавалі 65-ю гадавіну Вызвалення Беларусі? Я дзіўлюся: няўжо так проста можна прыняць рашэнне аб пераносе?.. Гэтыя помнікі ўсталяваныя народам, дык чаму ж спачатку не параіцца з людзьмі наконт таго, ці трэба пераносіць помнік, які ўжо стаіць? Так не робіцца, бо гэта народная памяць, помнік пастаўлены на народныя грошы. Помнікі вайны людзі ведаюць, ходзяць да іх, укладаюць кветкі. Гэта ўзаконеная тэрыторыя, тым больш ён стаіць унізе ад тэрыторыі, якая знаходзіцца пры касцёле, каму і чым ён перашкаджае? І хіба памяць пра людзей, якія ахвяравалі жыццём дзеля іншых — не Боская справа? Амельянюк — гэта чалавек, які па сутнасці здзейсніў подзвіг. Сутнасць нават не ў тым, дзе канкрэтна і ў якім месцы яго напаткала смерць — за пяць крокаў перад ці за касцёлам... Справа ў тым, што ніхто не ведае, дзе ён быў пахаваны, і менавіта тут яго сімвалічная магіла, пра якую ведае не адно пакаленне не толькі мінчан, але жыхароў усёй Беларусі: «Звязда» не раз распавядала пра гэты помнік сваім чытачам. Колькі гадоў тут стаіць помнік Амельянюку?.. Гэта ўвогуле помнік усім, хто рабіў газету падчас вайны — я лічу, што і майму бацьку, які пасля смерці Амельянюка працягваў яго справу. Таму мяне асабіста гэта вельмі закранула. Можна лічыць, што гэта помнік усім удзельнікам Мінскага падполля — не адно імя значыцца на пліце. Калі гаворка ідзе пра тое, што трэба паставіць новы помнік, то няхай бы для яго выбралі новае месца, як яго можна ставіць фактычна на сімвалічную чужую магілу? Я за тое, каб у душах людзей жыла вера, няхай будзе павага да значных рэлігійных дзеянняў — яны таго вартыя. Але не за кошт памяці іншых — трэба паважаць беларусаў, тых людзей, якія жывуць тут і якія змагаліся за гэту Беларусь.

Ларыса ЦІМОШЫК.

«Я відавочца тых падзей...»

Пасля першага артыкула аб помніку У.С. Амельянюку, як і ў вас, у мяне таксама быў шок. Не трэба гэтаму выдатнаму помніку іншых шыкоўных месцаў! Ён павінен заставацца на месцы, хай сабе і ў зелені, таму што такім у той час было жыццё, праца, подзвіг маладзенькага, прыгожага і мужнага, да апошняга свайго кроку адданага радзіме чалавека. Нашай з вамі радзіме, у тым ліку і тых, хто злоснымі думкамі дакрануўся да святога. І апошні гэты свой крок ён зрабіў на тым месцы, дзе цяпер стаіць помнік.

Другі артыкул прымусіў неадкладна напісаць у рэдакцыю «Звязды», а можа, што і дапаможа. Усё, што апісвае Яўген Бараноўскі — праўда, я відавочца тых падзей. Не трэба чапаць помнік, гвалтаваць памяць!

«Ну, вот, мама, а ты говорила, что В.С. Омельянюк погиб на этом месте», — с недоверием скажут мне мои дети. «А может, и вообще ничего не было — ни подпольной газеты, ни замаха на Кубэ, ни срыва фашистских планов по заминированию Минска?» — так они подумают.

І што далей...

На адно толькі рэагавала іх сэрца — на той першы нумар друкаванай «Звязды» ў акупаваным фашыстамі Мінску. Таму пасля майго паведамлення аб пераносе помніка ў іх рускую мову заняло.

Маўчалі... Разам з імі моўчкі разважала і я.

Але ж цеплілася надзея на тое, што завадатары перабудовы вакол касцёла прыслухаюцца да людзей і адчэпяцца ад помніка У.С. Амельянюку! Як жа прыемна мне было сёлета ўбачыць на тэрыторыі Клумаўскай клінікі выратаваны супрацоўнікамі бальніцы ў час вайны помнік Леніну. А бацьку майму, якога я тады наведвала ў бальніцы, і таго прыемней... У час вайны помнік выратавалі і паставілі на тое ж самае месца. А сёння, мне здаецца, зрабіць гэта значна цяжэй... Я каталічка, часта наведваю Чырвоны касцёл. Выбрала гэты храм, таму што побач з ім знаходзіцца помнік падпольшчыку У.С. Амельянюку.

Алена ШУЦЬКО, *Мінск.*

Што, і ў Мінску Талін?

У газеце «Звязда» № 139 ад 29 ліпеня 2009 г. было надрукавана інтэрв'ю з Леанідам Левіным, якое сведчыць аб тым, што пры пераўтварэнні плошчы каля Чырвонага касцёла ў цэнтры Мінска будзе парушаны помнік падзей 1942 года, помнік Герою Савецкага Саюза Уладзіміру Амельянюку. У мяне, звычайнага мінчаніна, адразу ж узнікае мноства пытанняў.

На падставе якіх рашэнняў уладаў Беларусі ці Мінгарвыканкама распрацоўвалі праект пераўтварэння плошчы архітэктар Леанід Левін і скульптар Іван Міська?

Хто дазволіў перанесці помнік Уладзіміру Амельянюку?

Перанос помніка Герою Савецкага Саюза Уладзіміру Амельянюку і ўсталяванне на яго месцы помніка Яну Паўлу II — вельмі важная нацыянальная справа. Чаму ж аб гэтым не спыталі мінчан, ды і не толькі мінчан, а і ўсіх грамадзян Беларусі? Няхай бы яны выказалі сваё меркаванне па гэтай справе. Ці гэта ўжо стала залішнім?

Леанід Левін у сваім інтэрв'ю адзначыў, што помнік Уладзіміру Амельянюку будзе перанесены бліжэй да Дома Урада. Я хацеў бы наконт гэтага сказаць, што Уладзімір Амельянюк — антыфашыст і падпольшчык, сапраўды быў падчас вайны блізка каля сэрца краіны, бліжэй няма куды. Ён яго абараняў, як і ўсю Беларусь, і там загінуў. Не кранайце ні помніка, ні памяці аб Уладзіміры Амельянюку!

Думаю, што пытанне аб пераносе помніка Уладзіміру Амельянюку закранула пачуцці грамадзян Беларусі.

Уладзімір ПІШЧУЛІН, *Мінск.*

Асобным мінчанам — даплата «на бульбу»

Некаторыя катэгорыі жыхароў сталіцы атрымаюць матэрыяльную дапамогу на нарыхтоўку сельгаспрадукцыі да зімы. Пра гэта паведаміла намеснік начальніка аддзела арганізацыйна-кадравай работы Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Іна Сямёнава.

У прыватнасці, дапамога ў памеры 105 тыс. рублёў за кошт гарадскога бюджэту прадугледжваецца для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны; інвалідаў I-II груп і атрымальнікаў пенсій па ўзросце, якія не працуюць, не зарэгістраваныя ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў і маюць пенсіі ніжэй за бюджэт пражыткавага мінімуму (243,7 тыс. рублёў), а таксама для мінчан, якія даглядаюць інвалідаў I групы ці пажылых людзей ва ўзросце больш за 80 гадоў. Чакаецца, што ўсяго такія выплаты будуць зробленыя 22 тысячам жыхароў сталіцы. Таксама з гарадскога бюджэту плануецца прафінансаваць рамонты кватэр і дамоў 451 адзінокаму ветэрану Вялікай Айчыннай, 1418 адзінокім пенсіянерам аплацяць установку прыбораў уліку вады, а 1554 адзінокім пенсіянерам — установку аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў.

Пры гэтым, нагадала Іна Сямёнава, у сталіцы працягвае дзейнічаць гарадская праграма дадатковай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян. Напрыклад, інвалідам і ўдзельнікам вайны, доўгажыхарам ва ўзросце больш за 95 гадоў, мінчанам, якія афіцыйна даглядаюць інвалідаў I групы ці пажылых людзей ва ўзросце больш за 80 гадоў, налічваецца штомесячная даплата ў памеры 1 мінімальнай пенсіі па ўзросце (62,3 тыс. рублёў). Адначасова вызначана, што жыхары сталіцы, якія цалкам страцілі магчымасць рухацца і знаходзяцца на надомным абслугоўванні, могуць аднойчы ў месяц бясплатна скарыстацца паслугамі цырульніка і бясплатна памыць да 10 кілаграмаў бялізны, а мінскім Героям Беларусі ці Савецкага Саюза, Героям Сацыялістычнай Працы, поўным кавалерам ордэнаў Айчыны, Славы і Працоўнай Славы, інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам з дзяцінства ў сувязі з баявымі дзеяннямі падчас Вялікай Айчыннай, членам сем'яў загінулых вайскоўцаў, партызанаў і падпольшчыкаў аплачваецца курс рэабілітацыі па праграме дабрачыннага фонду «Эліяс» рэлігійнай абшчыны «Прыход у гонар Усіх Святых Мінскай епархіі праваслаўнай царквы».

Дарэчы, заўважыла Іна Сямёнава, усяго пенсіянерамі з'яўляюцца каля 400 тысяч жыхароў сталіцы. Прычым узросту больш за 90 гадоў дасягнулі 2,3 тысячы, а ўзросту больш за 100 гадоў — 58 мінчан.

Сяргей ГРЫБ.

Крымінал

«ДАЧНІКІ» ЗА ПРАЦАЙ

З дачнага дамка каля в. Забалоцце Брэсцкага раёна нехта праз акно выкраў прадукты і адзенне. Але зладзеі на гэтым не спыніліся і залезлі такім жа чынам яшчэ на адну дачу і там прыхапілі тэлевізар «Філіпс», электрачайнік, свяцільнік... Рабавалі два мясцовыя жыхары і госць з Брэста.

ЗАЛЕЗЛА Ў КІШЭНЮ...

Пенсіянер з г. Івацэвічы паскардзіўся ў міліцыю на беспрацоўную, якая выкрала ў яго грошы. Высветлілася, што напачатку яны выпівалі, а затым жанчына залезла да пенсіянера ў кішэню штаноў і скрала кашалёк.

АБАКРАЎ БАЦЬКУ

У пенсіянера, які пражывае ў Пінску па вул. Кулікова, нехта выкраў тэлевізар і бялізну. Пачалі шукаць і высветлілася, што старога абрабаваў 25-гадовы сын, які ўжо пабываў у турме. Злодзея шукаюць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«СЮРПРЫЗЫ» ДЛЯ ЖАНЧЫН-КУРЦОЎ

36,6°

Сёння жанчына, якая курыць, — звычайная з'ява. У нашай краіне курыць ад 20 да 40 працэнтаў жанчын. Гэтыя лічбы палохаюць. Бо жанчына-курэц наносіць непапраўную шкоду не толькі ўласнаму здароўю, але і здароўю сваіх дзяцей.

Цыгарэта па розных прычынах апынаецца ў жаночых вуснах — адны такім чынам спрабуюць зняць стрэс, другія курыць за кампанію, а трэція бачаць у цыгарэтах магчымасць злавіць натхненне... Аднак незалежна ад прычыны, якая пабудзіла пачаць курыць, кожная з ахвяраў тытуню атручвае свой арганізм і змяншае свае шанцы быць здаровай жонкай і здаровай маці.

КУРЭННЕ І ПРЫГАЖОСЦЬ

Скура ў першую чаргу выдае ў жанчыне заўзятага курца. Паверхневыя сасуды звужаюцца пад уздзеяннем нікаціну, сілкаванне эпідэрмісу скарачаецца — у выніку аматарка цыгарэт становіцца ўладальніцай цьмянай звялай скуры і цёмных кругоў пад вачыма. Пастаяннае кіслароднае галаданне выклікае з'яўленне дачасных маршчын.

Пазногці і валасы таксама пакутуюць ад згубнай звычкі сваёй уладальніцы. Валасы становяцца ломкімі, безжыццёвымі, бо скурнае покрыва галавы абязводжваецца. Сівізна ў большым аб'ёме і ў больш раннім узросце з'яўляецца ў курцоў, чым у тых, хто ўтрымліваецца ад курэння тытуню. Пазногці слаяцца і ломяцца, іх колер у большасці выпадкаў далёкі ад ідэалу.

Зубы — індыкатар стажу курца. Нездаровая жаўцізна, непрыемны пах і праблемныя дзясны — спадарожнікі аматаркі выкурыць цыгарэтку.

КУРЭННЕ І ПМС

Вучоныя выявілі, што жанчыны, якія курыць сістэматычна, у два разы больш схільныя да ўзнікнення перадменструальнага сіндрому. Вынікі даследаванняў паказалі, што асноўныя сімптомы ПМС — болі ў паясніцы, у грудзях, з'яўленне прышчоў — узмацняюцца ў выпадку, калі жанчына курыць.

Чым раней жанчына пачынае курыць, тым большая рызыка атрымаць увесь спектр праяў ПМС у асабліва вострай форме.

КУРЭННЕ І МАЦЯРЫНСТВА

Негатыўныя наступствы курэння праяўляюцца не толькі ў жанчыны, але і ў яе дзіцяці — народжанага або патэнцыяльнага. Цыгарэты самым страшным чынам уздзейнічаюць на яйцаклетку, запускаючы праграму іх знішчэння. Шанцы зацяжарыць у жанчын-курцоў значна скарачаюцца, здольнасць да дзетараджэння змяншаецца. Курэнне ў маладых жанчын супастаўнае з выдаленнем аднаго яечніка.

Рызыка нараджэння дзіцяці з самымі рознымі дэфектамі, з прыроджанымі парокамі развіцця павялічваецца з кожнай выкуранай цыгарэтай. Халодная статыстыка паказвае: выкідышы ў жанчын-курцоў здараюцца на 25—30 працэнтаў часцей, а таксама што ў іх у 5 разоў узрастае верагоднасць з'яўлення на свет мёртвага дзіцяці. Таксікозы цяжарнасці, слабасць родавай дзейнасці — вось няпоўны спіс магчымых ускладненняў.

Нават калі жанчына кіне курыць адразу пасля выяўлення цяжарнасці, рызыка з'яўлення прыроджаных дэфектаў у дзіцяці ўсё адно застаецца. Медыкі зазначаюць: кідаць курыць неабходна як мінімум за паўтара года да наступлення цяжарнасці. За гэты тэрмін арганізм ачысціцца ад шкодных рэчываў.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ЧАСТЫЯ ПОЗЫВЫ

Здароўе нацыі

Пачашчанае мочавыдзяленне і нетрыманне мачы — дзве найбольш распаўсюджаныя праблемы, звязаныя з мачавым пузыром. У мужчын і жанчын гэтыя расстройствы маюць рознае паходжанне, але ж аднолькава ўпарта доўгі час ігнаруюцца або лечацца народнымі сродкамі, што ў рэшце рэшт прыводзіць да сур'ёзных ускладненняў. Аб гэтым — загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр СТРОЦКІ.

— Пачашчанае мочавыдзяленне вельмі распаўсюджанае сярод жанчын. У большасці выпадкаў гэты стан абумоўлены не спецыфічнымі інфекцыямі мачавых шляхоў. Гэта і ёсць цыстыт — запаленне мачавога пузыра. Паводле статыстыкі, кожная другая жанчына ва ўзросце пасля 50 гадоў мела хоць бы адзін эпізод цыстыту.

— Рызыкну меркаваць, што абсалютная большасць не звярталася пры гэтым да ўролага...

— Так і ёсць. Калі жанчына пачынае часцей мачыцца, яна ідзе... да суседкі. Тая кажа: дык я ўжо з гэтым дзесяць гадоў жыву, вось што я табе параю. Насамрэч ісці да суседкі і трымацца яе парадаў — вялікая памылка. Разгледзім ідэальны варыянт, калі ў жанчыны сапраўды востры цыстыт, а не іншае захворванне, якое выклікала гэткія ж сімптомы. А менавіта пачашчанае, хваравітае мочавыдзяленне, боль у ніжнім адддзеле жывата, боль пры запаўненні мачавога пузыра... У прынцыпе, гэта і ўсе спецыфічныя сімптомы. Калі жанчына будзе абследавацца, могуць выявіцца невялікія змяненні ў аналізах мачы і крыві. Рэдка бывае павышэнне тэмпературы. Сітуацыя не смяротная, але, мякка кажучы, непрыемная.

Такім чынам, дапусцім, у жанчыны сапраўды востры неспецыфічны цыстыт. У 85—92 працэнтах выпадкаў ён выклікаецца кішэчнай палачкай. І для ўролагаў не сакрэт, да якіх лекавых прэпаратаў яна адчувальная. Да фторхеналонаў. Але яны ўваходзяць у склад спецыяльных антыбіётыкаў, а не тых танных, даступных, якія ёсць у кожнай хатняй аптэчцы — накшталт пятноку, ампіоксу, бісептолу... Іх ужыванне не толькі не дапамагае, але і выхоўвае ўстойлівасць да антыбіётыкаў у прынцыпе, зацягвае працэс лячэння, спрыяе пераходу захворвання ў хранічную стадыю.

— А як кішэчная палачка трапляе ў мачавыя шляхі?

— Кішэчная палачка, як вядома, прысутнічае ў арганізме чалавека. Яна можа пранікаць з крывёй падчас запалення кішэчніка ці органаў малога тазу. Можа пранікаць з лімфай, а часцей — непасрэдна праз мочавыдзяляльны канал, які ў жанчын шырокі і кароткі, а значыць, даступны для мікробаў. Можа назірацца і ўзыходзячая інфекцыя з вонкавых палавых органаў.

— Ці можна ўсё ж такі абысціся без спецыяльных антыбіётыкаў — проста прыкласці грэлку, пасядзець над разагрэтай цэглай?

— Кішэчную палачку цеплыня не заб'е. А крыху лягчэй сапраўды стане.

— Якое дачыненне да запалення мачавога пузыра маюць інфекцыі, што перадаюцца палавым шляхам?

— Прамое. Яны могуць выклікаць запаленне мачавога пузыра. Калі ў дачыненні да хламідый, напрыклад, гэта пытанне пакуль застаецца дыскусійным, то ў дачыненні да ўрэаплазмаў факт з'яўляецца ўжо даказаным.

Як правіла, палавыя інфекцыі маюць дачыненне да рэцыдыўных цыстытаў, якія паўтараюцца часцей за 4 разы на год. Бывае, на фоне зніжэння імунітэту, ацяпляльнага сезону, а пасля 75 гадоў — кожны 90 працэнтаў. Але ж гэта не азначае, што ва ўсіх гэта захворванне праявіцца. Звычайна ў кожнага чацвёртага дабраякасная гіперплазія праяўляецца пачашчаным мочавыдзяленнем. Акрамя пачашчэння, можа назірацца абцяжаранне мочавыдзялення, калі трэба пастаяць, натужыцца. Можа быць і неўтрыманне, прымусовыя позывы, калі як толькі захацеў памачыцца, тут жа трэба гэта зрабіць. Можа быць і аслаблены струмень. Аднак падобныя сімптомы могуць быць і пры раку пастаты, пры пухлінах і камянях мачавога пузыра.

— Якім чынам трэба абследаваць?

— Пасля 50 гадоў кожны мужчына, незалежна ад наяўнасці сімптомаў, павінен прыйсці да ўролага, які і высветліць, ці ёсць у пацыента расстройствы мочавыдзялення, вызначыць, ці няма тоў жа гіперплазіі пастаты. Неабходна ведаць, што адэнома сама па сабе нічым не пагражае. Ад дабраякаснай гіперплазіі пастаты не памёр ніводзін мужчына. Гінуць ад ускладненняў гэтага стану. Можа быць і сціскненне мачавога канала, з-за чаго з'яўляецца астаткавая мача, і расшырэнне верхніх мачавых шляхоў, што пагражае хранічнай ныркавай недастатковасцю, і мочакаменная хвароба, пры якой пачнецца застой мачы, што спрыяе ўзнікненню раку мачавога пузыра. Могуць развівацца дывертыкулы мачавога пузыра, таксама сур'ёзнае ўскладненне. Усё з пералічанага можна не дапусціць, калі своечасова абследавацца. Здаць аналізы мачы, крыві, у тым ліку на прастатспецыфічны антыген. Зрабіць ультрагукавое даследаванне прастаты, якое дапаможа вызначыць аб'ём мачы, устанавіць, ці няма астаткавай мачы, расшырэння верхніх мачавых шляхоў.

— І часта мужчыны прыходзяць да ўролага да таго, як з'явіліся першыя сімптомы?

— Калі ў мужчыны з'яўляюцца першыя прыкметы дабраякаснай гіперплазіі, ён... ідзе да суседа. Той кажа: я ўжо дзесяць гадоў так жыву, вось табе мая парада. Так мужчына і дацягвае да ўскладненняў.

— У якой ступені адэнома паддаецца лячэнню?

— Сродкаў, якія поўнасцю рассмакталі б адэному, не існуе. Ёсць такія, што змяншаюць памеры пастаты, пазбаўляюць ад непрыемных сімптомаў. Такіх прэпаратаў вельмі многа, і актыўна распрацоўваюцца новыя.

— Прэпараты трэба піць усё жыццё?

— Спачатку, па меншай меры, працягла. А потым — залежыць ад сітуацыі.

— Па якой прычыне ў мужчын можа настаць нетрыманне мачы?

— Часцей за ўсё яно назіраецца пасля хірургічных умяшанняў, аперацыі па прычыне раку пастаты. У 20—30 працэнтах выпадкаў у выніку радыкальнай пастатэктаміі з'яўляецца частковае нетрыманне мачы. Яно можа сустракацца і з-за дабраякаснай гіперплазіі.

— Такому мужчыну можа дапамагчы спецыяльная аперацыя, накшталт той, што выконваецца жанчынам?

— Мужчынам дапамагчы больш складана. Аперацыі, падобныя на тыя, што выконваюцца пры нетрыманні мачы жанчынам, ужо робяцца ў свеце. У Беларусі пакуль не. Матэрыялы, патрэбныя для гэтых маніпуляцый, у нас не зарэгістраваныя. Уролаг дае такім хворым спецыяльныя рэкамендацыі, знаёміць з комплексам практыкаванняў на ўмацаванне мышцаў прамежнасці.

— Згаданыя аперацыі яшчэ больш дарагія, чым для жанчын?

— Думаю, яны будуць яшчэ даражэйшыя. Там выкарыстоўваецца крыху іншая канструкцыя... Пытанне аб неабходнасці правядзення аперацый мы ўжо агучылі ў Міністэрстве аховы здароўя. Цяпер падвінна адшукацца фірма, якая прывязе расходныя матэрыялы...

— Вы лічыце, паслугі ўролага сёння даступныя?

— Уролагаў зараз не хапае. Большасць раёнаў іх не мае наогул. А ў сталіцы нестае працэнтаў дваццаць. Тым не менш, магу сцвярджаць, што кансультацыя ўролага ў нашай краіне цалкам даступная. У тым жа Мінску на базе паліклінік № 4, 19 і 29 створаны тры гарадскія ўралагічныя цэнтры, дзе ўролагі працуюць у дзве змены. Ва ўсіх абласцях ёсць уралагічныя аддзяленні і кансультацыйныя паліклінікі. Да таго ж, як вядома, не абавязкова адразу ісці на прыём да вузкага спецыяліста. Спачатку можна і да тэрапеўта.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 30 октября 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 26.10.2009 года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе по нескольким лотам, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой.

Победители аукциона обязаны: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная (общая) сумма затрат составляет 8 миллионов рублей.

№№ Лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1	район ул. Слепокурова № 12 по генплану	0,1200	740100000001004850	16 533 000	1 488 000
Лот № 2	район ул. Слепокурова № 13 по генплану	0,1200	740100000001004851	16 533 000	1 488 000
Лот № 3	район ул. Слепокурова № 14 по генплану	0,1200	740100000001004852	16 533 000	1 488 000
Лот № 4	район ул. Слепокурова № 15 по генплану	0,1200	740100000001004853	16 533 000	1 488 000
Лот № 5	район ул. Слепокурова № 16 по генплану	0,1200	740100000001004854	16 533 000	1 488 000
Лот № 6	район ул. Слепокурова № 17 по генплану	0,1200	740100000001004855	16 533 000	1 488 000
Лот № 7	район ул. Слепокурова № 18 по генплану	0,1200	740100000001004857	16 533 000	1 488 000
Лот № 8	район ул. Слепокурова № 19 по генплану	0,1200	740100000001004756	16 533 000	1 488 000

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. В радиусе 300 м имеются сети водопровода.

Контактный телефон в г. Могилеве: 22 11 63.

А не шкодзь!

КАНТРАЛЁРЫ ВЫЯВІЛІ ПАРУШАЛЬНІКАЎ

Работнікі Бярозаўскай міжрайінспекцыі сумесна са спецыялістамі Камітэта дзяржкантролю выявілі факт забруджвання спіртзаводам «Пескаўскае» Бярозаўскага раёна абводнага канала возера Чорнае і прылеглых зямель. Прадпрыемству прад'яўлена прэтэнзія на пакрыццё нанесенай шкоды ў памеры 31,4 мільёна рублёў.

Адначасова была праведзена праверка ААТ «Альшэўскі птушкаплемзавод», падчас якой таксама выяўленыя парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства. У дачыненні да суб'екта гаспадарання распачаты адміністрацыйны працэс. Падчас сумеснай працы дзяржінспектараў з прадстаўнікамі дзяржкантролю ўстаноўлены і факт забруджвання глебы і лесу сцёкамі ад комплексу па адкорме буйной рагатай жывёлы ААТ «Айчына» Пружанскага раёна. Нанесеная шкода ад усыхання дрэў ацэнена ў 7,8 мільёна рублёў. Памер шкоды ад дэградацыі зямель яшчэ высвятляецца шляхам правядзення аналізу проб вады і глебы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Да ўвагі

ЗА ПАКІНУТЫЯ АЎТО ПРЫЙДЗЕЦЦА ПЛАЦІЦЬ?

У Мінгарвыканкаме прапануюць увесці падатак на зямлю, што занятая аўтамабілем, які гаспадар хоча захаваць як рарытэт; не дазваляць набыццё новага аўтамабіля без даведкі аб здачы ва ўтыль старога і іншыя меры.

Штогод з гарадскіх вуліц і двароў камунальныя службы забіраюць каля 1,5 тысячы адзінак старых машын, расказаў Анатоль Філатаў. У той жа час колькасць аўтамабіляў у горадзе пастаянна павялічваецца — у сярэднім на 30—35 тысяч адзінак у год. Калі паводле звестак на 1 студзеня 2008 года на ўліку ў сталічнай ДАІ знаходзіліся 473 тысячы аўтамабіляў, то на 1 верасня гэтага года — 534 тысячы. Сёння на сем мінчан прыпадае 2 аўтамабілі. А праз два гады будзе па адным на кожную сталічную кватэру.

Сёння эвакуацыяй аўтахламу займаюцца ЖРЭА і ЖЭС. Любы жыхар сталіцы можа звярнуцца туды і напісаць заяву, каб яго аўто бясплатна эвакуявалі і здалі на перапрацоўку. Для гэтага трэба толькі зняць машыну з уліку ў ДАІ і здаць нумарныя знакі.

Святлана ФРАЛЯНКОВА,
«Мінск—Навіны».

НАПЕРАДЗЕ — АДКРЫЦЦЁ СЕЗОНАЎ ПАЛЯВАННЯ

Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і паляванняў, у краіне з 1 кастрычніка распачынаецца асенне-зімовы сезон палявання на лася, высакародная алення, дзіка, еўрапейскую казулю. Доўжыцца ён будзе да 15 снежня.

Здабываць дазваляецца жывёл любога полу і ўзросту, акрамя свіната — важакоў статку, збройным спосабам: загонам і з паляўнічымі сабакамі — у светлы час сутак, з засады і з падыходу — на працягу сутак.

З 1 кастрычніка па 31 снежня будзе доўжыцца яшчэ адзін сезон палявання. У светлы час сутак збройным і бяззбройным спосабамі, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі будзе дазволена здабываць рачных бабра і выдру — жывёл любога полу і ўзросту.

На андатру пачатак палявання пачнецца некалькі пазней — з першай суботы кастрычніка. Асенне-зімовы сезон будзе працягвацца па апошнюю нядзелю студзеня ў светлы час сутак. Збройным і бяззбройным спосабамі можна будзе здабываць жывёл любога полу і ўзросту. З першай суботы па апошнюю нядзелю кастрычніка ў краіне пройдзе асенні сезон палявання на зайца-беляка і зайца-русака. Здабываць можна будзе жывёлу любога полу і ўзросту збройным спосабам з паляўнічымі сабакамі, якія маюць палявы дыплом, з хартамі, лоўчымі птушкамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Крымінал

НЕСАПРАЎДНЫ ПАЛЯЎНІЧЫ

Работнікі Мсціслаўскай міжрайінспекцыі ў паляўнічых угоддзях затрымалі грамадзяніна, які ў цёмны час сутак паляваў без дазвольнага дакумента, у забаронены для палявання перыяд.

Пры праверцы дакументаў парушальнік паказаў дзяржаўнае пасведчанне на права палявання і дазвол на права захоўвання і нашэння паляўнічай зброі, якое было падоўжана да красавіка 2011 года. Аднак пры далейшым разборы высветлілася, што ў 2005 годзе гэты грамадзянін быў асуджаны за незаконны абарот зброі. У сувязі з гэтым ён не мог на законных падставах атрымаць дакументы на права палявання і на паляўнічую зброю. Акрамя таго, высветлілася, што ў адзінай базе звестак МУС за гэтым чалавекам паляўнічая стрэльба, з якой ён паляваў, не значылася. Матэрыялы накіраваныя для далейшай праверкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГЕНЕРАЛЬНЫ ДЫРЭКТАР З МАСКВЫ — КАНТРАБАНДЫСТ

На аўтадарозе мяжа Расіі — Мінск — Брэст раніцай ля вёскі Высокае Аршанскага раёна міліцыянеры з ДАІ разам з супрацоўнікамі падатковай інспекцыі затрымалі «Таёту» з кантрабандным алкаголем.

Вызначана, што розныя спіртныя напоі (усяго 22,5 літра) вёз пасажыр машыны — 57-гадовы генеральны дырэктар маскоўскай фірмы. А кіраваў аўто вадзіцель фірмы. Паколькі дакументы на вялікую партыю спіртнога адсутнічалі, алкаголь канфіскавалі. Складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне адпаведнага заканадаўства.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Факт

РАНЕЙ КРАЛІ РЫБУ, ЦЯПЕР — КАНСЕРВЫ

Ноччу абакралі павільён брэсцкага прыватнага прадпрыемства. Вынеслі піва, цыгарэты і прадукты харчавання на суму каля 5 мільёнаў рублёў. Злодзеі затрыманы па гарачых слядах. Імі былі маладыя непрацуючыя брастаўчане, якія ўжо асуджаліся за незаконную здабычу рыбы.

Яна СВЕТАВА.

БАБРУЙСКІЯ «ФАЛЬКСВАГЕНЫ» ЗБІЛІ ДЗВЮХ ЖАНЧЫН

28 верасня ў Магілёўскай вобласці адбыліся два дарожныя здарэнні са смяротным зыходам. У абодвух выпадках аўтамабілі маркі «Фальксваген», якімі кіравалі жыхары горада Бабруйска, сталі прычынай смерці жанчын.

Першае ДТЗ адбылося на вуліцы Інтэрнацыянальнай у Бабруйску: 24-гадовы вадзіцель быў няўважлівым на нерэгуляваным пешаходным пераходзе і наехаў на 69-гадовую пенсіянерку, якая памерла на месцы.

У той жа панядзелак каля 21-й гадзіны на аўтатрасе «Мінск—Гомель» паблізу вёскі Падрэчча Кіраўскага раёна «Фальксваген Транспарцёр», якім кіраваў 37-гадовы бабруйчанін, наехаў на жанчыну. Яна стаяла на краі дарогі і не была пазначана ў цемры флікерамі: 33-гадовая жыхарка Клічава загінула ад атрыманых траўмаў.

Алена КАЗЛОВА.

Открытое акционерное общество
«ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ»

ПРОВОДИТ 12 ОКТЯБРЯ 2009 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об уменьшении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений в Устав Общества.
3. О покупке акций на баланс Общества.
4. Об оказании спонсорской помощи.

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник — пятница), начиная с 1 октября 2009 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8.15 до 17.00, перерыв на обед с 12.30 до 13.15.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.
Время начала проведения собрания — 11 часов.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на **1 октября 2009 года.**

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 9.00 до 10.45.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении **паспорта** (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — **по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.**

Совет директоров.

«ХРУСТАЛЬНЫ ЖУРАВЕЛЬ» паляцеў на Брэстчыну

Пераможца конкурсу «Настаўнікгода-2009» Юрый АНДРЭЙЧЫК дае свой міні-ўрок.

Дырэктару ганцавіцкай школы ўдалося даказаць, што і настаўнік ён — таксама выдатны...

Віктараўна Бандарэнка і дырэктар ганцавіцкай агульнаадукацыйнай школы № 2 Юрый Мікалаевіч Андрэйчык, які выкладае ў школе біялогію.

Уявіце сабе сітуацыю: настаўніца ідзе па школьным калідоры на ўрок, а вучні літаральна засыпаюць яе камплімentамі, параўноўваюць з Клаўдзіяй Шыфер, кажуць, што выглядае тая проста ашаламляльна. Як рэагаваць на гэта педагогу? Ці вось яшчэ адна класічная педагагічная задачка. У клас заходзіць настаўніца, вітаецца з дзецьмі, падыходзіць да свайго стала, бярэ класны журнал і бачыць пад ім...белую мышку. У гэты момант за рэакцыяй настаўніцы ўважліва сочаць трыццаць пар дзіцячых вачэй, якія нецярпліва чакаюць кульмінацыі спектакля. Як выйсці з сітуацыі педагогу? На роздум суперфіналістам рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» давалася ўсяго 20 секунд, але ў рэчаіснасці 20 секунд для настаўніка — сапраўдная раскоша. Рэакцыя павінна быць імгненнай. І тут без пачуцця гумару настаўніку дакладна не абысціся... Забягаючы наперад, мусім прызнаць, што ў новага ўладальніка «Хрустальнага жураўля» пачуццё гумару і сапраўды выдатнае...

Але аб ўсім па парадку. Суперфіналу конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў, які адбыўся напрыканцы мінулага тыдня, папярэднічалі два напружаныя тыдні фінальнай часткі спаборніцтваў. Нагадаем, што ў фінале за ганаровае званне «Настаўнік года» змагаўся 21 педагог — усе яны ўжо сталі пераможцамі абласных і мінскага гарадскога этапаў рэспубліканскага конкурсу. У фінале членам журы давялося ацэньваць самапрадстаўленне педагогаў, іх адукацыйны праект і два ўрокі ў незнаёмай аўдыторыі. Тэму аднаго ўрока выбіраў сам канкурсант, а другую тэму яму прапаноўвала журы. Гэта, бадай, адно з самых складаных конкурсных выпрабаванняў, паколькі ўдзельнікам толькі напярэдадні правядзення ўрока становяцца вядомымі яго тэма, клас і школа, у якой яны будуць даваць свой конкурсны ўрок. Літаральна за адзін вечар і адну ноч педагогам трэба падрыхтавацца і ўжо раніцай прадэманстраваць членам журы план-канспект урока. Акрамя таго, усе фіналісты прайшлі сур'ёзнае педагагічнае і псіхалагічнае тэсціраванне. Па словах прарэктара Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіны Нікалаенкі, якая не першы раз узначальвае журы конкурсу, ніякіх праблем з тым, як параўнаць педагагічны талент настаўніка музыкі, і, скажам, настаўніка фізікі ці біялогіі, у журы няма.

Шэсць уладальнікаў самых высокіх балаў па выніках фінальных спаборніцтваў трапілі ў суперфінал, прычым разрыў у балах трох суперфіналістаў быў зусім мінімальны і складаў усяго некалькі сотых бала. Такім чынам, у суперфінале сустрэліся **настаўнік беларускай мовы і літаратуры віцебскай гімназіі № 5 Галіна Анатольеўна Сухава, настаўнік біялогіі мінскага ліцэя № 2 Таццяна Мікалаеўна Сагаль, настаўнік фізікі сярэдняй школы №10 горада Жлобіна Алег Анатольевіч Купрацэвіч, настаўнік музыкі магілёўскай сярэдняй школы № 37 Вольга Генадзьеўна Боніч, настаўнік матэматыкі Светлагорскай гімназіі Вікторыя**

«Вучні» з кола фіналістаў конкурсу дэманструюць закон сусветнага прыцягнення.

Вым наказам на дарослае жыццё. Разам з настаўнікам «вучні» майстравалі макет дрэва, на галінках якога пісалі, чаго яны хочуць дасягнуць у жыцці, а затым з лепшых чалавечых якасцяў складвалі фундамент дома, з гармоніі і дабрыні «будавалі» сцены, а з кахання і сілы — дах. Тэма ўрока настаўніцы матэматыкі Вікторыі Бандарэнкі гучала так: «Навучыць чалавека быць шчаслівым нельга, але...». «Але можна гэтаму навучыцца», — да такой высновы «дзеці» прыйшлі напрыканцы ўрока.

Міні-ўрок настаўніка фізікі Алега Купрацэвіча пераўтварыўся ў сапраўдны банк ідэй і вельмі парадаваў гледачоў у зале, паколькі «вучням» давялося праявіць выключную вынаходлівасць, каб прадэманстраваць закон Архімеда, адкрыццё Ньютана (закон сусветнага прыцягнення), вынаходніцтва радыё і геацэнтрычную сістэму Каперніка. Адгадаць, што паказваюць настаўнікі, павінны былі балельшчыкі ў зале. А калі настаўнік прапанаваў «вучням» закончыць фразу, якая і стала тэмай урока, «Не май сто рублёў», давялося пачуць самыя нечаканыя варыянты ад «Не май сто рублёў, а май 100 балаў на цэнтралізаваным тэсціраванні» да «Не май сто рублёў, а май сто гектараў зямлі на чарнаморскім узбярэжжы». «Лепш мець не сто рублёў, а сто ідэй», — рэзюмаваў напрыканцы педагог.

Самым жа пранікнёным стаў урок настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Галіны Сухавай, якая падзяліла свой імправізаваны клас на дзве групы: «Кахаю» і «Люблю». У чым розніца паміж двума гэтымі словамі? Ці кожны, хто ўдала рыфмуе словы, можа быць паэтам? Як успрымае свет паэт? Ці можна ўбачыць незвычайнае ў звычайным? Як можна тактоўна перадаць стогадовы ўзрост чалавека? Адказы на гэтыя пытанні «вучні» шукалі ў прыгожых вершаваных радках Рыгора Барадуліна, якія ліліся з вуснаў настаўніцы:

Хай снег гадоў асядзе ў валасах,
Хай будзе мне
хоць пяць разоў па дваццаць —
Усмешкай палахлівай на губах,
Ты школьніцай мне будзеш
ўсміхацца.

Прычым не проста шукалі, але і спрабавалі ўдзельнічаць у вершавальнай «дуэлі» з літаратурным класікам.

Апошнім выпрабаваннем для педагогаў стала абарона адукацыйнага праекта. Безумоўна, у кожнага, хто быў сведкай суперфіналу, быў свой фаварыт, але канчатковы вердыкт выносіла ўсё ж прафесійнае журы. І па яго рашэнні галоўны прыз конкурсу — «Хрустальны журавель» — дастаўся дырэктару ганцавіцкай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы « №2, настаўніку біялогіі Юрыю Андрэйчыку. Як прызнаецца пераможца, на ўдзел у конкурсе прафесійнага майстэрства педагогаў яго падштурхнула імкненне развеяць распаўсюджанае меркаванне аб тым, што кіраўнік навучальнай установы — гэта толькі гаспадарнік. На думку педагога, дырэктар у першую чаргу павінен быць настаўнікам настаўнікаў і ўласным прыкладам гэта пацвярджаць. Дзеля справядлівасці зазначым, што Юрый Андрэйчык — першы ў гісторыі правядзення рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў кіраўнік школы, які заваяваў ганаровае званне «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». За конкурсны ўрок на тэму, прапанаваную журы, ён атрымаў самую высокую суму балаў з усіх фіналістаў. А на абласным этапе яму ўдалося завяваць не толькі дарослае, але і дзіцячае журы і перамагчы ў намінацыі «Вучнёўская авацыя». Выключнае пачуццё гумару і яркія артыстычныя задаткі ён прадэманстраваў і ў суперфінале конкурсу, што, не выключана, у немалой ступені дапамагло яму перамагчы не менш моцных за яго канкурэнтаў.

Галоўнай мэтай сваёй працы ў школе пераможца лічыць фарміраванне і выхаванне актыўнай асобы. Галоўнае, каб кожны выпускнік знайшоў сябе, і не важна, кім ён стане — прафесарам ці слесарам. Своеасаблівым эпіграфам да сваёй педагагічнай дзейнасці ён абраў словы К. Ушынскага: «Дзіця патрабуе дзейнасці пастаянна. Стамляецца ж не ад дзейнасці, а ад яе аднастайнасці». Таму свае ўрокі біялогіі настаўнік імкнецца як мага больш разнастаіць, кваліфікавана спалучае традыцыйныя метады і прыёмы навучання з элементамі інфармацыйных тэхналогій, развіццёвага, модульнага, праблемнага навучання. Яго вучні — актыўныя ўдзельнікі і прызёры раённых алімпіяд па біялогіі, навукова-практычных канферэнцый, конкурсаў і фестываляў эколага-біялагічнай накіраванасці.

Між іншым, перамога Юрыя Андрэйчыка цалкам упісалася ў адну даўнюю традыцыю: у Беларусі (як, дарэчы, і ў нашых суседзяў-расіян) на конкурсах прафесійнага майстэрства педагогаў перамагаюць, як правіла, настаўнікі-мужчыны, хоць прафесія настаўніка і носіць яскрава выражаны жаночы характар. Толькі ў 1997 годзе ўладальніцай «Хрустальнага жураўля» стала настаўніца гісторыі з ашмянскай СШ № 2 Валянціна Гінчук, а ў 2006 годзе — настаўніца біялогіі са смаргонскай гімназіі № 1 Ірына Клявец. Конкурс, дарэчы, праводзіцца раз у тры-чатыры гады. Пачынаючы з 1991 года, у пяці з сямі конкурсаў перамагалі прадстаўнікі Брэстчыны. Такім чынам Юрый Андрэйчык стаў шостым прадстаўніком сістэмы адукацыі Брэстчыны, які здолеў дамагчыся звання «Настаўнік года».

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

І школа маладой жонкі...

Яе, як высветлілася, жанчына можа паспяхова закончыць. Дзе? У нямецкім народным універсітэце. Днямі ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры імя Йаханэса Рау адкрылася прадстаўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў.

Аб тым, што такое народная адукацыя па-нямецку і як яна будзе ажыццяўляцца ў Беларусі, было падрабязна расказана ў час прэзентацыі афіцыйнага адкрыцця прадстаўніцтва асацыяцыі. Усе падкрэслівалі аднадушна: навучанне — гэта працэс пастаянны, і тым ліку і ў сталым узросце. Аб гэтым пераканаўча гаварылі і дыпламат з пасольства Германіі, і прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Беларусі, і, вядома, выканаўчы дырэктар усходнееўрапейскага бюро асацыяцыі Уве Гартэншлегер. Ён паведаміў аб мэтах і перспектыўных кірунках работы яго структуры ва Усходняй Еўропе і Беларусі. Прадстаўніцтва ў нас адчыняецца для развіцця дзейнасці ў сферы адукацыі, навукі, культуры, асветы, садзейнічання духоўнаму развіццю асобы. А гэтага немагчыма дасягнуць без супрацоўніцтва з беларускімі арганізацыямі адукацыі дарослых.

Нагадаем, нямецкая асацыяцыя народных універсітэтаў (Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.) была заснаваная ў 1953 годзе. Яе мэта — адстойванне і прадстаўленне інтарэсаў 16 зямельных асацыяцый і каля 1000 універсітэтаў народнай адукацыі. Бо яны даюць дарослым грамадзянам Германіі шмат магчымасцяў для атрымання дадатковай адукацыі: ад прафесійна-арыентаваных праграм да курсаў культурнай, палітычнай тэматыкі і забаўляльных мерапрыемстваў. Штогод гэтыя вучэбныя курсы ў народных універсітэтах у краіне наведвае каля 10 мільёнаў чалавек. Фінансаванне вучэбнага працэсу ідзе праз Міністэрства эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (70-80%), МЗС Германіі, структуры Еўрапейскага саюза і інш.

Гэтыя народныя універсітэты становяцца ўсё больш папулярнымі ў свеце. Структурныя падраздзяленні асацыяцыі падтрымліваюць праекты развіцця амаль у 40 краінах. Рэгіянальныя бюро існуюць у Ташкенце, Мехіка, Канакры, Адыс-Абебе, Кейптаўне, Сараеве і г. д. Апошнім часам усё актыўней асацыяцыя працуе ва Усходняй Еўропе. Вынікам яе работы ва Украіне стала стварэнне недзяржаўнага вучэбна-вытворчага комплексу «Імпульс» (сетка камп'ютарных класаў і вытворчыя філіялы: міні-пякарня, швейны і сталярны цэхі) у невялікім горадзе Сколе Львоўскай вобласці.

У Беларусі прадстаўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў плануе засяродзіцца на стварэнні і развіцці прафесійных устаноў для адукацыі дарослых, на падтрымцы гэтай сферы паслуг для ўсіх сацыяльных груп. Бюро зоймецца распрацоўкай вучэбных планаў для прафесійнага навучання дарослых, праграм фэстаў нефармальнай адукацыі. І, магчыма, дзякуючы намаганням прадстаўніцтва асацыяцыі ў нас таксама адчыняцца школы маладой жонкі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Здарэнні

ВЫМУШАНАЯ ЭВАКУАЦЫЯ З-ЗА... ЦЫГАРЭТЫ

Уноч на аўторак у Мінску з інтэрната давялося тэрмінова эвакуяваць 29 жыльцоў з-за пажару.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, агонь успыхнуў каля паловы другой ночы ў пакоі інтэрната па вуліцы Варвашэні, 7. Пры тушэнні пажару інтэрнат мусілі пакінуць жыльцы чацвёртага паверха. А вось 45-гадоваму гаспадару пакоя, дзе працавалі пажарныя, ні выратавальнікі, ні ўрачы ўжо нічым не змаглі дапамагчы — ён загінуў. Паводле папярэдніх звестак, прычынай пажару стала неасцярожнасць мужчыны пры курэнні ў ложку.

Ігар ГРЫШЫН.

КАЛДУНЫ З МІНАЙ

Міна часоў Вялікай Айчыннай вайны трапіла непасрэдна ў бульбаўборачны камбайн і вылезла на транспарцёр разам з бульбай. Як расказалі ў цэнтры прапаганды і навучання Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, здарэнне адбылося ў вёсцы Холмеч Рэчыцкага раёна. Страшная госця была абясшкоджана сапёрамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТРАГІЧНАЯ РЫБАЛКА

На штучным вадаёме ў в. Сваятычы (Ляхавіцкі раён) рабочы СВК «Жарабковічы» вырашыў палавіць рыбу.

Цяпер пракуратура высвятляе, што ў час той рыбалкі здарылася, бо 55-гадовы мужчына ўтапіўся.

З ХІРУРГІІ ПРАЗ АКНО...

Жыхар в. Уцёс Баранавіцкага раёна знаходзіўся на лячэнні ў хірургічным аддзяленні бальніцы. Па невядомай прычыне ён вырашыў развітацца з жыццём і выкінуўся з трэцяга паверху. Хворы загінуў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НАВУЧЫЦЬ НЕЛЬГА — НАВУЧЫЦЦА МОЖНА?

Чыя віна ў тым, што большасць выпускнікоў аўташкол з першага разу не здаюць іспыты ў Дзяржаўтаінспекцыі? Чаму большасць «правалаў» прыпадае на жыхароў сталіцы? У чым сакрэт 100-працэнтнай здачы? Ці лёгка жанчыне працаваць майстрам па ваджэнні? На гэтыя пытанні карэспандэнт «Звязды» шукала адказы на рэспубліканскіх спаборніцтвах па прафесійным майстэрстве сярод майстроў вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі. За права лічыцца лепшымі змагаліся 6 абласных камандаў, адна аб'яднаная каманда ад вучэбных арганізацый цэнтральнага падпарадкавання, каманды Цэнтральнага аўтавучэбнага камбіната Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі і Беларускага таварыства аўтааматараў. У спецыялістаў праверылі веданне Правілаў дарожнага руху, устройства і тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіля, методыкі навучання, удзельнікі прадэманстравалі навыкі кіравання вучэбным аўтамабілем. Прычым журы ўлічвала не толькі хуткасць, але і якасць. Усе каманды паказалі нядрэнныя вынікі. Але лепшымі з лепшых стала каманда з Гомеля, другое месца заняла каманда з Гродна, трэцяе — з Віцебска.

— У чым сакрэт таго, што амаль усе вашы выпускнікі з першага разу здаюць практычны экзамен (ва ўсіх 27 удзельнікаў конкурсу высокія паказчыкі здачы)? — цікаўлюся ў пераможцаў.

— Ды няма ніякага сакрэту, — адказваюць яны ў адзін голас.

— Проста трэба любіць сваю працу, — кажа **Бернардзій КІСЕЛЬ, майстар вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі з Ашмянскай аўташколы**.

— А вы любіце?

— Каб не любіў, дык не працаваў бы тут 30 гадоў, — усміхаецца Бернардзій Францавіч. — Ведаеце, зарплата невялікая, плацяць ад сілы 600 тысяч. Ды і нерваў і здароўя шмат забірае, бо працаваць жа даводзіцца з людзьмі. А яны такія розныя. Трэба шукаць да кожнага свой падыход. Таму без цярпення, вытрымкі, патрабавальнасці і, што самае галоўнае, любові да сваёй працы тут ніяк. Ну і, безумоўна, трэба самому выдатна ведаць ПДР і пастаянна ўдасканальваць свае навыкі ваджэння. Дарэчы, спаборніцтвы, якія штогод для нас арганізоўваюць, стымулююць і прымушаюць працаваць над сабой.

— Ведаеце, у мяне шмат знаёмых, якія выдатна кіруюць і не ўяўляюць сваёй прафесіі без машыны, — уступае ў размову **Віктар КАВАЛЕНКА, майстар вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі з Гомеля**. — Але, паверце, не кожны з іх зможа працаваць майстрам. Бо ўмець ездзіць — гэта адно, а навучыць — зусім іншае.

— Сапраўды, нам не толькі трэба выдатна кіраваць машынай, але і быць часткова псіхолагамі, — падтрымлівае думку калегі **Анатоль ШАЛАК, майстар вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі з Лепельскай аўташколы**. — За 25 гадоў працы чаго толькі не нагледзеўся. Бывае, голас на навучэнца павысіш, дык ён адразу крыўдзіцца. А некаторыя жанчыны, калі ў іх нешта не атрымліваецца, кідаюцца ў слёзы.

Са стэрэатыпам, што жанчыне не месца за рулём, паспяхова змагаецца майстар Жанна ІСТАМЁНАК.

— Ці лёгка вам працаваць майстрам па ваджэнні? — паціка вілася я ў адзінай прадстаўніцы слабай палавіны чалавецтва на спаборніцтве.

— Працу вельмі люблю, — усміхаецца **Жанна ІСТАМЁНАК, майстар вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі з ААТ «Цэнтральны аўтавучэбны камбінат»**. — Праўда, спачатку сустракала здзіўленне і насцярожанасць з боку «вучняў», якія даведваліся, што іх будзе вучыць жанчына. Некаторыя нават, яшчэ да знаёмства са мной, хацелі папрасіць замену. Але ўжо пасля першага занятку ўсе развітваліся са сваімі стэрэатыпамі, што жанчыне за рулём не месца і г.д.

— Жанна, скажыце, калі ласка, чаму менавіта інструктар, а не кіроўца таксі, напрыклад?

— Ведаеце, я сапраўды хацела быць таксісткай, але не ўмею браць з людзей грошы. Таму калі прапанавалі паспрабаваць сябе ў ролі «настаўніцы», згадзілася. Праўда, работа не з лёгкіх, ды і часу нямала адымае, таму мае новыя калегі нейкі час лічылі дні — «колькі ж яна пратрымаецца?» Вось ужо больш як чатыры гады працую (*усміхаецца*). Але не без падтрымкі мужа, які працаваў настаўнікам у школе. Ён заўсёды, калі ў мяне не атрымліваецца, правярае ў малодшай дачкі ўрокі.

— Чыя віна ў тым, што большасць курсантаў з першага разу не здаюць іспыты ў ДАІ? І чаму большасць «правалаў» прыпадае на жыхароў сталіцы?

— Працэнт здачы залежыць толькі ад саміх навучэнцаў, — адказвае Жанна Істамёнак. — Я цвёрда пераканана, што чалавек можа нечаму навучыцца толькі пры моцным жаданні, а наша задача — дапамагчы яму ў гэтым. Праўда, ёсць некалькі «але». Рэч у тым, што праграма разлічана на тых, хто не са слоў ведае, што такое счапленне, тормаз. А да нас часам прыходзяць людзі, якія не маюць пра гэта нават найменшага паняцця. Вось ім, як правіла, і не хапае выдзеленых на практычнае ваджэнне гадзін. З-за гэтага не здаюць з першага разу і жанчыны пажылога ўзросту. Калі б хоць для такіх катэгорый людзей выдзялялася больш гадзін на ваджэнне, то эфект быў бы, пераканана, лепшы.

— Сапраўды, кантынгент навучэнцаў аўташкол за апошні час вельмі памяняўся, — пацвярджае Бернардзій Кісель. — Калі пачынаў працаваць, то ў групе было 2-3 жанчыны ад сілы, а мужчыны ў асноўным ужо мелі навыкі язды на трактары ці матацыкле. З імі было значна лягчэй працаваць. Цяпер у групе ў асноўным жанчыны. Многія прыходзяць у пенсійным узросце. Прычыны розныя: адна страціла мужа, у другой ён захварэў, а машына засталася. Акрамя таго, час не стаіць на месцы — з кожным годам на вуліцах горада павялічваецца колькасць машын. Таму цяпер не толькі кіраваць аўтамабілем стала больш складана, але і навучыць. Праўда, у маленькіх гарадах больш выпускнікоў аўташкол здаюць на правы з першага разу, чым у Мінску.

— У Мінску святлафоры на кожным кроку, і інтэнсіўнасць руху не тая, што ў нас, — кажа Анатоль Шалак. — Ведаеце, і гэта не сакрэт, што не кожны чалавек, які атрымаў правы, зможа ехаць па Мінску. Тут маецца яшчэ і псіхалагічны бар'ер.

— Ведаеце, нельга даць адназначны адказ на ваша пытанне, — кажа **старшыня Маскоўскай раённай арганізацыйнай структуры ДТСААФ горада Мінска Аляксей ЖУКАВЕЦ**. — Я сказаў бы, што тут адна прычына накладаецца на другую. Па-першае, цяпер адчыняюцца адна за адной прыватныя аўташколы. І, на жаль, не ўсе з іх могуць пахваліцца тэхнічнай базай, спрактыкаванымі выкладчыкамі. Па-другое, не вельмі спрыяе паспяховай здачы, на мой погляд, тое, што ўсе тры экзамены прымаюцца ў адзін дзень. Добра было б іх размежаваць: тэорыю здаваць сёння, а практыку — на наступны дзень. Акрамя таго, можна было б павялічыць колькасць гадзін на практычнае ваджэнне. Бо тэсты можна парашаць самастойна дома на камп'ютары. Апошняя прапанова датычыцца ў большасці Мінска, бо, напрыклад, у Бабруйску, дзе ўсяго 5 святлафораў, здаць ваджэнне па горадзе не так складана.

— На мой погляд, многія выпускнікі аўташкол проста не могуць справіцца з хваляваннем на экзамене, — дадае **намеснік старшыні цэнтральнага савета ДТСААФ па падрыхтоўцы спецыялістаў масавых тэхнічных прафесій Мікалай КЛІМОВІЧ**. — Акрамя таго, сёння ідуць здаваць на правы ўсе, у каго ёсць грошы. Нядрэнна было б праводзіць нейкі прафесійны адбор (бо кіроўца — гэта адказная прафесія) сярод людзей, якія праявілі жаданне вучыцца. Проста ёсць людзі рассеяныя, павольныя, якім я не рэкамендаваў бы садзіцца за руль. Бо вы ж самі бачыце, якая сёння інтэнсіўнасць руху на дарогах сталіцы. Што ж датычыцца больш дробных населеных пунктаў, то тут прычына большасці правалаў у тым, што вучацца яны ў адных умовах, напрыклад, у Лельчыцах, а здаваць на правы павінны ехаць у Мазыр. Але ўсё ж такі асноўную прычыну, на мой погляд, кожны павінен шукаць у сабе. Бо некаторыя, як і ў студэнцкія гады, спадзяюцца на авось, дакладаюць падручнік з ПДР на апошнія два тыдні. Спадзяюцца, што за гэты час усё паспеюць вывучыць. Але супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, якія штодзень выязджаюць на ДТЗ, у адрозненне ад апошніх, ведаюць, што машына не цацка, і своечасова адсейваюць бракаваных выпускнікоў.

— Сапраўды, браку не месца на дарозе, — падвёў высновы **спецыяліст па прапагандзе тэхнічных, авіяцыйных, ваенна-прыкладных відаў спорту ДТСААФ Усевалад ТАНАНА**. — Калі граматычную ці лексічную памылку, гэта кажу як філолаг, выправіць у большасці выпадкаў нескладана, то жыццё пешахода, які загінуў па віне гора-кіроўцы, не вернеш.

Бернардзій КІСЕЛЬ у свае 61 паказвае высокія вынікі. Ёсць чаму ў яго павучыцца маладым майстрам.

Майстры вытворчага навучання кіраванню механічнымі транспартнымі сродкамі з Гомеля ў чаканні вынікаў спаборніцтва.

Надзея ДРЫЛА, фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Каля маці не прападзеш.

ШЭСЦЬ СТАГОДДЗЯЎ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

Ці пазнаеце Ямелю? Ён жыве ў Белавежскай пушчы.

600-ГОДДЗЕ ўвядзення запаведнага рэжыму ва ўнікальным прыродным комплексе адзначае ўвесь свет

З Белавежскай пушчай у кожнага з нас свае адносіны: хтосьці бываў тут неаднойчы, а хтосьці толькі марыць патрапіць у гэтыя мясціны. Тым не менш, можна з упэўненасцю сцвярджаць: дзівосны куток нікога не пакіне раўнадушным. Гэта гонар і слава Беларусі, яе візітная картка і адметнасць, нацыянальны сімвал — такія эпітэты неаднойчы даводзілася чуць у дачыненні да Белавежскай пушчы. Напэўна ж, адпаведныя вызначэнні справядлівыя, бо не кожная дзяржава можа пахваліцца ўнікальнымі мясцінамі, якія б прыцягвалі ўвагу навукоўцаў, турыстаў, ды і проста аматараў прыроды літаральна з усіх куткоў свету.

Беларусі ў гэтым сэнсе сапраўды пашанцавала — багацце і разнастайнасць прыроднага комплексу ўражваюць многіх. Прычым адзін з пазітыўных момантаў, які адзначаюць многія з гасцей нашай краіны, — клапатлівае, гаспадарскае, нават шмат у чым пяшчотнае стаўленне да роднай прыроды. Прычым такое стаўленне можна лічыць адным з найважнейшых кірункаў дзяржаўнай палітыкі, паколькі ў Беларусі створана дзейсная прыродаахоўная сістэма, якая ў першую чаргу накіравана на тое, каб захаваць адметнасць і разнастайнасць флоры і фаўны краіны.

Гэтая прынцыповая пазіцыя, безумоўна, заслугоўвае ўвагі, яна сапраўды запатрабаваная часам. Страціць такое багацце можна вельмі хутка, а на тое, каб яго аднавіць, неабходны будуць многія дзесяцігоддзі. Прынамсі, аб гэтым сведчыць не толькі вопыт іншых краін, а і многае з айчыннай гісторыі. Нездарма сёлета ў нашай краіне абвешчаны Год роднай зямлі.

Начальнік турыстычна-экскурсійнага аддзела Яўгенія ІВАНЮК.

У цэнтры ўвагі, без перабольшвання, усяго свету — 600-годдзе ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы. З гэтай нагоды 3 кастрычніка тут адбудуцца ўрачыстыя мерапрыемствы з удзелам прадстаўнікоў шэрагу дзяржаў. Напярэдадні адметнай даты карэспандэнты «Звязды» завіталі ў самы стары лес Еўропы.

ТАЯМНІЦЫ КОЛІШНЯГА «ВОСТРАВА»

Здавалася б, Белавежская пушча — бадай што самы вядомы край нашай дзяржавы, можна сказаць, нацыянальны брэнд. І вывучаныя гэтыя мясціны вельмі добра, паколькі заўжды прыцягвалі да сябе вялікую ўвагу. Але гэта толькі на першы погляд, што можам засведчыць з поўнай упэўненасцю. Ужо колькі разоў тут выпадала бываць, а пушча кожны раз адкрывае ўсё новыя дзівосы.

Вядома, што ў старажытнасці падчас вясновай паводкі прастора вакол Белавежскай пушчы ператвараласяў ў бяскрайняе мора. Над ім, як сапраўдны востраў, узвышаўся лясны масіў, дзе жывёлы ратаваліся ад «вялікай вады». Багацце жывёльнага свету гэтых мясцін прываблівала ў пушчу паляўнічых. Наяўнасць воднага шляху з Балтыйскага ў Чорнае мора (з варагаў у грэкі, як яго яшчэ называлі), вялікая колькасць звяроў і крэмнію стварала добрыя ўмовы для жыцця людзей, якія сяліліся ўздоўж рэк. Зараз аб гэтых часах нагадваюць старажытныя пахаванні.

Генеральны дырэктар Мікалай БАМБІЗА.

— Пастаянна вядуцца археалагічныя раскопкі і гэтыя даследаванні маюць цікавыя вынікі, — заўважае генеральны дырэктар нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Мікалай Бамбіза. — Дакладна вызначана: людзі сяліліся тут 10-12 тысяч гадоў таму. Значыць, ужо тады месца было спрыяльнае для жыцця. Але вы ніколі не задумваліся аб тым, чаму такія ўмовы захоўваліся ў гэтых мясцінах на працягу нават не стагоддзяў, а многіх тысячагоддзяў? Лес можна пасадзіць і на полі, праз сто гадоў гэта будзе добры лес. Але там не будзе тых мікраарганізмаў, якія ёсць у пушчы. Таксама не будзе таго багацця і біялагічнай разнастайнасці раслін і жывёл, што існуюць у натуральным лесе, які на працягу многіх тысячагоддзяў развіваўся па сваіх законах, паколькі такія ўмовы фарміраваліся на працягу вельмі доўгага часу і не парушаліся чалавекам. Напэўна, гэта адзін з найбольш важных момантаў, які падкрэслівае ўнікальнасць прыроднага комплексу.

Першыя згадкі аб лясах, якія знаходзяцца ў раёне сучаснай Белавежскай пушчы, можна знайсці ў «бацькі гісторыі» Герадота (485-425 гг. да н. э.), а яшчэ ў Плінія (23-79 гг.) і Тацыта (55-120 гг.). Таксама гэтыя мясціны ўзгадваюцца і ў вядомым Іпацьеўскім летапісе (983 г.). Кіеўскія летапісы згадваюць аб племені яцвягаў, якія займаліся паляваннем і рыбнай лоўляй. Гэты ваяўнічы народ неаднойчы рабіў набегі на суседнія землі.

У XII стагоддзі на тэрыторыі пушчы падоўгу жыў Уладзімір Манамах, які паляваў на зуброў, тураў і аленяў. У 1276 годзе князь Уладзімір Валынскі заснаваў тут горад-крэпасць Камянец. З Белай вежай, што пабудавана ў горадзе, многія звязваюць паходжанне назвы Белавежская пушча, хоць гэта далёка не адназначна. Існуе больш за дзесяць розных версій.

Сярод іх вельмі прывабная сваёй абгрунтаванасцю версія, звязаная з полаўцамі. Іх стойбішчы называліся вежамі. Туды яны звозілі палонных і нарабаванае дабро. Слова «белы» мае значэнне яшчэ і «новы». Паколькі існаванне полаўцаў у раёне Белавежскай пушчы — гістарычна даказаны факт, то спалучэнне гэтых слоў магло абазначаць «новае паселішча», што вельмі верагодна. Ёсць і іншыя версіі — напрыклад, раней паселішчы называлі «весямі», а паселішчы нашых продкаў — «весямі белых людзей», альбо «белымі весямі». Мабыць, праз пэўны час гэтае словазлучэнне і трансфармавалася ў «белыя вежы». Адсюль і назва легендарнай пушчы. Само ж словазлучэнне «Белавежская пушча» ўпершыню з'явілася ў польскіх і літоўскіх граматах 1409 года і з таго часу трывала ўвайшло ва ўжытак.

Намеснік генеральнага дырэктара Васіль АРНОЛЬБІК з захапленнем распавядае пра пушчанскае жыццё.

Менавіта гэтая дата прызнана даследчыкамі за пачатак запаведнасці пушчы. Напярэдадні Грунвальдскай бітвы кароль Ягайла загадзя нарыхтоўваў у тутэйшых лясах дзічыну. Жывёлы тут было багата, аднак калі яе знішчаць бяздумна, то што застанецца праз колькі гадоў? Аб гэтым і задумаліся тагачасныя ўладары. Адпаведна, былі ўведзены пэўныя абмежаванні. Напэўна, гэта быў той самы шанц на будучыню для Белавежскай пушчы, дзякуючы чаму ўдалося захаваць у непарушным стане гэты легендарны край. Цікава, што на здымках з космасу пушча выглядае, быццам той самы зялёны «востраў», якім яна была падчас вялікай паводкі ў старажытнасці...

ВЫРАТАВАННЕ СПАДЧЫНЫ

Аднак варта памятаць: 600 гадоў таму былі ўведзены толькі элементы запаведнага рэжыму. Можна знайсці шмат сведчанняў аб тым, як у розныя часы актыўна выкарыстоўваліся прыродныя рэсурсы гэтых мясцін. Так, пры каралі Сігізмундзе Аўгусце пабудавалі чатыры заводы па вытворчасці жалеза, паташу, таксама ўзвялі смалакурні, гналі дзёгаць, выпальвалі вугаль, паспрабавалі сплаўляць лес. Дарэчы, такая сітуацыя была характэрная і надалей. Аб маштабах яскрава сведчыць, напрыклад, такі факт: у 1839 годзе для патрэбаў рускага флоту былі ссечаны 2834 дубы-волаты. Падчас Першай сусветнай вайны пушча знаходзілася пад нямецкай акупацыяй. Немцы актыўна высякалі высокаўзроставыя лясы. Разгарнуліся шырока — для перапрацоўкі драўніны былі пабудаваныя чатыры лесапільныя заводы, а для яе вывазу пракладзена каля 300 кіламетраў вузкакалейнай чыгункі. Толькі за два гады ў Германію было вывезена 4,5 мільёна кубаметраў драўніны. Разам з тым, варта ўзгадаць, што ў розныя часы прымаліся і акты па абароне лясоў.

Калі ў 1939 годзе Белавежская пушча ўвайшла ў склад Беларускай ССР, то была адразу аб'яўлена дзяржаўным запаведнікам. У яго склад увайшоў увесь лясны масіў, а таксама лугавая гаспадарка і Свіслацкая лясная дача. Праз пэўны час была прынята спецыяльная пастанова, у адпаведнасці з якой прадугледжвалася поўная запаведнасць усёй гэтай тэрыторыі. Так здарылася, што падчас Другой сусветнай вайны пушча не пацярпела, паколькі па асабістай ініцыятыве Герынга вырашана было стварыць тут узорную паляўнічую гаспадарку для самых тытулаваных асобаў рэйха. У кастрычніку 1944 года, пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Маскве адбылася міжурадавая савецка-польская сустрэча. Па яе выніках падпісана гістарычнае пагадненне, у адпаведнасці з якім дзяржаўная мяжа падзяліла Белавежскую пушчу на беларускую і польскую часткі.

Знатны тын майструюць Віктар ХВІСЮК і Уладзімір ЮРЭВІЧ.

На нашай тэрыторыі была працягнутая дзейнасць запаведніка, які ў 1957 годзе быў рэарганізаваны ў Ардынацыя каралеўскіх пушчаў, што была арганізавана ў 1639 годзе, сваёй галоўнай мэтай мела вызначэнне стану пушчы і магчымасцяў больш інтэнсіўнай яе эксплуатацыі.

Напрыканцы васемнаццатага стагоддзя Кацярына II дазволіла тут паляваць на ўсіх жывёл, за выключэннем, праўда, зуброў (якіх, аднак, адстрэльвалі для шматлікіх еўрапейскіх музеяў). У выніку колькасць звяроў значна скарацілася, а мядзведзі і бабры былі поўнасцю знішчаны. Кацярына II, а пасля і Павел I, раздалі фаварытам значную частку пушчы, што нанесла ёй урон (каб атрымаць максімальны даход, зноў-такі праводзілася высечка лесу — праўда, пры Кацярыне II і Паўле I не вельмі значная).

Дзяржаўную запаведна-паляўнічую гаспадарку.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у верасні 1991-га на яе базе створаны Дзяржаўны нацыянальны парк «Белавежская пушча». Дарэчы, першы ў нашай краіне. Яго тэрыторыю падзялілі на функцыянальныя зоны, што дало магчымасць прымяняць не толькі пасіўныя, а і актыўныя метады аховы папуляцый раслін і жывёл. А 27 верасня 2004 года адбылася знамянальная падзея — кіраўніком дзяржавы было зацверджана Палажэнне аб Нацыянальным парку «Белавежская пушча». Гэтым дакументам нацпарк вызначаны як «асабліва ахоўваемая тэрыторыя рэспубліканскага значэння. Ён створаны для захавання ў натуральным стане і комплекснага вывучэння эталонных і ўнікальных прыродных комплексаў і аб'ектаў Белавежскага першабытнага лесу, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці тэрыторыі, аднаўлення парушаных прыродных комплексаў і аб'ектаў, якія маюць асаблівую экалагічную, гісторыка-культурную і эстэтычную каштоўнасць, а таксама іх устойлівага выкарыстання ў прыродаахоўных, навуковых, асветніцкіх, аздараўленчых, рэкрэацыйных і іншых мэтах». У гэты ж час была амаль удвая павялічана тэрыторыя нацпарку, што дазваляе лепш захоўваць яго прыродныя комплексы.

— Такі падыход быў апраўданы — гэта праверана часам, — заўважае Мікалай Бамбіза. — Удалося выратаваць нацыянальную спадчыну сусветнага маштабу. У кнізе водгукаў адзін расійскі дэпутат нават запісаў: «Дзякуй беларусам, што яны захавалі Белавежскую пушчу — унікальны здабытак чалавецтва».

БУДУЧЫНЯ СТАРОГА ЛЕСУ

600-годдзе запаведнасці Белавежскай пушчы сёлета адзначаецца ва ўсім свеце — адпаведная дата вызначана на ўзроўні ЮНЕСКА. Шматлікім гасцям ёсць на што паглядзець, таму трапіць сюды імкнуцца многія. Колькасць турыстаў апошнім часам значна павялічваецца: калі ў 2006-м пушчу наведалі каля 180 тысяч чалавек, то ў мінулым годзе — ужо 287 тыс. Сёлета станоўчая дынаміка захоўваецца: людзі актыўна наведваюць самы стары лес Еўропы.

Дарэчы, пра тытулы. Вядома, што 14 снежня 1992 года ўчастак высокаўзроставага лесу нацыянальнага парку быў уключаны ў спіс Сусветнай Спадчыны Чалавецтва. На той час гэта быў першы аб'ект на тэрыторыі былога Савецкага Саюза, які атрымаў такое высокае званне. На наступны год, у 1993-м, Белавежская пушча справядліва атрымала міжнародны статус біясфернага запаведніка. Напрыканцы 1997 года Савет Еўропы ўзнагародзіў Белавежскую пушчу Еўрапейскім дыпломам як адну з эталонных прыродаахоўных установаў на кантыненце. Усяго два нацыянальныя паркі на планеце маюць узгаданыя вышэй тытулы.

— Прымаюцца значныя ініцыятывы па ўзмацненні іміджу пушчы ў сусветнай стратэгіі аховы прыроды, развіцці міжнароднага супрацоўніцтва, — адзначае намеснік генеральнага дырэктара нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Васіль Арнольбік. — У тым ліку гэта датычыцца прасоўвання прыроднага комплексу як адзінай трансмежнай тэрыторыі паміж Польшчай і Беларуссю. Летась у Белавежскай пушчы працавалі эксперты ЮНЕСКА і МСАП (міжнароднага саюза аховы прыроды). Спецыялісты рэкамендавалі ўдакладніць межы аб'екта ў больш пашыраным варыянце. Існуюць крытэрыі, па іх можна дадаткова вылучаць пушчу як сусветную спадчыну па іншых намінацыях.

Гэта сапраўднае прызнанне той значнай работы, якая тут праводзіцца, а таксама вялікая адказнасць за лёс прыроднага унікума. Падыход «дзве краіны — адна пушча» заўжды падтрымліваўся нашай дзяржавай.

Апошнім часам значна палепшылася інфраструктура для прыёму турыстаў. Да святкавання 600-годдзя ўвядзення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы будзе здадзены ў эксплуатацыю шэраг адметных аб'ектаў — эколага-адукацыйны цэнтр, рэстаран, гасцініцы, сучасны адміністрацыйны цэнтр. Такім чынам, можна будзе не толькі з камфортам адпачыць, а і наладзіць мерапрыемствы розната ўзроўню (канферэнцыі, семінары і г.д.). Праведзена грунтоўнае добраўпарадкаванне, узведзены амаль тры дзясяткі камфартабельных катэджаў, якія атрымаюць работнікі нацпарку. Гэта добры рэсурс для прыцягнення працоўнай змены — маладых спецыялістаў. Днямі будзе адчынена новая Свята-Георгіеўская царква, якая будавалася за кошт сродкаў нацыянальнага парку.

— Неабходна стварыць усе ўмовы не толькі для турыстаў, а і для мясцовых жыхароў, — перакананы Мікалай Бамбіза. — Увогуле прыродаахоўны рэжым на тэрыторыі пушчы з цягам часу будзе больш жорсткі. Нават прапрацоўваецца варыянт выкарыстання транспарту з электрацягай. Трэба звесці да мінімуму ўздзеянне на прыроду, каб захаваць у непарушным стане гэтыя ўнікальныя мясціны для нашчадкаў.

Святкаванне 600-годдзя ўсталявання запаведнага рэжыму адбудзецца 3 кастрычніка на знакамітай «царскай паляне». У гэтым месцы калісьці любілі адпачываць каранаваныя асобы. Таму ўрачыстыя мерапрыемствы, думаем, запомняцца іх удзельнікам надоўга. Віншуем, Пушча...

«Царская паляна» чакае гасцей на вялікі юбілей пушчы.

Захар БУРАК.
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНП 200056212.

ДОМ «НА ХАЛЯВУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Грошы ёсць. Што далей?

Далей пачалося самае складанае. Самастойныя пошукі падрадчыка на будаўнічыя работы сярод дзяржаўных прадпрыемстваў вынікаў не далі. Шматдзетны бацька вырашыў тады звярнуцца па дапамогу ў Гомельскі гарвыканкам.

— Мне адказалі: «Вы можаце пісьмова звярнуцца па дапамогу ў Гомельскае гарадское ўпраўленне капітальнага будаўніцтва. Магчыма, яны пагодзяцца».

Не пагадзіліся. Дырэктар УКБ Гомельскага гарвыканкама Ігар Адарчанка тлумачыць сітуацыю двухгадовай даўніны і гаворыць, што сёння яна мала ў чым змянілася:

— У нас аб'ёмы растуць і растуць. На наступны год яшчэ на 60 % большыя аб'ёмы. Мы займаемся шматпавярховым будаўніцтвам і выконваем дзяржаўную праграму, даведзеную Саўмінам для ўсёй Гомельскай вобласці.

— Атрымліваецца, іншую дзяржаўную праграму можна праігнараваць, і шматдзетныя сем'і асуджаны шукаць прыватных падрадчыкаў?

— Так. Падрадныя арганізацыі зацікаўленыя будаваць мікрараёнамі. Кожнае прадпрыемства хоча, каб праца была больш выгаднай і рэнтабельнай для яго.

Намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама Ядзвіга Блатун праблему бачыць пад іншым вуглом. — Ніхто не адмаўляецца ад таго, што мы павінны дапамагаць шматдзетным сем'ям. Дамы сядзібнага тыпу будуюцца звычайна для шматдзетных, але ў Нараўлянскім, Хойніцкім і іншых раёнах. Гэтыя праблемы ў Гомелі ўзніклі таму, што няма такой практыкі і будаўніцтва ім такое нявыгаднае: не хочуць адцягваць сілы на дробныя аб'ёмы. Гарадскія ўлады маглі б умяшацца... УКБ — гэта ж іх падраздзяленне.

Калі айцец Уладзімір пачаў самастойны пошук будаўнікоў — ужо не толькі сярод дзяржаўных, але і сярод прыватных прадпрыемстваў, — ён пачуў тую ж песню:

— Адмовы былі такія: «Аб'ём работ вельмі малы, у нас вельмі загружана прадпрыемства, вы аплачваць будзеце не наяўнымі грашыма...» Нарэшце ўдалося дамовіцца і заключыць 28.02.2008 г. дагавор будаўнічага падраду толькі на фундамент — з БМП-354. Згодна з ім пачатак работ — сакавік 2008-га, заканчэнне — красавік 2008-га. Фактычна работы былі пачатыя 8 мая 2008, а закончаны 21 жніўня 2008 года.

Айцец Уладзімір расказвае, што менавіта тады ў іх узнікла шмат прэтэнзій да першага падрадчыка па якасці выкананых работ. Пасля адмовы падпісаць сумнеўныя, на погляд заказчыка, працэнтоўкі, адносіны з будаўнічым прадпрыемствам зусім сапсаваліся. У выніку шматдзетная сям'я зноў засталася без падрадчыка. Між іншым, толькі ў працэсе будаўніцтва Драбышэўскія даведаліся аб тым, што, магуць наняць Тэхнічны нагляд, аплата паслуг якога будзе ўключана ў крэдыт. Тым не менш іх зварот у Дзяржбуднагляд зноў-такі быў безвыніковым — тыя былі таксама загружаныя работай. Пошук новага падрадчыка пачаўся тады, калі Марына ўжо чакала пятае дзіця.

— І зноў мы звярнуліся ў УКБ, — гаворыць айцец Уладзімір, — дзе зноў атрымалі адмову са спасылкай на іх загружанасць і нашы малыя аб'ёмы працы. Па даведніку знайшлі ППТУП «Контур Плюс», з якім і заключылі новы дагавор будаўнічага падраду з тэрмінам заканчэння работ 31 снежня 2008 года.

Чытач павінен здагадацца, што гэтай публікацыі проста не было б, калі б дагавор быў выкананы.

— Мы пайшлі насустрач Драбышэўскім і ўзялі аб'ект, які нам не выгадны і не патрэбны, — кажа кіраўнік прыватнага прадпрыемства «Контур Плюс» Аляксандр Сідарок, спасылаючыся на тое, што на момант заключэння дагавору не было дакладнай праектнай дакументацыі.

Спачатку — так, але ж у маі 2008 года ЗАТ «Тэрмікс» выканала яе бязвыплатна. Да верасня адначасова напісаў у нашу газету. У лісце — дакладна так: мы просім аб дапамозе.

Віг — вам?

Намаляваныя казачныя героі сустракаюць кожнага, хто прыходзіць да Драбышэўскіх — прама на брамцы. Настрой узнімаецца і тады, калі бачыш амаль што сапраўдны вігвам, пашыты і размаляваны рукамі маці пецярых дзяцей. На пытанне, калі яна гэта паспявае, Марына адказвае:

— Па начах, калі ж яшчэ.

У гэтай сям'і ёсць свой герб і сцяг, тут вечарамі разам чытаюць класікаў літаратуры, і ў мяне з'явілася моцнае жаданне расказаць аб звычайным дні і клопатах гэтай цудоўнай шматдзетнай праваслаўнай сям'і. Але ж іх сённяшнія турботы з будаўніцтвам дома перакрываюць мае лірычныя пачуцці. Таму зноў аб праблемах.

У самым пачатку верасня непасрэдна на будоўлі была сабраная нарада з удзелам прадстаўнікоў Гомельскага гарвыканкама. Аднаго з іх я папрасіла аб каментарыі, але ён адмовіўся размаўляць са мной. Больш за тое, ён увогуле не палічыў неабходным адрэкамендавацца. Таму гэты прадстаўнік улады застаўся для мяне як вобраз маладога вытанчанага мужчыны, апранутага ва ўсё белае. Другі адрэкамендаваўся як галоўны спецыяліст аддзела па кіраванні будаўнічым комплексам і жыллёвай палітыцы Гомельскага гарвыканкама Раман Аўтухоў, адкнак быў сціплы на каментарыі і запэўніў, што ўсё будзе ў пісьмовым адказе на скаргу. Пісьмовы адказ уяўляе саб ой сціслы канспект юрыдычных адносінаў Драбышэўскіх з прыватнай арганізацыяй «Контур Плюс» і прапанову падаць на яе ў суд.

І зноў айцец Уладзімір пайшоў на прыём да намесніка старшыні аблвыканкама Уладзіміра Надтачаева.

Як палітычную задачу вырашыць юрыдычна?

Гэты візіт быў куды больш выніковым. Бо праз некалькі дзён непасрэдна на будоўлі дома для Насці, Колі, Васілісы, Варвары, Арыядны і іх бацькоў сабралася вельмі прадстаўнічая нарада з удзелам прадстаўнікоў камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама, упраўлення капітальнага будаўніцтва Гомельскага гарвыканкама, ААТ «Беларусбанка», а таксама ўсіх падрадчыкаў і праекціроўшчыкаў.

Дырэктар УКБ Гомельскага гарвыканкама Ігар Адарчанка наўскідку ацаніў якасць таго, што набудавана, так:

— Сёння дом гатовы не больш чым на 30 %. Для таго, каб гаварыць аб працягу будаўніцтва, тое, што ёсць, неабходна часткова разабраць і прывесці ў адпаведнасць з нормамі.

Між тым, Драбышэўскія сталі хвалявацца менавіта таму, што самі даўно ўбачылі парушэнні нормаў будаўніцтва. Айцец Уладзімір водзіць па будоўлі і ў соты раз паказвае:

— Ні адзін від работ не завершаны. Зімой у маразы залівалі фундамент у мёрзлую зямлю. Тут жа скразныя дзіркі ў сценах! А нам адказваюць: гэта нармальна, потым затынкуецца. Бэлькі гніюць непрапітаныя... Запрацэнтавана сетка арміравальная — яе не могуць знайсці. Работы ідуць з парушэннем парадку: даху няма — пачынаюць падшываць столь... У лютым нам сказалі, што яны будуць унутры тынкаваць сцены. Калі мы не дазволілі, у адказ пачулі: вы звязваеце нам рукі, перашкаджаеце будаваць, мы пойдзем з аб'екта. Быццам мы ў пясочніцы гуляемся ў кулічыкі.

Намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага аблвыканкама Ядзвіга Блатун вырашэнне заблытанай праблемы — заканчэнне будаўніцтва дома Драбышэўскіх — бачыць як першачарговую неабходнасць, і дзякуючы яе актыўнаму ўмяшальніцтву ёсць пакуль прамежкавыя, але ж вынікі:

— Як юрыдычна вырашыць палітычную задачу — пабудаваць дом для шматдзетнай сям'і? Як хутчэй гэта зрабіць? Мы дамовіліся, што праектна-каштарысная дакументацыя павінна быць да 30 кастрычніка. Пасля яе атрымання будзе працягвацца льготнае крэдытаванне гэтага дома.

З ёй згодная і начальнік аддзела арганізацыі работ па крэдытаванні насельніцтва Гомельскага абласнога ўпраўлення АСБ «Беларусбанк» Ядзвіга Вежнавец:

— Трэба зрабіць так, як хоча сям'я. У нас у Гомелі толькі адна шматдзетная сям'я зараз будуе дом па льготным крэдыце, ну, як ёй не дапамагчы?

Згодна з пратаколам выязднога разгляду звароту ў Гомельскі аблвыканкам па пытанні будаўніцтва індывідуальнага жылога дома, зацверджаным старшынёй камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Гомельскага гарвыканкама Уладзімірам Гарбачовым, адпаведным службам дадзены даручэнні. Цытую дакумент:

«1. Да 5 кастрычніка 2009 года філіалу № 300 Гомельскага абласнога ўпраўлення ААТ «Беларусбанк» правесці кантрольныя абмеры аб'ёмаў і якасці выкананых будаўніча-мантажных работ.

2. ПУП «Архітэктурная майстэрня» скараціць тэрмін выпуску праектна-каштарыснай дакументацыі да 30 кастрычніка.

3. Філіалу № 300 Гомельскага абласнога ўпраўлення ААТ «Беларусбанк» пасля атрымання праектна-каштарыснай дакументацыі зрабіць перараэлік памеру крэдытнай лініі — да 10 лістапада 2009 года.

4. Да 15 лістапада 2009 года Гомельскаму гарвыканкаму сумесна з упраўленнем капітальнага будаўніцтва гарвыканкама пасля атрымання праектна-каштарыснай дакументацыі разгледзець пытанне перадачы функцый заказчыка па будоўлі дома ўпраўленню капітальнага будаўніцтва Гомельскага гарвыканкама.

5. ППТУП «Контур Плюс» пасля правядзення «Беларусбанкам» кантрольных абмераў у выпадку выяўлення заўваг па будоўлі дома ліквідаваць іх да 20 кастрычніка 2009 года, а пасля атрымання праектна-каштарыснай дакументацыі ліквідаваць будаўнічыя недароблі да 15 лістапада 2009 года».

P.S.

Задаю маці вялікай сям'і Марыне Драбышэўскай правакацыйнае пытанне: можа, трэба было згадзіцца на кватэру, іх шматдзетным у Гомелі куды лягчэй атрымаць? Яна адказвае адназначна адмоўна.

— Дзяцей лягчэй да самастойнасці прывучыць, калі ёсць свой дом, а не кватэра. Ды і мне больш зручна — яны ж гуляюць на маіх вачах усе, тут, у дварэ — не страшна за іх.

Відаць, у гэтай гісторыі працяг будзе. І так хочацца спадзявацца, што, даведаўшыся аб тым, колькі каштуе дом «на халяву» ў абласным цэнтры, нямногія пагодзяцца паўтарыць шлях сям'і Драбышэўскіх і нараджаць дзетак — як Бог дае.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДЕПАРТАМЕНТ
ПО ЦЕННЫМ БУМАГАМ
Министерства финансов
Республики Беларусь
ЗАВЕРЕНО
«29» сентября 2009 г.
_____ Кулаженко В.Г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
об открытой продаже облигаций Витебского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Витебскэнерго» второго выпуска

1. Наименование эмитента
Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго» (РУП «Витебскэнерго»).

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Место нахождения: Республика Беларусь, 210029, г. Витебск, ул. Правды, 30.
Телефон: (0212) 47 45 80.
Электронный адрес E-mail: energo@vitebsk.energo.net.by.
УНП 300000252, ОКПО 001040302000.

3. Основные виды деятельности
Производство электроэнергии тепловыми электростанциями (40111);
производство электроэнергии прочими электростанциями (40114);
передача электроэнергии (40120);
распределение электроэнергии (40131);
продажа электроэнергии (40132);
производство тепловой энергии тепловыми электростанциями, самостоятельными котельными, прочими источниками (40301);
передача и распределение тепловой энергии тепловыми сетями (40302);
теплоснабжение (40303).

4. Сумма зарегистрированного уставного фонда
Уставный фонд РУП «Витебскэнерго» составляет 9 000 000 (Девять миллионов) белорусских рублей.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством Республики Беларусь, и сроки ее публикации
Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках РУП «Витебскэнерго» ежегодно будет публиковаться в газете «Звязда» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.
Бухгалтерский баланс на 1 января 2009 года и отчет о прибыли и убытках за 2008 год РУП «Витебскэнерго» опубликованы «22»09.2009 г. в газете «Советская Белоруссия».

6. Сведения о проведении открытой продажи облигаций второго выпуска

6.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о втором выпуске облигаций РУП «Витебскэнерго» для юридических лиц утверждено генеральным директором РУП «Витебскэнерго» Харитоновым П.И. от 17.09.2009 г. и согласовано Министерством энергетики Республики Беларусь от 22.09.2009 г.

6.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество и вид облигаций
Форма выпуска облигаций – бездокументарные (в виде записей на счетах).
Объем эмиссии облигаций составляет 10 000 000 000 (Десять миллиардов) белорусских рублей.
К открытой продаже предлагаются 10 000 (Десять тысяч) штук процентных облигаций.
Серия НВ, номера 00001 – 10000.
Вид облигаций – процентные, именные, неконвертируемые.

6.3. Номинальная стоимость облигации
Номинальная стоимость одной облигации – 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

6.4. Цель выпуска облигаций
Второй выпуск облигаций РУП «Витебскэнерго» осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц для пополнения собственных оборотных средств.

6.5. Период проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций осуществляется с 30 сентября 2009 г. по 30 октября 2009 г. включительно.

6.6. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций осуществляется путем проведения открытой продажи облигаций в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» и (или) на внебиржевом рынке.
Первичное размещение (продажа) облигаций на биржевом рынке производится после регистрации и допуска к размещению облигаций второго выпуска в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в установленном порядке.
Для приобретения облигаций юридические лица должны обращаться в ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, ул. Ольшевского, 24, каб. 906/2, тел.: (017) 228 51 09, 250 60 05, 228 50 08) как к профессиональному участнику рынка ценных бумаг, оказывающему услуги по размещению облигаций РУП «Витебскэнерго», в рабочие дни (кроме пятницы) с 8.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30; в пятницу с 8.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.15. При размещении облигаций РУП «Витебскэнерго» указанным профессиональным участником рынка ценных бумаг денежные средства, направляемые юридическими лицами на покупку облигаций, перечисляются в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь на счет № 3811009640025 в ОАО «Белагропромбанк», код 964.
Для приобретения облигаций на внебиржевом рынке юридические лица также вправе обратиться к РУП «Витебскэнерго» (г. Витебск, ул. Правды, д. 30, тел.: (0212) 47 45 80, 47 32 74) в рабочие дни с 10.00 до 15.00. В случае размещения РУП «Витебскэнерго» облигаций на внебиржевом рынке денежные средства, направляемые юридическими лицами на покупку облигаций, перечисляются в безналичном порядке на текущий (расчетный) счет РУП «Витебскэнерго» № 3012206110020 в филиале ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление, код 424, в соответствии с законодательством Республики Беларусь и соответствующим договором.
Открытая продажа облигаций на внебиржевом рынке проводится путем заключения договоров купли-продажи облигаций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В день начала реализации облигации размещаются по цене равной номинальной стоимости.

Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного купонного дохода со дня начала размещения облигаций по день, предшествующий фактической продаже облигации включительно, рассчитываемой по следующей формуле:

$$Дн = [\frac{Н \times Пд1}{100} \times \frac{Т1}{365}] + [\frac{Н \times Пд2}{100} \times \frac{Т2}{365}] + \ldots + [\frac{Н \times Пдn}{100} \times \frac{Тn}{365}],$$

где:
Дн – величина накопленного купонного дохода;
Н – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, Пдn – установленная условиями выпуска ставка процентного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 5 (пять) процентных пунктов;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления купонного дохода.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица – резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

6.7. Срок и порядок обращения облигаций
Срок обращения облигаций – 365 календарных дней с 30 сентября 2009 г. по 30 сентября 2010 г. Для расчета срока обращения облигаций день начала размещения облигаций и день начала погашения облигаций считаются одним днем.
Обращение облигаций РУП «Витебскэнерго» осуществляется на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) на биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа». Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за 5 (Пять) рабочих дней до даты выплаты купонного дохода. Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую 5 (Пяти) рабочим дням дате досрочного погашения облигаций.

6.8. Дата начала погашения облигаций
Датой погашения облигаций РУП «Витебскэнерго» является 30 сентября 2010 года.

6.9. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Выплата дохода по облигациям производится ежеквартально в виде купонного дохода в соответствии с графиком выплаты купонного дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется депозитарием РУП «Витебскэнерго» за 5 (Пять) рабочих дней до даты выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период.
График выплаты купонного дохода по облигациям:

Номер купона (процентного дохода)	Начало периода	Конец периода	Продолжительность периода, дней	Дата выплаты дохода
1	30.09.2009	31.12.2009	93	01.01.2010
2	01.01.2009	31.03.2010	90	01.04.2010
3	01.04.2010	30.06.2010	91	01.07.2010
4	01.07.2010	29.09.2010	91	30.09.2010
Итого:			**365**	

В случае, если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму купонного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящем решении понимаются выходные дни, государственные праздники и праздничные дни, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Купонный доход по процентным облигациям за первый купонный период начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций, по дату выплаты купонного дохода за первый купонный период. Для расчета первого купонного периода день начала размещения облигаций и день выплаты дохода за первый купонный период считаются одним днем. Купонный доход по процентным облигациям за последующие купонные периоды начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период, по дату выплаты дохода за соответствующий период (дату погашения). Для расчета купонных периодов день выплаты дохода за предшествующий период и день выплаты дохода за второй купонный период (дата погашения) считаются одним днем.
Начисление купонного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций купонный доход не начисляется. При начислении купонного дохода принимается точное количество дней в году (365 дней).
Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с настоящим решением, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) плюс 5 (Пять) процентных пунктов.
Расчет купонного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дп = [\frac{Н \times Пд1}{100} \times \frac{Т1}{365}] + [\frac{Н \times Пд2}{100} \times \frac{Т2}{365}] + \ldots + [\frac{Н \times Пдn}{100} \times \frac{Тn}{365}],$$

где:
Дп – величина купонного дохода;
Н – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, Пдn – установленная условиями выпуска ставка купонного дохода (в процентах годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 5 (пять) процентных пунктов;
Т1, Т2, Тn – количество дней соответствующей части периода начисления купонного дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней. При этом сумма Т1 + Т2 +…+ Тn должна быть равна количеству дней в соответствующем периоде начисления купонного дохода.

Облигации предоставляют своим владельцам право на получение купонного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении (выкупе) в белорусских рублях. Купонный доход выплачивается только за полностью истекшие купонные периоды.

6.10. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Облигации второго выпуска могут быть досрочно погашены в случае выкупа РУП «Витебскэнерго» всего объема эмиссии до наступления срока погашения облигаций.

6.11. Порядок погашения облигаций, дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Погашение облигаций производится в белорусских рублях на счета владельцев облигаций в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь на основании реестра владельцев облигаций, сформированного депозитарием РУП «Витебскэнерго» по состоянию на 23 сентября 2010 г. С 23 сентября 2010 г. сделки с облигациями РУП «Витебскэнерго» прекращаются. При погашении облигаций РУП «Витебскэнерго» выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также начисленный купонный доход за последний период (иной начисленный, но неполученный купонный доход – при его наличии).

6.12. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала их погашения
По истечении 6 месяцев с даты начала размещения облигаций в период с 05 по 09 апреля 2010 года включительно РУП «Витебскэнерго» осуществляет выкуп облигаций у любого владельца, предъявившего облигации, с целью последующей продажи на вторичном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Для досрочного выкупа облигаций их владельцы направляют в РУП «Витебскэнерго» заявление о намерении осуществить продажу облигаций, которое должно содержать:
полное наименование владельца облигаций, место нахождения, банковские реквизиты и контактные телефоны владельца облигаций;
вид облигаций;
количество облигаций, предложенных к досрочному выкупу;
наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, который будет осуществлять продажу облигаций на торгах ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (в случае осуществления досрочного выкупа облигаций через торговую систему ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»);
подпись уполномоченного лица, заверенная печатью юридического лица;
иную информацию, касающуюся досрочного выкупа облигаций, по усмотрению владельца.
В случае, если для осуществления продажи РУП «Витебскэнерго» облигаций их владельцу необходимо принятие решения соответствующего органа или получение согласования, или получение разрешения, владелец продаваемых облигаций обязан заблаговременно принять (получить) данное решение (согласование, разрешение).
Заявление о досрочном выкупе облигаций должно быть предоставлено РУП «Витебскэнерго» их владельцами не позднее 5 (Пяти) рабочих дней до предполагаемой даты выкупа облигаций.
Заявление передается в РУП «Витебскэнерго» по факсу (с обязательным последующим предоставлением оригинала), направляется письмом или передается непосредственно по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 30, тел. (0212) 47 45 80.
Выкуп облигаций осуществляется РУП «Витебскэнерго» по текущей стоимости на дату выкупа облигаций. Текущая стоимость облигаций рассчитывается по следующей формуле:

$$С = Н + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Н – номинальная стоимость облигации,
Дн – накопленный купонный доход.

6.13. Дата и номер государственной регистрации облигаций (заполняется Департаментом по ценным бумагам)
Облигации второго выпуска зарегистрированы в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 29.09.2009 г., регистрационный номер № 2-401-02-0349.

7. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета второго выпуска облигаций РУП «Витебскэнерго» Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь, РУП «Витебскэнерго» в срок не позднее 30 дней с момента принятия соответствующего решения возвращает владельцам облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения) плюс 5 (Пять) процентных пунктов.

8. Информация об обеспечении облигаций: состав и стоимость имущества, выступающего в качестве залога, основная сумма долга по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости (жилищное строительство), сведения о поручительстве, банковской гарантии
Исполнение обязательств по облигациям обеспечивается поручительством производственного Республиканского унитарного предприятия «Витебскоблгаз» (УП «Витебскоблгаз»).

9. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций)
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться в:
ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 24, каб. 906/2, тел.: (017) 228 51 09, 250 60 05, 228 50 08 в рабочие дни (кроме пятницы) с 8.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30; в пятницу с 8.30 до 12.30 и с 13.15 до 16.15.
РУП «Витебскэнерго» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, д. 30, тел. (0212) 47 45 80 в рабочие дни с 10.00 до 15.00.

Генеральный директор
РУП «Витебскэнерго» **П.И. Харитонов**

И.о. главного бухгалтера
РУП «Витебскэнерго» **В.П. Москалева**

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А,
режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел. 227 52 36, 226 03 01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.
Выполняя функции заказчика, объединением с 2004 по 2009 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:
- ул. Захарова, д. 63, ул. Захарова, д. 67, корп. 1, ул. Великоморская, д. 10, ул. Великоморская, д. 12, ул. Роменская, д. 5, ул. Матусевича, д. 90, пр-т Рокоссовского, д. 78, пр-т Рокоссовского, д. 76, пр. Рокоссовского, 80, ул. Филимонова, д. 14, пр-т Независимости, д. 168, корп. 1, пр-т Независимости, д. 168, корп. 2, ул. Есенина д. 30, ул. Есенина, д. 34, ул. Есенина, д. 36, ул. Гаруна, д. 20, пр-т Независимости, д. 168, корп. 3.
Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район «Масюковщина». Микрорайон «Масюковщина-5» (2-ая очередь). Жилой дом № 16 по генплану со встроенными помещениями.
Лицензия № 02250/0264117 выдана Министерством архитектуры и строительства РБ 09.04.2007 года сроком на пять лет.
Здание жилого дома запроектировано из одной девятнадцатиэтажной секции. Количество жилых помещений жилого дома – 119. Серия дома – М 111-90.
Начало строительства – сентябрь 2009 года.
Окончание строительства – декабрь 2010 года.
Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке:
- государственную экспертизу от 25.06.2009 № 1093-5/09.
Свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 27.08.2009 г. № 500/962-1691.
Земельный участок площадью 0,62 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.
Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться как с гражданами, состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, так и с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий. При этом 50 % общей площади жилого дома предусмотрено для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.
Стоимость строительства 1 кв. метра жилых помещений в текущих ценах составляет 2 680 350 руб. – для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий; 2 807 980 руб. – для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий.
Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.
В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.
Договор строительного подряда от 09.09.2009 № 12С-09-2009.
Информацию о строительстве жилого дома и объектах долевого строительства можно получить в каб. 105, 311 по адресу: г. Минск, ул.К.Маркса, 13А.

Генеральный директор **Е.И. Вовна.**

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» 21 сентября 2009 года провело внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования по вопросу повестки дня:
«Об оказании ОАО «БПС-Банк» безвозмездной (спонсорской) помощи в 2009 году».
Итоги голосования: «за» – 838 251 081 голос (100 %), «против» – 0 голосов, «воздержались» – 0 голосов».
Решение принято единогласно.

У **суд Бабруйскага раёна і г. Бабруйска** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Вінаградава Міхаіла Мікалаевіча**, 07.10.1949 года нараджэння, ураджэнца г. Кішынёва, які пражываў па адрасе: г. Бабруйск, вул. Коўзана, д. 6, кв. 12. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Вінаградава М.М., паведаміць іх суду Бабруйскага раёна і г. Бабруйска на адрас: вул. Акцябрская, 128, кабінет 47, тэл. 52 02 62 на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Утерянные представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха и филиалом Белгосстраха по г. Минску **бланки страховых полисов** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу, **формы 2 РН, серии БЛ, с № 0647151 по № 0647153 и № 0667161, считать недействительными**.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома
Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Целевое назначение	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	Расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, руб.
1.	Земельный участок с кадастровым номером 221285905601000048 площадью 0,1395 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Койтово, ул. Парковая, д. 30А (повторный аукцион)	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Коммуникации отсутствуют. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: участок находится в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 В, в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (река Западная Двина)	386 890	38 600 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет	1 811 286	476 240
2.	Земельный участок с кадастровым номером 221280603601000043 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Новоселов, 12	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного газоснабжения и водоснабжения. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта	1 936 334	193 633 бел. руб. р/с 3600314010019 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Бабиничский сельский исполнительный комитет	2 096 554	518 393
3.	Земельный участок с кадастровым номером 221280603601000042 площадью 0,1494 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Дальняя, 11	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	Наличие централизованного газоснабжения и водоснабжения. Участок находится в радиусе до 500 метров от центра населенного пункта	1 929 874	192 987 бел. руб. р/с 3600314010019 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Бабиничский сельский исполнительный комитет	2 096 554	518 393

Дата, время и место проведения аукциона – 03.11.2009 в 15.00, г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 28.10.2009 г. до 17.30. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.
Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него.
1. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».
2. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:
- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- для представителей гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона – победителем.
3. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.
4. Победитель аукциона обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за земельный участок, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возврату не подлежат.
5. Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz, www.gki.gov.by.

POST factum

ПЕРАКЛАДЧЫК НЕ ВЫТРЫМАЎ...

Двухгадзіннае выступленне лівійскага лідара Муамара Кадафі на Генасамблеі ААН адабрала ўсе сілы ў яго нага асабістага перакладчыка, піша газета New York Post.

Пасля 75 хвілін перакладу сінхраніст выгукнуў па-арабску: «Я больш не магу!» і страціў прытомнасць. Апошнія 20 хвілін выступлення Кадафі перакладаліся кіраўніком арабскай секцыі пры ААН Рашай Аджальякін.

Як паведаміў газеце іншы перакладчык, сведка інцыдэнту, сінхраніст, які перакладаў Кадафі, «проста здаўся». «Я бачыў такое ўпершыню за 25 гадоў», — адзначыў суразмоўца карэспандэнта.

Выступленне Кадафі значна перавысіла 15-хвілінны рэгламент. Лідар лівійскай рэвалюцыі, захапіўшыся, часта гаворыць проста нелагічна, невыразна, часам пачынае гутарыць як бы сам з сабой. Вытрымаць такую гаворку сапраўды няпроста, асабліва ўлічваючы тое, што, паводле правілаў ААН, любы даклад перакладаюць два чалавекі, якія змяняюцца кожныя 20 хвілін, бо сінхронны пераклад патрабуе высокай канцэнтрацыі ўвагі.

Звычайна кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў, а таксама іншыя прадстаўнікі дзяржаў-членаў Аб'яднаных Нацый падчас выступленняў у ААН карыстаюцца паслугамі афіцыйных перакладчыкаў арганізацыі, дзе афіцыйнымі лічацца шэсць найбольш распаўсюджаных у свеце моў — англійскай, арабскай, іспанскай, кітайскай, рускай і французскай. У прыватнасці, у арабскай службе перакладу ААН працуюць 25 высокакваліфікаваных перакладчыкаў-сінхраністаў.

Аднак Кадафі настаяў на ўласных перакладчыках, спасылаючыся на тое, што будзе гаварыць на адным з дыялектаў арабскай. Як потым высветлілася, сваё выступленне лівійскі лідар рабіў на класічнай арабскай.

Сінхраніст — не адзіная ахвяра выступлення Кадафі: так, прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка з-за затрымкі не трапіў на прыём да Барака Абамы.

БАНКАМАТ НАКРЫЎ ЗЛАДЗЕЯЎ БАНКАМ

Спроба рабавання банкамата скончылася для двух бельгійскіх злачынцаў трагедыяй. Як паведамляецца, у бельгійскім горадзе Дзінан два зладзеі прабраліся ў аддзяленне гарадскога банка, каб забраць грошы з банкамата.

Праўда, для рабавання яны абралі даволі радыкальны метад: злачынцы вырашылі не сядзець круком над банкаматам з адвёрткамі і кусачыкамі, а паспрабаваць дабрацца да грошай, якія захоўваліся ў ім, з дапамогай дынаміту. Аднак — перабралі: ад выбуху амаль цалкам абваліўся будынак банка, заваліўшы іх абломкамі столі і сценаў.

Паліцэйскія, якія прыехалі на месца здарэння, выцягнулі з-пад завалу аднаго са злачынцаў — ён атрымаў раненні, несумяшчальныя з жыццём, і памёр па дарозе ў бальніцу. Цела другога няўдачлівага рабаўніка выратавальнікі не могуць знайсці і дагэтуль. Падчас далейшага разбору завалу яны дабраліся і да злашчаснага банкамата. Як высветлілася, ад выбуху ён практычна не пацярпеў.

Паводле слоў мэра Дзінана Рычарда Фурно, гульня першапачаткова не была вартая свечак: у банкамаце, рабаванне якога каштавала жыцця прынамсі аднаму з рабаўнікоў, знаходзілася ўсяго каля 180 тыс. еўра.

ЖЫХАР ПАР АЖАНІЎСЯ З 4 ЖАНЧЫНАМІ АДНАЧАСОВА

Незвычайнае вяселле прайшло ў мінулую суботу каля паўднёваафрыканскага горада Ледысміт — мужчына ажаніўся з чатырма жанчынамі адначасова, паведамляюць брытанскія СМІ.

На цырымоніі, дзе прысутнічалі некалькі сотняў людзей, 44-гадовы Мільтан Мбхеле пацалаваў усіх сваіх жонак, апранутых у прыгожыя белыя сукенкі, і надзеў кожнай на палец заручальны пярсцёнак. Затым жаніх ганарліва парассаджваў дзяўчат у шыкоўным белым лімузіне і павёз да сябе дамоў.

Законы Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі дазваляюць палігамные шлюбы. Нават прэзідэнт краіны Джэйкаб Зуму мае тры жонкі. І ўсё ж, нягледзячы на тое, што шматжэнства распаўсюджана ў такіх плямёнах, як Зулу і Сваці, жаніцьба з некалькімі жанчынамі адначасова здараецца даволі рэдка.

Па словах М. Мбхеле, менеджара сярэдняга звяна, жаданне ўзаконіць адносіны адразу з усімі сяброўкамі было выклікана магчымасцю зэканоміць на арганізацыі свята. Пры гэтым адна з нявест выходзіла замуж за містэра Мбхеле паўторна: 12 гадоў таму яны ўжо абменьваліся клятвамі вернасці, пасля чаго жылі шчасліва і нарадзілі на свет 11 дзяцей. «Я хацеў, каб яна была шчаслівая, — сказаў жаніх пра сваю першую жонку, якой падарыў на вяселле залаты гадзіннік. — Я падумаў, што яна будзе радая, калі я ажанюся з ёй у другі раз, бо збіраўся ўзяць у жонкі яшчэ трох. Падумаў, што гэта яе неяк суцешыць».

Як паведамляецца, астатнім яго жонкам па 24 і 23 гады. Усе яны кахаюць свайго мужа і змірыліся з тым, што не будуць адзінымі. Пры гэтым жонкі будуць жыць асобна адна ад адной.

ЛЯ ЧЫГУНКІ... МІНА

У Шумілінскім раёне днём у самай вялікай вёсцы рэгіёна Мікіціха непадалёк ад чыгункі мясцовыя жыхары знайшлі боепрыпас. На месца па выкліку выехалі міліцыянеры, выратавальнікі, сапёры. Было вызначана, што знаходка — мінамётная міна часоў Вялікай Айчыннай вайны. На гэтым участку чыгункі штодня ходзіць шмат электрычак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

$1000 — ЗА СТУДЭНЦКІ БІЛЕТ

Раней судзімы за махлярства непрацуючы мінчанін падазраецца ў тым, што прапаноўваў знаёмай з дапамогай хабару ў адну тысячу долараў ЗША вырашыць пытанне аб паступленні яе сына ў ВНУ.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама разам з калегамі з Заводскага РУУС затрымалі вышэйзгаданага мінчаніна, а таксама прафесара мінскага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта эканомікі, статыстыкі і інфарматыкі. Як мяркуецца, атрымаўшы грошы ад жанчыны, падазроны аддаў 800 долараў прафесару ўніверсітэта, які раней падбухторваў яго да выплаты пэўнай сумы за станоўчае вырашэнне аналагічнага пытання. Узялі мужчын праваахоўнікі з доказамі віны ў момант перадачы грошай. Прафесар змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання, па факце праводзіцца расследаванне.

Ігар ГРЫШЫН.

Віншуем нашых дарагіх і любых сына **Андрэя КОХАНА** і ўнука **Сашу СТАНЬКА** з днём нараджэння. Жадаем ім моцнага здароўя, поспехаў у дасягненні мэты, шчасця і радасці ў жыцці.



Бацькі, браты, сёстры, пляменнікі.
в. Шашкі.

«НАВАТ СЯЛЯНСКІ РАДАВОД МОЖНА ВЫЗНАЧЫЦЬ ДА ДЗЯСЯТАГА КАЛЕНА...»

Да якога калена вы ведаеце свой радавод? Прабабуля і прадзядуля?.. Раней у нашых продкаў лічылася ганебным не ведаць свой радавод хаця б да пятага калена. Такога чалавека маглі нават выгнаць з племені ці сям'і. Пра беларускія радаводы мы гутарым сёння са слынным гісторыкам, загадчыкам аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Зміцерам ЯЦКЕВІЧАМ.

— Спадар Зміцер, наколькі сур'ёзна нашы продкі ставіліся да пытання радавой памяці?

— Вусная радавая памяць існавала заўсёды, існуе і зараз, можа, крыху ў парэзаным выглядзе. Сапраўды, раней людзі былі абавязаныя ведаць свайго продка да пятага калена. І самае галоўнае, што яны ведалі. Гэта ўсё перадавалася калі не з малаком маці, то абавязкова ім пра гэта распавядалі бацькі, дзяды, прадзеды. Людзі заўжды ганарыліся сваімі продкамі, іх нейкімі здабыткамі. Гэта перадавалася нават у выглядзе разнастайных паданняў. У пісьмовы час гэта пачало фіксавацца на паперы. Безумоўна, гэта было больш характэрна для багатых людзей, якія мелі нейкія кавалкі зямлі і перадавалі іх у спадчыну. Звесткі пра радавод перадаваліся разам са зброяй, нерухомасцю, маёмасцю — як частка сямейнага багацця, золата сямейнай памяці. У найбольш заможных родах наймалі людзей, якія пісалі адмысловыя кнігі, дзе распавядалася пра гісторыю роду.

Пасямейны спіс мінскага мешчаніна Ануфрыя Луцэвіча, дзе пазначаны яго сын Дамінік і ўнук Іван (Янка Купала), 1894 год.

— Вядома, што, напрыклад, род Радзівілаў вядзе сваю гісторыю ад 1380 года. А да якога часу вядуць сваю гісторыю іншыя нашыя шляхецкія роды?

— Я так думаю, што карані большасці родаў сягаюць да XIV стагоддзя — таго часу, калі пачалі з'яўляцца нейкія больш ці менш даклад-

Генеалагічнае дрэва Ягелонаў, 1521 год.

ныя летапісныя звесткі, часам нават міфічнага паходжання — як у выпадку з тымі ж Радзівіламі. Быццам бы крыху лепш з вялікімі князямі, але там таксама ёсць свае пытанні. Рэч у тым, што асабліва ў XVI стагоддзі стала моднае такое паўлегендарнае паходжанне, і вельмі шмат родаў, якія траплялі ў нашы летапісы і хронікі, стараліся нейкім чынам падоўжыць свой радавод. Менавіта тады з'явілася абгрунтаванне паходжання родаў Вялікага Княства ад старажытнарымскіх патрыцыяў...

— Спадар Зміцер, да якога часу рэальна прасачыць свой радавод сённяшняму беларусу?

— Сёння беларусу даволі цяжка вызначыць свой радавод з тае прычыны, што ў XX стагоддзі вельмі моцна знішчалі нашу радавую памяць, асабліва калі ў чалавека былі якія-небудзь шляхецкія карані. Усё гэта было нямодным, таму што была адпаведная сістэма. І цяпер вялікая праблема ў тым, што ў людзей не захаваліся родавыя архівы — зрэдку знаходзяцца толькі асобныя дакументы, якія людзі прыносяць і паказваюць нам. Рэшткі ўсіх архіваў — радавых, дзяржаўных, рэлігійных, грамадскіх — захоўваюцца сёння ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. І — часткова па Гарадзенскай губерні — у Гродне, у гістарычным архіве. У першую чаргу дзякуючы гэтым дакументам можна сёння ўзнавіць радаводы беларусам. А вось наколькі глыбока — залежыць ад захаванасці дакументаў, ад сацыяльнага паходжання чалавека, ад зыходных звестак, якія чалавек падае ў архіў. Калі хто сёння мае жаданне даведацца пра свой радавод, ён з дапамогай архіўных матэрыялаў можа дайсці недзе да XVI стагоддзя. Вядома, не заўсёды — сялянскія радаводы абрываюцца недзе на мяжы XVIII стагоддзя. Але ёсць такая магчымасць. Калі ўлічыць, што кожнае стагоддзе дае недзе тры калены, то сялянскі радавод можна вызначыць да 9-10 калена. Калі шляхецкі, можа дадацца яшчэ шэсць ці пяць кален.

— Спадар Зміцер, а да якога калена ведаеце свой радавод вы?

— Па маці я ведаю свой радавод да дзявятага калена. Па бацьку — да шостага. Гэта звязана з тым, што былы Лідскі павет уваходзіў у склад Віленскай губерні, і асноўная частка ранейшых дакументаў захоўваецца сёння ў Вільні. Фінансавыя магчымасці не дазваляюць мне заняцца гэтым пытаннем і дакапацца да самых глыбіняў...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

КОШТ ПЫТАННЯ

«Цяпер прымаем замовы на сярэдзіну наступнага года...»

Кошт генеалагічнага запыту і парадак падачы заяў мы высветлілі ў **Дзяніса ЛІСЕЙЧЫКАВА, загадчыка аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі**.

— Для грамадзяніна Беларусі максімальны кошт генеалагічнага пошуку складае 1 мільён 200 тысяч рублёў, для замежніка — 1 500 000, — распавёў «Звяздзе» спадар Дзяніс. — Радуе, што вельмі шмат беларусаў цікавяцца сваімі каранямі. Настолькі шмат, што зараз мы прымаем запыты, якія будуць выкананыя толькі ў сярэдзіне наступнага года. Вынік такой працы — мы даем чалавеку ўсе знойдзеныя звесткі з метрычных кніг, рэвізскіх сказак і пасямейных спісаў. Калі чалавек шляхетнага паходжання, удаецца знайсці больш, сялянскага — менш. Для селяніна максімальна глыбокія звесткі датычацца 1795 года, калі была праведзеная першая рэвізія прыгонных сялян у Расійскай імперыі. Тое самае тычыцца і тэрыторыі пошуку — па Менскай губерні захавалася больш звестак, па Магілёўскай ці Віцебскай — менш...

— Што павінен ведаць чалавек, які ідзе ў архіў на свой радавод?

— Галоўны крытэр — ведаць сваіх продкаў, якія жылі раней за 1917 год. Інакш нам не ўдасца звязаць звесткі са сваімі дакументамі. Дарэчы, калі названая сума завысокая для вас, ёсць і танны варыянт — шукаць звесткі самому. Для гэтага трэба напісаць заяву, дзе пазначыць сваіх сваякоў, народжаных да 1917 года, рэгіён пошуку, а таксама мець пры сабе пашпарт. Абанемент на гадавую працу ў чытальнай зале каштуе 16 500 рублёў. Супрацоўнік архіва пракансультуе вас, як весці пошук. Далей вы знаходзіце метрычныя кнігі цэрквяў, куды маглі хадзіць вашыя продкі, і метадычна шукаеце патрэбныя звесткі.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.09	18.49	11.40
Віцебск —	7.00	18.38	11.38
Магілёў —	7.00	18.39	11.39
Гомель —	6.56	18.36	11.40
Гродна —	7.24	19.04	11.40
Брэст —	7.24	19.05	11.41

Месяц

Першая квадра 26 верасня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Веры, Любові, Надзеі, Сафіі, Івана, Ілы.*

К. *Веры, Зоф'і, Любові, Надзеі.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА +14..+16°С	КІЕЎ +15..+17°С	РЫГА +8..+10°С
ВІЛЬНЮС +7..+9°С	МАСКВА +8..+10°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С

ДАРОГА Ў РАЙ

Фотарэпартаж

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дарога ў Рай і не брук, і ружамі не пасыпана. Але тым цікавей, што тут усё будзённа і рэальна. Што звычайная гравійка і высокая сцяна кукурузы, з-за якой бачныя толькі новыя дахі вясковых сядзібаў «прэзідэнцкіх» дамкоў. Своечасова пагрэйдзіраваная дарога — і гэта ацэніць любы кіроўца — сведчанне клопату мясцовых дарожных службаў і таксама факт, які не дае падстаў для адмоўных эмоцый і штучных высноў. Не мною і даўно заўважана: добры шлях — да добрага месца. Штораніцы (а Рай прачынаецца даволі рана) пяцёра вясковых дзетак спяшаюцца па гэтай дарозе ў школу ў суседнюю вёску Пурплева, едуць на працу ў СВК іхнія матулі і бацькі. А пенсіянер-малаказборшчык Мікалай Падалінскі аб'язджае сядзібы і спыняецца каля тых, у якіх па традыцыі трымаюць кароў. Сёння ў вясковых падворках толькі 12 рагуль. За апошнія пяць гадоў, па зводках СВК «Пурплева», пагалоўе хатняга статка зменшылася ўдвая. Але штодня Рай робіць свой унёсак у малочную раку краіны ў памеры 230 літраў прадукту добрай тлустасці. У вёсцы сёння тры вуліцы, якія неафіцыйна называюць пасёлкамі. Першы пасёлак — Ленінскі. Назва яго засталася ў спадчыну ад колішняга (апошняга) калгаса імя Леніна. Другі пасёлак — Пасёлак (тут не зусім зразумела, ці гэта назва, ці яе адсутнасць). Трэці пасёлак самы старажытны, які ўласна і называецца Раем. Ён знаходзіцца на ўзвышшы, і з яго адкрываюцца прыгожыя краявіды, якія можна параўнаць хіба з непаўторнай Браслаўшчынай. На гэтых трох пасёлках узведзены (ці засталіся) 24 гаспадарскія падворкі. Ёсць



малочнатаварная ферма з дойным статкам, цялятамі і мясным бычкам. Дарэчы, трэць жывёлагадоўлі СВК сканцэнтраваная менавіта на раеўскай ферме. Гэта вельмі важна для жыхароў, і таму беспрацоўе ў вёсцы адсутнічае. А яшчэ ёсць у Раі свае могілкі. Крамы хоць і няма, але двойчы на тыдзень прыходзіць аўталаўка.

Няхай не крыўдуюць іншыя гаспадары Рая, але самы кветкавы і дагледжаны падворак — у вясковай старэйшыны Ганны Чарновай. сельсавет вызначыў яго як падворак «узорнага парадку» і ўручыў адпаведную шыльдачку. Гаспадыня адразу прымацавала яе да цаглянай сцяны. Гэтымі днямі Ганне Міхайлаўне споўнілася шэсцьдзясят, і пасёлак весела адзначыў яе юбілей. Працавала яна ў паляводстве і даглядала цялят. Цяпер яе клопат, прызнаецца, даглядаць унучак. Напэўна, жанчына прыйшла да высновы: калі кожны гаспадар зробіць уласную сядзібу ўзорнай, вёска будзе больш адпавядаць сваёй назве. Недагледжаных сядзібаў тут няшмат, але каб «ахнуць» ад нечаканай прыгажосці, трапіўшы ў Рай — да гэтага яшчэ далёка. Асабліва на Ленінскім пасёлку, на самым уездзе ў вёску, дзе жывуць маладзейшыя і ў асноўным прыезджыя раёўцы. А вось самы экзатычны двор, на які нельга не звярнуць увагі — у Тамары Макоўскай. Яе старэйшы ўнук натхнёна размаляваў усё, што патрапіла ў поле яго зроку: плот з брамаю і лаваю, студню і нават на сабачай хатцы вывеў слова «Рэкс».

Старэйшая жыхарка Рая Вера Мікітаўна Ціханкова кажа, што назва вёскі — не перайменаванне, моднае яшчэ ў недалёкія часы. Сама яна з 1928 года і не памятае, каб Рай называўся па-іншаму. І бацька яе не памятаў. І дзедаў дзед ніколі не прыгадваў. «Ніхто не ведае, колькі гадоў Раю, але ён заўсёды быў толькі Раем», — кажа Вера Ціханкова і дадае: «Вось толькі мала мы бачылі добрага». Пасля яе слоў наша размова перайшла ў рэчышча ўспамінаў пра вайну, пра самыя трагічныя старонкі — як немцы спалілі Рай. Вера Мікітаўна добра памятае той дзень — якраз на загавіны было (піліпаўскі пост), 27 лістапада 1943 года. «Наша вёска была партызанскай і навокал былі партызаны, — працягвае баба Вера, — немцы прыйшлі з чатырох бакоў, аблаваю, хто не паспеў схавацца, пагналі ў Багушэўск у турму». 19 чалавек за сувязь з партызанамі расстралялі, а 15-гадовую Веру адпусцілі. Пазней зноў забралі на лесапавал, але ёй удалося ацалець там таксама.

Вайна пакінула вёску толькі з трыма хатамі, у якіх туліліся па 3-4 сям'і. Гэтыя хаты дагэтуль называюць камунамі. Ад вайны ў вёсцы больш ніколі не было ні дзіцячага сада, ні клуба. Ганне давялося жыць у склепе. Пасля Перамогі працавала на падліку калгасных працадзён, была ільнаводкай-звеннявой. І якім ні было часам жыццё няўтульным, ніколі не кідала Рай. Кінулі дзеці. І таму большасць вясковых пенсіянераў жывуць у самоце, чакаючы ад лета да лета сваіх унукаў.

Два месяцы таму Рай папоўніўся новым жыхаром — маладая даярка Алеся Смірнова нарадзіла дачку. Кожны, хто прыйшоў паглядзець на немаўля, казаў: «Няхай яшчэ яе будзе, нібы ў раі!».

Паставіўшы кропку пад напісаным, вырашыў зазірнуць у біблейскую энцыклапедыю. Пад рукамі апынулася маскоўскае выданне 1891 года, з якога даведаўся, што слова «Рай» у персідскай мове азначае сад. У кнізе Быцця менавіта гэтак названа шчаслівае жыллё першага чалавека. Раем называецца і шчаслівае жытло для жыхароў неба і праведнікаў, якое яны атрымліваюць пасля Страшнага суда Божага.

Цяпер вось адольваюць здагадкі: а з якой нагоды Рай з'явіўся на беларускай зямлі?! Але давайце нарэшце пазнаёмімся з тымі, хто на здымках. Гледзячы, як соладка пазяхае маленькая дачушка Палінка, Алеся Смірнова свеціцца шчасцем, нібы сапраўды перакананая, што толькі ў Раі гэтак добра спяць дзеці. Сонца ў вёску Рай «прыпісалася» дзякуючы ўнуку Тамары Падалінскай, але толькі з яе дазволу і менавіта на брамцы. Можа таму да яе ў госці часта заходзіць свацця Марыя Макоўская. Калі не верыце, што ёсць такая вёска, глядзіце на копію старонкі пашпарта раёўскага жыхара. Малаказборшчык Мікалай Падалінскі вяртаецца з аб'езду пад пільным вокам самых дапытлівых і няўрымслівых кантралёраў — вясковых дзяцей Яніны і Дзіяны Чарновых, Цімура, Карыны і Зарыны Ламановічаў. Помесь аўчаркі па мянушцы «Рэкс» дзень і ноч на ахове роднага Рая.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Сенненскі раён.

Дзве даты

30 верасня

1892 год — нарадзілася Зоська Верас, беларуская пісьменніца, грамадска-культурны дзеяч. Скончыла прыватную жаночую гімназію ў Гродне, агародніцка-пчалярскія курсы ў Варшаве. Друкавацца пачала ў 1907 годзе, з мастацкімі творамі выступіла ў 1911-м у газеце «Наша ніва» пад псеўданімам Мірко. У 1916-17 гадах з М. Багдановічам працавала ў мінскім камітэце «Таварыства помачы ахвярам вайны» і іншых арганізацыях (у Беларускім Нацыянальным Камітэце, у Цэнтральнай Радзе Беларускіх Арганізацый, у Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе). З 1923 года жыла ў Вільні. Рэдагавала дзіцячыя часопісы «Заранка» і «Пралескі», сельскагаспадарчы часопіс «Беларуская борць». Пісала вершы, апавяданні, артыкулы па пчалярстве, агародніцтве, сельскай гаспадарцы, педагогіцы.

1938 год — у Мюнхене кіраўнікамі ўрадаў Вялікабрытаніі (Н. Чэмберлен), Францыі (Э. Даладдзэ), фашысцкай Германіі (А. Гітлер) і Італіі (Б. Мусаліні) падпісана пагадненне аб падзеле Чэхаславакіі.

Цытата дня:

«Характар чалавека ніяк нельга зразумець больш дакладна, чым па тым жарце, на які ён пакрыўдзіўся».

Георг Крыстаф Ліхтэнберг (1742—1799), нямецкі пісьменнік.

30 верасня — ВЕРА, НАДЗЕЯ, ЛЮБОЎ І САФІЯ

Пакутніцы Вера, Надзея, Любоў і іх маці Сафія нарадзіліся ў Італіі каля 137 года ад Н.Х. Святая Сафія была хрысціянкай і трох сваіх дочак назвала імёнамі трох хрысціянскіх дабрачыннасцяў: Вера, Надзея і Любоў. Святая Сафія і яе дочкі не хавалі сваёй веры ў Хрыста. Чуткі аб чысціні, розуме і прыгажосці дзяўчат дайшлі да імператара Адрыяна, які пажадаў убачыць іх, даведаўшыся, што яны хрысціянкі. Адрыян па чарзе звяртаўся да іх з просьбай адмовіцца ад Хрыста. Юныя дзевы (Веры было 12 гадоў, Надзеі — 10, і Любові — 9) засталіся непахіснымі. Тады імператар загадаў жорстка закатаваць іх. Святую Сафію прымусілі глядзець на пакуты сваіх дочак. Пасля ўсіх выпрабаванняў святых пакутніц Веру, Надзею і Любоў пазбавілі галавы. Маці адвезла целы сваіх дочак за горад, пахавала і неадступна заставалася на іх магіле. Праз тры дні пасля гэтага яна памерла сама. Подзвіг Сафіі і яе дочак усхваляецца ва ўсім хрысціянскім свеце.

● У дзень памяці святой Сафіі і яе дочак-пакутніц у гонар мудрасці маці і галоўных жаночых дабрачыннасцяў Веры, Надзеі і Любові ў народзе было прынята наладжваць «усяленскія бабіны імяніны». Святкаванні наладжвалі вельмі ўрачыстыя. Асабліва ўшаноўвалі сяляне тых жанчын, якія насілі імёны Вера, Надзея, Любоў.

● Таксама ў гэты дзень жанчынам раілі паплакаць аб сабе, аб сваяках, аб цяжкай «бабскай» долі, каб менш плакаць на працягу года.

● Ва ўсе часы сярод жанчын карысталіся вялікай павагай імёны Сафіі, Веры, Надзеі і Любові. Народная мудрасць захавала гэтыя імёны ў прыказках, прымаўках, легендах і паданнях пра жаночую вернасць, самаадданасць, прыгажосць.

● А яшчэ ў гэты дзень назіралі за адлётам птушак. Калі жоравы паляцяць у вырай, то на Пакровы будзе мароз, а калі не, то зімы не будзе доўга.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— ...Чалавек павінен паміраць нечакана, у росквіце сіл, не падазраючы, нават не здагадваючыся аб сваім хуткім сыходзе, пакінуўшы безліч няскончаных спраў, новых раманаў...

— На дарогу глядзі!!!

☺

Гэта быў зацяжны пацалунак — з той катэгорыі пацалункаў, калі ён ужо паспявае з ёй у думках заняцца сэксам, а яна ўжо паспявае ў думках перавезці ў яго кватэру ўсю сваю мэблю.

☺

Яна і ён.

— Я, наадварот, дапамагаць люблю.

— Дапамагаць наадварот? Гэта ўсе жанчыны любяць :)

☺

Гарэлка — самая ідэальная касметыка: і сам замаскіраваўся, і на сяброўку прыемна паглядзець.

☺

— А давай купім што-небудзь для актыўнага адпачынку!

— Што, напрыклад?

— Ну, гамак або шэзлонг...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5344. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12